

Аляксандра Грыцкевіч

# Хай скрыпачка грае

АЛЯКСАНДРА ГРЫЦКЕВІЧ

# ХАЙ СКРЫПАЧКА ГРАЕ

Смаленск
«Ноопрэс»
2017

УДК 181.161.3
ББК 84стд1-5(4Беі)
Г 72

**Грыцкевіч, А.**
Г 72 Хай стрыпачка грае : вершы / Аляксандра Грыцкевіч. – Смаленск : Ноопрэс, 2017 – 298 с.

ISBN 978-5800-37033-1

Кніга паэзіі Аляксандры Грыцкевіч “Хай скрыпачка грае” здзіўляе масштабнасцю светаўспрыймання і выклікае найвышэйшае захапленне. Вершы прафесійна адпрацаваныя і па рытму, і па спэцыфічных рыфмах, па разнастайнасці формаў і жанраў. Патрыятызм, як вызначэнне паэзіі А. Грыцкевіч, вельмі казённае паняцце. Неверагодная любоў і адданасць да роду, малой радзімы, Беларусі ў цэлым, і да кожнага беларуса паасобку не астаўляе душу раўнадушнай. Моцная энергетыка, сапраўднае натхненне прамяніцца з кожнага верша.

**УДК 181.161.3**
**ББК 84стд1-5(4Беі)**

**ISBN 978-5800-37033-1**

© Грыцкевіч А., 2017
© Афармленне «Ноопрэс», 2017

Кніга паэзіі Аляксандры Грыцкевіч "Хай скрыпачка грае" здзіўляе маштабнасцю светаўспрыймання і выклікае найвышэйшае захапленне. Вершы прафесійна адпрацаваныя і па рытму, і па спэцыфічных рыфмах, па разнастайнасці формаў і жанраў. Патрыятызм, як вызначэнне паэзіі А. Грыцкевіч, вельмі казённае паняцце. Неверагодная любоў і адданасць да роду, малой радзімы, Беларусі ў цэлым, і да кожнага беларуса паасобку не астаўляе душу раўнадушнай. Моцная энергетыка, сапраўднае натхненне прамяніцца з кожнага верша. М. Ф. Гуліцкі – кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

Кніга складаецца з дзьвух частак: першая –арыгінальныя, вельмі разнастайныя па жанрах паэтычныя творы; другая – дасканалыя пераклады на беларускую мову вялікіх сусветных паэтаў, а таксама вядомых і малавядомых рускіх паэтаў. Другая частка увабрала ў сябе выпраўленыя пераклады з раней надрукаванага зборніка "Рэха вякоў", але значна расшырана і дапоўнена. Блізасць перакладаў да арыгіналаў і па эмацыйнаму уздзеянню, і па вобразнаму раду, і па рытміцы, і па дакладнасці перадачы думкі з'яўляюцца бясспрэчнымі.Чытаючы пераклады А. Грыцкевіч захапляешся шматкалёрнасцю, пластычнасцю, гібкасцю, багаццем беларускай мовы, якая можа выразіць усё на свеце ад найтанчэйшых адценняў лірычных пачуццяў да глыбіні філасофскай думкі. Па-беларуску – гэта так смачна!

## ХАЙ СКРЫПАЧКА ГРАЕ

*Хай скрыпачка грае,*
*Няхай выцінае*
*Ў тканіне бязмежнай прасторы узоры.*
*Ляціць Страцім-лебедзь,*
*Ляціць і губляе,*
*Губляе свае серабрыстыя пёры.*

*Душа мая плача,*
*Прытулку не мае,*
*Ляціць па прасторы і пёры губляе.*
*А хто пёрка знойдзе,*
*Той песню пачуе,*
*Хор душаў самотных,*
*Што ў небе начуюць.*

*Глядзяць і не бачаць*
*Адная адную,*
*Спяваюць і плачуць,*
*А я усіх чую.*
*Бо Страціма пёрка*
*Ў сваёй руцэ маю*
*І з імі я плачу, і з імі спяваю.*

*Душа беспрытульна*
*На скрыпачцы грае,*
*Ў прасторы бязмежнай*
*Узор выцінае.*
*У небе між зораў*
*Віюцца узоры,*
*Дзе срэбраны лебедзь*
*Згубіў свае пёры.*

*2014*

***

**Ты хочаш вандраваць паміж людзьмі,**
**Тугу па дасканаласці будзіць?**
**Імкненне вечнае ад марнасці да Богу?**
**Вось кій табе крылаты ў дапамогу…**
**Квітнее ўсцяж дарог і раздарожжаў**
**Адзін трыпутнік – кветка падарожных.**
**Каменнем, пылам ўсцелены дарогі,**
**Абшары бачыцьмеш і пазбіваеш ногі.**
**На паплавох тваіх вандровак дальніх**
**Таксама дасканаласці шукальнік**
**Ты сам. Ідзі. Глядзі. Шукай і адшукаеш.**
**І пуцяводнай зоркаю заз'яеш**
**Другім вандроўным. Сэрца зразумее**
**Таемны сэнс. Паходняю надзея.**
**Ідзі…**

*31.01.2014*

## ЯЗЭП ДРАЗДОВІЧ

Па збуцьвелай зямлі
Густа цені ляглі.
Ў небе месячык зорак пільнуе.
Па апаўшых лістох
Праз лясы ўсцяж дарог
Адзінокі мужчына вандруе.
Аніхто, анідзе не чакае яго,
Анікому свой лёс не раскажа.
Ён самотны ідзе,
Ўвушшу вецер гудзе.
Плечы цягне у торбе паклажа.
Фарбы, пэнзлі, нататнік
У торбе ляжаць,
Бохан хлеба, кавалачак сала.
Каб хто ведаў,
Чаму ён пайшоў вандраваць,
Чаго ў хаце яму не хапала?
Як сасмягне, з крыніцаў
Нап'ецца вады,
Чуе ціхі шэпт дрэваў, спеў птушак.
Чыстым сэрцам усё разумее тады.
Дух сягае і зоры варушыць.
Паміж зораў на іншых плянэтах жыццё
Патаемным сваім зрокам бачыць.
Бачыць Свету суладдзе, яго хараство.
Фарбы, пэнзлі ўсё тое адзначаць.

На малюнках яго расцвітаюць сады,
Васількі і рамонкі, і травы.
Колас гойдаюць цяжкі, калышуць жыты
Адбіваюцца свету праявы.
А на іншых малюнках прарочыя сны
Маюць ў фарбах сваё ўвасабленне.
І далёкіх плянэтаў стаяць гарады,
Іх насельнікі ў белым адзенні.
Думак рой у нататніку вулей знайшоў.
Робяць соты руплівыя пчолы.
І збіраецца мёд ад пачутых вакол
Родных гукаў пяшчотняйшай мовы.
Зразумець бы, убачыць,
Што ён зразумеў
У вандроўках самотных між долаў.
І любоў да Зямлі, да істот яе мець
Ў міг, што Вечнасць дае
Людзям кволым.

*2014*

***

Там, у палёх, калышуцца ледзь-ледзь
Пажоўклыя жыты у сваіх межах.
Там-сям сінее васілёк. Магутны дуб
Свае галіны у бакі развесіў.
Як цень, бы здань, ад хмаркі праплыве
Па жыце, яно нікне каласкамі.
Так і душа, што з крыўдаю жыве
Між хмурных дзён пастаўшых шэрагамі,
Панікне. Прыкра зробіцца. Але чаму?
Што сілы я, як дуб, ў сабе не маю?
Што, як трава, між іншых траў жыву
Лагодна і на лёс не наракаю?

*14.01.2014*

***

Аперазала рэчка лес бліскучай стужкай.
Над ёю дуб высокі птушак гушкаў.
А птушкі хорам ціўкалі. Іх галасы трымцелі
І славілі блакіт нябёсаў і арэлі
З галін дубовых. Шчасцем павявала.
Аб смерці навакол нішто не дбала,
Хаця яна усіх падсцерагала.
І сцеражэ. Ніхто не ўсцеражэцца,
Калі яна знянацку падбярэцца.
Але навошта нам пра гэта думаць,
Душу шчаслівую нудой маркотнай тлуміць?
На грэбнях хваль жыццёвых лепш гайдацца,
Вочы заплюшчыўшы сваволіць і смяяцца.
Чымся няшчасным быць ад здольнасці ўсё бачыць,
Бо нельга свайго лёсу перайначыць.
Напэўна, лепей быць шчаслівым і без зроку,
А не відушчым горасным прарокам?

*17.01.2014*

***

*Я нічога не прашу у бога,*
*Як ідзе, так каціцца няхай.*
*Толькі прагну (што камусь нічога),*
*Каб зрабіўся вольным родны край.*

***

Хіба змусіш каго, каб любіў ён цябе,
Калі ты тут нялюбы нікому?
Жыта колас ўзбуяў
    Ў чужой глебе між траў
Ім чужы, а сваім невядомы.

Пырнік глушыць яго.
Шчытнік жыць не дае.
Нат, мурог хоча колас прынізіць.
Але колас расце і мацнее між іх
І зярняткам сваім дае выспець.

Корань жыта глыбока ідзе у зямлю,
А сцябло нават вецер не зломіць.
От, няма між травы зараз шчасця яму,
Ды час прыйдзе зерняты узойдуць.

Адваююць тады яны глебы сабе
І адсунуць у бок пустазелле.
Караваем духмяным ўпрыгожыцца стол,
Як сажнуць хлеб вясёлыя жнейкі.

*15.01.2014*

# САНЭТЫ

1

Крышталі блішчуць дыямэнтаў праўды
Паміж адвалаў у глыбокіх шахтах.
Каб і хацеў, іх зараз не дастаў бы,
Ды стаць магчымым тое зможа заўтра.
Лятуць у вырай чарадою птушкі.
На дол змярцвелае лісцё лажыцца.
Дзіця падросшае ня трэба гушкаць.
Не булькаціць сярод зімы крыніца.
Цень розуму ахутаў вастрыё.
Што не спазнаў я – тое не маё.
Згубіўся след у ледзяной расе.
Ў душы вуголле памяці дыміцца.
Спяць ваяры ў зачараваным сне.
Але кахання сэрцу не забыцца.

2

Пра інь і янь распавядаў
Філозаф з вузкімі вачыма.
Завалакло прастору дымам,
Ў смузе я разважаць пачаў.
Я разважаў пра плюс і мінус,
Пра холад і гарачыню,
Дабра і зла неспасціжымасць,
Пра выхад ад начы да дню,
Пра боль і шчасце, смех і слёзы,
Здароўю ад хвароб пагрозы…
Жыццё і смерць у іх балансе,
Лагоду, ціш і вураганы,
Але стаміўся розум ў трансе,
А вынік быў не атрыманы.

3

Ну і грымела! Але ж і ліло!
Паласавалі неба спрэс маланкі.
І бушавала цэлу ноч да ранку,
Пагасла ў небе зорнае святло.
Жывыя пахаваліся істоты.
Раўла вада, паўсталая сцяной.
Ў бездапаможнасці і адзіноце
Трымцелі душы, страчвалі спакой.
Стыхію немагчыма ўтаймаваць.
І толькі, сцяўшыся, драбніцай адчуваць
Сябе між барацьбы магутных сілаў.
Хачу я нараўне з грамамі ўстаць!
І ў навальніцы гуках, сэрцу мілых,
Ўздым духу вольнага узрушана вітаць!

4

Як незвычайна, як прыгожа
Квітнеюць ліпы. Купы ліп.
Суквеццяў жоўтых ліхтары
Высвечваюць інсэктам позыў.
Ад паху кружыць галаву.
Буяюць ліпеньскія зёлкі.
Гудуць, нектар збіраюць пчолкі
І камянём ляціць ў траву
Каршук, што высачыў пажыву.
Казюлька кожная шчаслíва.
Ў палёх калосяцца жыты.
Напоўніцу жыве прырода.
І разам з ёю жывеш ты
Ў найлепшы час між пораў года.

5

Спяшайся ў сад.  Квітнеюць вішні.
Там уздыхні. Заплюшчы вейкі.
Пачуеш спевы салавейкі.
Адчуеш, што і ты ня лішні
На гэтым свеце. Твае мроі
Сальюцца з подыхам прыроды.
Твае варункі і нагоды
Паміж яе. І супакоіць
Завея ад пялёсткаў белых.
Я углядаюся нясмела
Праз сіняй бездані празрыстасць.
Як-бы нябачны нехта ўзяў
Хор птушак зладзіў урачысты
І душу вечнасцю працяў.

6

Верыць думаў я буду да скону,
Іншых чараў не буду шукаць.
Час прайшоў і цябе  разглядаць
Мушу пільна ў цішы, як ікону.
Калі ведаю, бога нямае
Ні на небе, ні тут на Зямлі.
Марны лёс мой снягі замялі.
Вера ў шчырае слова знікае.
За прыгожай аздобай фасаду
Маё сэрца заўважыла здраду.
І глядзець, пэўна, буду да скону,
Калі ведаю, бога няма,
На цябе, як на тую ікону.
Зразумець намаганні дарма.

*05.2015 г.*

7

Двурогі месяц асвятляў
Заснежаных лясоў паляны.
Стаялі хвоі – вяліканы
І тонкі промень зоркі з'зяў.
Накрытая сумётаў коўдрай,
Заснула моцным сном зямля.
Акамянелая ралля
Была зярнят азімых поўнай.
Упэўнены трашчаў мароз.
Шчадрэц прысмакі людзям нёс.
Ва ўсёй красе зіма стаяла,
Завеяй, снегам і ільдом
Засні прасіла, запрашала:
Ў снягах твой, беспрытульнік, дом.

*03.2016 г.*

8

Збіраймася, гуртуймася, сябры,
Мае адзінадумцы беларусы,
Параскіданыя і лёсам, і прымусам,
І раз'яднаныя ў сваёй зямлі.
Яднайцеся, шануйце свой народ,
Зняважаную мову ушануйце,
Наступным пакаленням падрыхтуйце
Вы глебу добрую, здзясняйце паварот
Да ўсведамлення, што былі і будзем,
Што разам быць павінна нашым людзям.
Хай зараз ляжам у зямлю, як гной,
Слязьмі да краю русла рэк напоўнім.
Ды ўзыйдзе новы параснік сцяной,
Каб край зрабіць навек між вольных вольным!

*30.03.2016 г.*

9

Па роўнаму полі, па беламу снегу
Сваю пагалоску дзьме вецер,
Ды поўня, адвечна маўклівая, свеціць
Аблокаў няўхільнаму бегу.
Сягае дуб верхам сваім да аблокаў,
У роднай зямельцы карэнні.
За годам год памяць нанізвае звенні
Ад даўняй даўніны далёкай.
Як сведкі, у небе далёкія зоры
Сплятаюць паданняў узоры,
Як край баранілі тутэйшыя воі.
Хто злічыць палегла іх колькі...
Ў разбураных вежах схавана былое.
Вятры веюць злосныя толькі.

*10.04.2016 г.*

10

Не праміні! А праміне...
Мільгне, як ластаўка ў паветры...
Ізноў душы цямнеюць нетры.
Дажджынкі-слёзы на вакне.
Не пакідай! Пабудзь са мною.
Упэўненасцю ахіні...
Ды марныя злятаюць дні,
Як снег ад квецені вясною.
Зямная вось нахіл мянее.
Было – няма... Усё сплывае.
Здароўе, радасць... Морак дзён
Між абыякавых падзеяў...
Але за сонцам наўздагон
Імкнецца ластаўка-надзея.

*16.12.2016 г.*

11

Прашу цябе, не наракай на лёс.
Бо кожны мае, безумоўна, свой.
Прадзецца часу зблытаны сувой
З бяды і радасці, і гібелі пагроз.
Шкілеты, косці, спарахнелы тлен...
Мячы іржой пакрытыя і тарчы...
Пагляд пяшчотны, клопат гаспадарчы...
Мінулі, згінулі і будуць зноў без змен.
Ты некім быў, ты ёсць, ты яшчэ будзеш.
Душа блукае несмяротная па людзях...
Ты – залатога колца ланцуга,
Які нязнаным кавалём куецца.
Здаецца мне даўно, што нездарма
Жыццё туманнай мрояю завецца.

*01.2017 г.*

12

Кружылі, кружлялі сляды
Па лесе, па полі, па снезе.
Не верачы злой антытэзе,
Па следу ішоў праз гады,.
Іскрыўся пад месяцам снег.
Святло адбівалася зорак.
Трывалей трымаў мяне морак.
Звінеў, як бубенчыкі, смех.
Было тое ці не было
Радамі гадоў замяло.
На ўтульнай канапе ў цяпле
Раман пра каханне чытаю.
І раптам у сіняй імгле
Кружляючы след ўспамінаю.

13

Які пасля сябе пакіну след?
Хто пра мяне ўспамяне добрым словам?
Нашто былі даследванні мае,
Якія я зрабіў у часе новым?
Мо' проста цешыў розуму гульнёй
Сваё даўно заснулае сумленне?
І, можа, за ўсё, зробленае мной,
Пракляты буду ў трэцім пакаленні?
Ці змог узважыць тое, што спасьціг,
Ці на карысць яно альбо на шкоду?
Людзей ці бачыў праз старонкі кніг
І што ім нёс: завею ці пагоду?
Пра вынік дальні хай не забывае
Даследчык, што прыроду вывучае.

14

Вось слова крыўднае зляцела.
Яна пайшла, сагнуўшы плечы.
Табе вярнуць назад карцела.
Ды так было і будзе вечна.
Ілжывы гонар устрымае.
І пойдзе сябра іншым шляхам.
"Прабачыць зможа у адчаі?" -
Падумаеш з таемным страхам.
Не верабей – назад не зловіш.
Чым адзавецца – не згадаеш.
Ды спачуванню не адмовіш,
Калі дабро у сэрцы маеш.
Такую ўладу словы маюць -
Вагонь з камення высякаюць.

## НАШ ЛЕС

Вячыстымі лапамі хвоі ківаюць.
Дубы непарушныя кроны ўзнімаюць.
Між імі асіны трымцяць і трапечуць.
І лесам усё гэта разам завецца.

Яшчэ, дзе святлей, там рабіны, бярозы
Ствараюць з лістоты карунак прыгожы.
Ў чашчобе маліннік, крушына, ядловец
І сотні, што назваў ня ведаеш, зёлак
Растуць сабе вольна, з травы пазіраюць.
Іх зайцы, касулі і лосі з’ядаюць.
Ў гушчары лісіцы, ваўкі і мядзведзі.
Не вельмі іх лёгка адразу прыкмеціць.
Вядуцца дзікі, жалуды падбіраюць,
Лычамі імхі дагары падымаюць,
Шукаючы грыб ці ласунак інакшы.
Грыбоў незлічонае ціхае брацтва.
Як прыйдзеш у лес, то ня трэба баяцца.

А ягад! Касцянкі, суніцы, чарніцы,
Маліны, ажыны, каліна, брусніцы.
Бруіцца крыніца (сустрэнеш бывае)
Чысцюткай вады, што з глыбінь выцякае
І поіць усіх, хто таго пажадае.

Ляшчына вавёрак арэхамі вабіць,
Ствол роўны і пругкі на вуды зразаюць.

Бяроза вясною дасць соку. Сасна –
Жывіцу-смалу і зайграе струна
Цудоўны напеў пад смычком сваёй воляй,
Нацёртым жывічнай смалой-каніфоляй.

На верас прыляжаш і глянеш у неба –
І токі адчуеш адвечнае глебы.
Крыжуюць сінечу хваін верхавіны.
Стракатыя сойкі сакочуць ў галінах…
Ідзі, прыкмячай, разглядай асцярожна
Пах зёлак чароўных цябе заварожыць.
І, мроячы, папараць-кветку пабачыш,
Працягнеш руку, нават, месца пазначыш.

Казюлькі і птушкі, вужакі і змеі
Заўсёды душы тваёй стан зразумеюць,
Закружаць. загушкаюць і супакояць.
Заўецца душа ў вечным леса сувоі.
Адчуеш сябе яго часткай маленькай.
Ў суладдзі прыроды тваё разуменне
Пакажацца дробным, зусім нетрывалым.
Праз лесу і часу густыя завалы
Праменьчык нябесны з любоўю пакліча
І скажа: «Шануй твайго лесу аблічча
І духаў лясных старадаўнія звычкі.»

* * *

Сяброўству па духу няма перашкодаў:
Ні ўзрост, ні адлегласць, ні час
Не змогуць адолець і не перамогуць
З усіх наймацнейшы той звяз.
Дух вольны заўсёды лунае ў прасторы,
Яднае падобных, заве,
Нябачнай сваёй падтрымае рукою,
Нязломнасць і сілу дае.
Каб мы не хісталіся у адзіноце
Свой сцяг, ідэал не гублялі.
Падзеі, людзей, нават, з'явы ў прыродзе
Праз прызму дабра разглядалі.

*04.2016 г.*

## ПЕСНЯ

Яшчэ дзень не прыйшоў.
Яшчэ час не настаў.
А, быць можа, зусім не настане.
Сярод белых снягоў,
Паміж чорных застаў
Мая ружа чырвоная вяне.
І, як кроплі крыві,
На тым белым снягу
Рассыпаюцца ружы пялёсткі.
Да цябе я дайду
Праз усе «не магу».
Ды сустрэча настане запозна.
Завіруха ад ружы пялёсткі заўе,
Валасы мае снегам засыпле.
Як прыду, паглядзіш – не пазнаеш мяне,
З кубка горкае горычы вып’ю.

*11.04.2016 г.*

***

Мілагучнае скерца ціха скрыпачка грала,
Вельмі простае,
толькі адчайна
ў ім душа сумавала.
Гукі чыстай тугі, мілагучныя гукі.
Толькі бачу:
паненка заломвае
ў роспачы белыя рукі.
Не вярнуўся каханы,
жывым з жорсткае сечы не выйшаў.
Шамаціць і звініць дождж па шклу і па крышы.
І па кроплі жыццё з вачэй ясных яе выцякае.
Мілагучнае скерца ціха скрыпачка грае.

*12.04.2016 г.*

***

Бывае смутна без мяжы.
Зацягнуць краявіды хмары.
І заварушацца ў душы
Сумненняў чорныя пачвары.
Навошта, -шэпчуць, – трэба жыць,
Навошта высілкі штодзённа.
Там, за мяжой спакой ляжыць
І вечнае без хмараў сонца.
Ты кола гэтае парві
І адыйдзі праз край у вечнасць…
Але спынюся на мяжы
Праз гэтых думак недарэчнасць.
Хто стуль прыйшоў і расказаў,
Наколькі там, за краем, лепей.
Працуй, кахай і разважай
Пакуль жывы на гэтай глебе.

*16.04.2016 г.*

***

Ясныя-ясныя далі вясновыя.
Ў сэрцы надзеі з'яўляюцца новыя.
Новыя сілы ў душы абуджаюцца.
Следам за птушкамі думкі спяшаюцца:
Нешта рабіць, будаваць , адбудоўваць.
Зімнія чары, знямогу адсоўваць.
Глебу зляжалую зноўку араць,
З птушкамі сонейка разам вітаць.
Важкія кідаць зярняты ў раллю.
Поле аддзячыць руплівасць тваю.

*18.04.2016 г.*

***

Людзі, зляжалую землю арыце.
Сейбіты, сейце! У жмені бярыце
Цяжкае важкае зерне і сейце.
Ўзыйдзе напэўна. Адно зразумейце,
Вам за руплівую шчырую працу
Шчодра зямля ураджаем аддзячыць.

*2016*

***

Гэй вы, аратыя, землю арыце.
Сейбіты поўныя жмені бярыце
Зерня цяжкога. Раллю засявайце.
Клопатам, песняй вясну прывітайце.
Шчодра зямля і нябёсы за працу
Хлебам надзейным штодзённым адплаціць.

*2016*

А. П. Грыцкевічу

## ПРАЦА ГІСТОРЫКА

Бліскучай стужкай
Рэчка лес аперазала
На раздарожжы воддаль
Дуб узрос
І бачыў ён нямала,
Быў сведкаю нямым
Падзеяў даўніх.
Шапочуць-шалясцяць лісты
Мінулых дзён паданні.
Дарожны пыл
На лісці тым дубовым.
На мне архіўны пыл,
Бо я у часе новым
Зляжалыя лісты гартаю,
Пра тое, што прайшло
Даведацца жадаю.
Лісты, пажоўклыя ад часу,
Пахнуць тленам,
Але ў выток
Раку падзей павернуць.
І бачу, што было,
І гукі бітваў чую.
Так лёс наканаваў.
Над гэтым я працую:
Як моцна дуб стаіць,
Каб праўда так стаяла.
І каб гісторыя
Навукай праўды стала.

*2014*

# БІТВА ПАД ВОРШАЙ

(Паводле верша І. Копыла, напісанага на рускай мове)

Быў век шаснадцаты. Пачатак.
Маскаль на нас пайшоў вайной.
Змянілі гвалт і смерць парадак.
Ўваліліся усёй ардой.
Агонь, рабунак і забойства
Ад той Масквы пайшлі на нас.
З васьмі дзесяткаў тысяч войска
Зямлю ўсчало нашу таптаць.
У гневе Жыгімонт і ў Менску
Змог тысяч трыццаць пяць сабраць.
А ўжо далей, у бок Смаленску
Павёў Астрожскі ваяваць.
Наш ганаровы ваявода
На вараным скакаў кані.
І сekліся тады на Бобры,
На Друці й ля Бярэзіны.
А дзе між Воршай і Дуброўнай
Крапіўна робіць выгіб свой,
Вось там, якраз на полі роўным
Рашучы даў Астрожскі бой.
У жорсткім тым супроцьстаянні
Ліцьвін не шкадаваў жыцця.
Астрожскі прыкладам уласным
На подзьвіг вояў узнімаў.
На крыле правым быў і левым,
Ў патрэбны момант паміж іх.
Адважна біўся і умела
Кожны ліцьвін супроць дваіх.
Была бліскучай перамога:
"Другі Астрожскі Ганібал", –
У ладкі пляскала Эўропа.
Кароль яго ушанаваў.

*2015*

## ТЭСТАМЭНТ

Спадкаёмца тэстамэнт прымі,
Напісаны крывёй на зямлі.
Тых крывёй, што змаганне вялі
Тут за годнасць і Волю, калі
Йшлі чужынцы да нас рабаваць,
Забіваць і ў палон заганяць.
Злой ардзе цяжка супрацьстаяць,
Але голас крыві не суняць,
Супраць здрады бунтуе, ілжы.
Ў сховах точацца нашы нажы.
Памяць генаў не перакуеш.
Кім народжаны, тым і жывеш.
Дык, давайма, мы будзем сабой,
Бо народ, што згубіў свой настрой,
Звычкі іншых і мову узяў,
А сваё разбурыў, занядбаў,
І гісторыю, міты чужых
Стаў любіць і лічыць за сваіх,
З твару знікне Зямлі той народ.
Смерць яму. Забыццё. Карагод
Свой закружыць чужынец. Жытло
Падпаліўшы тваё: – Не было
Цябе, – скажа, – ў вяках.
Я заўсёды тут быў. Мой тут шлях.

*8.08.2012 г.*

## ПРЫВІД

Закацілася сонца за вёскай.
Хмары сінія неба закрылі.
Хто там скача дарогай бясконцай,
Капытамі страсаючы іней
З верхавін дрэваў вечнага бору
І з бярозаў абапал гасцінца?
Скача вершнік ў маўчанні суворым.
Скача ў вечнасць. Не хоча скарыцца
Ён ні богу, ні чорту, ні людзям,
Што марнеюць ў нікчэмнай юдолі
На Зямлі, дзе заўжды пераможца
Толькі Зло. І не маюць спатолі
Ні Дабро, ні Разумнае Слова,
Толькі Змрок, валтузьня і пакуты.
Сэнс згублёны адзінай высновы.
Кожны п'е хай свой кубак атрутны.
Прэч, за межы зямнога адчаю.
(Прагне сэрца услед паімкнуцца)
Скача вершнік і іней страсае.
Верхавіны пакорліва гнуцца.

*1.11.2012 г.*

* * *

На беразе стромкім,
На голым каменні
Ўзрасла адзінокая хвоя.
Між прозы жыцця
Так мае летуценні
Растуць. І бяда іх не ломіць.
Як хвоя мацнее,
Хоць хвалі марскія,
Той бераг вякамі знішчаюць,
Мае летуценні між дзён нешчаслівых
Растуць і на іх не зважаюць.
Заветная мара
Ад злому, як хвоя,
Між камня жыццё зберагае.
А сінія хвалі лагоднага мора
Усцешаць, калі знемагаю.

*2015*

***

Мой бацька – меч.
Кудзеля – маці.
На свет прыйшла
Ў вясковай хаце.
У час вайны.
Маланкі білі.
Хто слёзы ліў,
Каго забілі.
Ў пакутах маці і зямля.
Палала чорная ралля.
З Усходу, з Захаду навала...
Балота, пушча нас хавала.
Мы выжывалі, як маглі.
Ды толькі душу зберaглі.
У паняверцы, у юдолі
Мы марылі аб лепшай долі,
Аб сонцы, радасці і Волі.
А меч агорнуты ляжаў
Кудзеляю і час чакаў…
Калі дачка кудзелю спрадзе,
На кроснах тры палотны зладзіць,
Адно чырвоным пафарбуе
І з іх пашые не кашулю –
А сцяг бела-чырвоны-белы.
Прыбудзе вершнік узмацнелы,
У руку возьме меч. –» Па коням, –
Гукне хлапцам. І вось «Пагоня»
Ляціць і сцяг ўгары лунае
І за сабою заклікае
Людзей заснулых больш ня спаць,
Паўстаць і Волю здабываць!

*2014*

***

Раскіну абрус я ільняны
Шаўковымі ніткамі шыты.
Успомню тады я пра маму,
Лёс ейны, бядою спавіты.

Успомню я маміны вочы,
Успомню я маміны рукі,
Якія заўжды да паўночы
У працы былі без дакукі.

А вочы ласкава глядзелі,
Ўсю душу да дна праглядалі.
Пад маміным крыллем мы, дзеці,
Сабе абароны шукалі.

Спазнала я горкае долі,
Як мамы на свеце ня стала.
І коцяцца слёзы міжволі
Ў абрус, што яна вышывала.

*17.01.2015 г.*

***

Паўстае захмуранае неба
І хавае ў сівым змроку сонца.
Хіляцца да долу голлем вербы.
Рэчка ўецца стужкаю бясконцай.

Ані зыку. Ціш паўсюль пануе.
Ў нейкім жалю замірае сэрца.
Ўголас крыкну. Хто мяне пачуе?
Толькі кропля з галіны сарвецца.

*2015*

***

Зумкае пчолка, конік стракоча.
Кожная зёлка квітнее і хоча,
Каб да яе матылькі завітвлі,
Пагасцявалі, пра штось расказалі.
Зёлкі пылок для іх смачны гатуюць.
Кветкі нектарам салодкім частуюць.
Гудам гудзе лугавая бяседа,
Лежачы ў травах, слухаю гэта.
Вось пад лістком слімачок затаіўся,
Скокнула жабка, камарык узвіўся.
Ціўкнула птушка. Жук прагудзеў.
Божа кароўка нячутна паўзе.
Далей снуюць над вадою стракозы.
Пасвяцца, мэкаюць дзедавы козы.
Коцік віжуе за чуйнаю мышкай.
Бусел на іх пазірае з узвышша.
Сонейка свеціць. Ветрык ласкавы.
Кожна стварэнне свае мае справы.

*15.12.2016 г.*

***

Як ні змагайся ты з сабой
І як ні мучай
Ты – зорны вецер пустаты,
Ты – дым лятучы...
Жыццё, закручана ў спіраль,
Мінулым стане.
На “адзавіся” крык маўчыш,
Сказаць ня ў стане.
І толькі вецер ў пустаце
Праз пыл міжзорны,
Ды пчолак зумканне “Былі” –
Гучыць мажорна.

*2017*

==============================

# ВЕРШЫ ПРА КАХАННЕ

Мастаку Алесю Пушкіну па яго замове

***

Каханне прагне маё сэрца
Такога, як на небе месяц,
Што асвятляе шлях уночы,
Лагодзіць сэрца, калі хочаш
Сябе з каханым паяднаць,
Бяз рэшты лепшае аддаць.
Калі з усмешкай на усмешку
З каханым выбіраеш сцежку
Да скону йсьці, да самай смерці
І мер нямашака памерыць
Высот кахання і глыбіняў.
Яго стасункаў дарагімі
Імгненнямі жывеш заўжды.
І марна кваяцца гады
Стаптаць яго, ушчэнт раструшчыць.
З гадамі разумееш сутнасць
І боль у шчасці спазнаеш.
Ды дзеля гэтага жывеш.
Заўсёды разам, як адно
Стварэнне боскае на свеце,
Нязменнасць шчасця бачыш ў дзецях.
Але, ці існуе яно?

***

Працяў мне сэрца навылёт
Стралы ад Эраса палёт.
Ў грудзях вулкан заклехатаў.
Пабегла ў жылах кроў іначай.
І ў кіпені крыві гарачай
Ад цнотаў лёд параставаў.
Сум безнадзейнасці спазнаў.
Салодкі боль вайшоў у цела.
Адвага сілу надала
Часцінцы кожнай звар'яцелай.
Гарыць паходня у сінечы
І не згарыць ніяк да тла.
Трымціць струною і трапеча
Ў ва мне агонь твайго святла.

***

– Для чаго і навошта было тое вам?
– Ды, за гэты міг дзіўны я царства аддам!
– Марнасць тая навошта?
– А што заўтра? Як знаць?
Яго горкія вусны хачу цалаваць.
– Прамільгне і няма!!!
– Прышласць нам не відно.
Няхай баль нам спраўляе "сягоння" адно...
Гэты позірк ласкавы на твары свіціць.
Слоў срабрыстых няўцямных цякуць раўчукі.
Як вада ахалоджваюць, паляць наскрозь
Вадаспады пяшчоты і зоркавы дождж...
За пяшчоту нічога няма ў свеце прасцей.
Я шчаслівая гэтаю доляй сваей.
Праз жыццё успаміны будуць грэць-атуляць,
Узгадаем, як прыйдзе час для нас паміраць.

***

Трымцяць ва мне сустрэчы прадчуванні.
З найлепшых слоў складаюцца прызнанні:
Як бог прыгожы ты, мацней за дуб і смелы.
Я небу дзякую за тое, што сустрэла.
З адчаем грэшніцы табе малюся,
Тваім вачам, тваім плячам, тваім рукам.
Сама сабе прарокам не зраблюся,
Як карту пры гульні, жыццё аддам.
Але, як прыканцы,заплюшчу ціха вочы,
Калі магіла парасце травой,
Магільных кветак хор нястройна прашапоча:
"Няхай, хаця на міг, ды быў ён твой!"

***

Бывай, каханы! На душы лягчэй.
Жыццё наперадзе. Яго туга і радасць.
Уцеха я – мінулага начэй
І пра мяне не будеш ты нагадваць.
Што я табе? Нічога і ніхто.
Танюткі промнік, слізгануўшы рана.
А я кахала так цябе ўсяго.
І так хацела быць тваёй каханай!
Што ж, для жаданняў існуе рубеж.
Недасягальнасць спальвае заўсёды.
Але, калі б ты толькі захацеў,
Я б асцярожнасці раскідала згароды.
З табой і за цябе праз бездань у вагні.
З табой і за табой – нідзе не страшна.
Лячу віхурай (не чапай!) праз дні.
А без цябе я – дробная мурашка.

***

То сон, альбо ява
Не ведаю нават.
Гляджу, не магу наглядзецца.
То ў марыве мройным
Высокі і стройны
Каханы глядзіць і смяецца.

Калісьці вясною
Вось тут, над ракою
Каліна цвіла – заклікала.
Як музыкі гукі
Пяшчотныя рукі
Каханага я адчувала.

Знікаюць у далі
Бліскучыя хвалі.
Ніводная з іх не вярнецца.
Стаіць ля каліны
Каханы мой мілы
Спявае. Ці гэта здаецца?

Пра тое спявае,
Як моцна кахае.
Калышуцца ціха бярозкі.
Рачная вадзіца
Плюскоча – бруіцца.
Ліюцца салёныя слёзкі.

Хай слёзкі ліюцца.
Мае дні мінуцца.
І мрояю стануць туманнай.
То сон альбо ява
Ня ведаю нават.
У песні са мною каханы.

***

Рамонкі белыя, скажыце
Ці прыйдзе мілы, ці не прыйдзе?
Ці помніць з вечара да рана,
Што ён адзіны мой каханы?

***

Які у нас будзе на заўтра прагноз?
Трашчыць, прыціскае, лютуе мароз,
Ламае калянае вецце...
Ды, як да цябе мне дабегчы?
Няма ў мяне футра і хусткі няма
І цёпленькіх ботаў не маю.
Калоціцца, стыне у целе душа...
Паклічаш, то вырвецца – знаю.
К табе і без футра яна паляціць,
Бо ёй апранахі ня трэба.
Пакліч, бо мне ўбачыцца вельмі карціць!
Хай стыне зімовае неба!

***

Урачыстая шлюбная ноч
У палёх паміж кветак і траў.
На купалле каханне сваё
Да апошняе кроплі спазнаў.
Бегла ў рэчцы спявала вада.
З неба сыпала зорак сяйво.
Піў кахання хмяльное пітво,
Пакуль сонца ўгары не ўзыйшло.
Клятвы чулі русалкі ў вадзе.
Ў жыце жыцень сплятаў васількі.
Салаўі узляталі з рукі.
Пошчак трэляў гучаў ля ракі
Бегла ў рэчцы сплывала вада.
Асыпалася зорак сяйво.
Нас з табой вартавала бяда,
Як пякучае сонца ўзыйшло.
Біла нас пярунамі жыццё.
Замятала завея зімой.
Ды каханне нам сілу дало,
Бо заўжды былі разам з табой.

***

Ўдых – выдых... Раптам у адно
Пераўтварыліся стварэнне.
Спынёна часу плынь-цячэнне.
Канца з пачаткам не відно.
Застылі зоры. Па арбіце
Не круціць болей шлях планэта.
Буяе водарамі лета.
Між кветак затаіўся вецер.
Ўдых – выдых разам. Ва ўнісон.
Адначасова сон – ня сон.
Душа нямая адлятае.
Трымціць напятая струна.
Але ізноў нас раз’яднае
Вяртанне з гэтай плыні – сна.

***

Прашаптала спакойна: “Бывай”,
Тарганула плячом і пайшла
Назаўсёды з маёга жыцця,
Як ніколі у ім не была.

Вецер воблакі расцерабіў.
Вараннё з галін дрэў узняло.
Як ніколі табою не жыў,
Як ніколі цябе не было.

Назаўсёды сплывала вада...
Замуцілася светлае шкло...
Як ніколі цябе не кахаў.
Як ніколі цябе не было.

## РАЗВАЖАННЕ ПРА КАХАННЕ

Смеючыся казала: “Назаўжды пакахала...
Ты – герой. Я не здраджу ніколі...”
Ды абрынула брыдкая свету навала,
Біла, курчыла, ў дробныя трэскі ламала...
Вязьнем стаўся герой у няволі:
Ні здароўя, ні грошай, у сэрцы пажар.
Паліць полымем боль за Радзіму.
Ты пайшла адвярнуўшыся прэч ад яго,
Бо сваёй барацьбы не пакінуў.
Смех на вуснах тваіх. З іншым жыць вяселей.
Ну, нашто марнавацца з героем?
Адзінота – то лёс гераічных людзей.
Іншым люба цяпло са спакоем.
Але ёсць і другія, што ў сэрцы нясуць
Да герояў спагаду і ласку.
І да скону за імі праз церні ідуць.
Пра такіх трэба болей расказваць.
Ёсць дзяўчаты, што з вязьнямі бралі свой шлюб.
Ёсць жанчыны, што й мёртвых чакаюць.
На агні гераічным гартуюць дзяцей.
Хай нашчадкі пра іх ўспамінаюць.

## ЛЮБОЎ

Любоў церпіць доўга.
Любоў мілажаліць.
Любоў не зайздросціць
І любае хваліць,
Сябе ня ўзвялічвае, не выстаўляе.
Яна не бушуе, свайго не шукае.
З няпраўдай любові балюча мірыцца.
Балючае мусіць ад праўды гаіцца.
Між цяжкіх варункаў любоў падтрымае
І любых сабой ад бяды засланяе.
На слова нам верыць.
Заўжды спадзяецца.
Усё пераносіць.
Любоў не мінецца.
З Надзеяй і Верай Любоў суіснуе.
Ды толькі Любоў больш за іх дакляруе.
Калі ж, як адное, Любоў і Каханне
Жыццё аддамо ім мы без шкадавання.

***

Трымцяць і трапечуць, ціхутка спяваюць,
Бо  голасу моцнага дрэвы не маюць.
Навек прыкаваны да месца сваёга:
Карэнне ў зямельцы, карона ў разлогах.
Аблокі даносяць  навіны са свету.
Дзе дзецца тое, ствараецца гэта.
Карэнне пампуе ім сілу Зямлі,
Каб жыццейка кволых ахоўваць маглі.
У іх трапятанні, трымценні, спяванні,
У слабых і моцных галінаў гайданні,
У буйным квітненні, пладоў дараванні
Я чую на злосных вятроў нараканні,
Да долі нясчаснай людзей спачуванні,
Пра даўніх часінаў падзеі паданні,
Што бачылі дрэвы на нашай Зямлі
За тыя вякі, што стаялі-раслі.

*2015*

***

У сінім небе між аблокаў
Лунае коршун адзінока.
Пажыву бачыць ён здалёка.
Ні птушаня, ні мыш, ні заяц
Ніяк не здолеюць схавацца
Ад зроку, што няўмольна сочыць
У час бязлітасна раптоўны.
Гуляюць, цешацца з жыцця
І над сабой бяды ня чуюць.
А вочы пільныя пільнуюць.
Дарослы ты, альбо дзіця,
Ці старац зморany нягеглы
Наканаваная рука
Усіх дастане адпаведна.

*06.2015 г.*

***

Баліць душа і не іначай
Аб страчаных імгненнях плача,
Калі сярод будзённых спраў
Без дай прычыны сумаваў.
Быў малады, з журбою ў сэрцы,
Хацелася зысці, памерці…
Не меў куды прыкласці сілы.
Праз гэта свет мне быў пастылы.
Ўся недарэчнасць, бессэнсоўнасць
Жыцця, ў якім сугнеі топчуць
Ў адзін сумёт, як быдла гной,
Свет праўды разам з дабрынёй.
Аб дасканаласці не дбаюць,
А толькі бруха набіваюць…
Сябры… Але, дзе возьмеш шчырых?
Папераблытвалі з карысцю
Сяброўства. А ў хвілю цяжкую – няма.
Жыццё такое. І дарма
Мяне ўсё гэта турбававала.
Гарэў і гаснуў. Было мала
Прасторы, поўнаму мне сілы.
А зараз свет зрабіўся мілы.
Чаго няма – нашто шукаць?
Што маеш – лепей раздаваць
І быць спагадліва– лагодным,
Глядзець і цешыцца з прыроды,
Не гадаваць ў сабе надзей.

Недасканалы род людзей
Інакшым зробіцца калісьці.
А зараз ён яшчэ ў калысцы.
Зло і дабро перамяшаны
І ў свеце, і ў людзёх таксама.
А сэнсу ўвогуле няма,
Таго, якога мы шукаем,
Ў пакутах б’емся, наракаем….
А старасць – вось ужо яна:
Нягегласць, слабасць, шкадаванне
Аб днёх працекшых як-бы марна…
О, лепш бы цешыўся, кахаў
І кожны божы дзень прыймаў,
Як падарунак найкаштоўны,
Быў ціхамірны і спакойны.
І ў часа зблытаным сувою
Ліліся б дні мае ракою.

***

Пуста на вёсцы, пуста…
Хаты маўкліва стаяць.
Асірацелыя бабы
Мусяць свой век дажываць.
З'ехалі дзеці у горад.
Ў зямлю ляглі мужыкі.
Як бы падвей які з морам
Там іх паклаў ля ракі
Ў могілкі спітых і слабых.
Хаты панура стаяць.
Толькі знямоглыя бабы
Мусяць свой век дажываць.

*2000 г.*

***

*Маё сэрца баліць, як рана,*
*Не сціхае ні на мінутку.*
*Як імжа паяднана з туманам,*
*Так і боль перавіты са смуткам.*

*Ветры цёмныя хмары развеюць.*
*Сонца ў небе. Прастора смяецца.*
*Толькі смутак з журбой мацнеюць.*
*Боль пакіне, як спыніцца сэрца.*

*2016 г.*

***

Скажу спакойна я:
“Забудзься ўсё. Зірні на шэры дым.
Люцеюць халады, куды ён адыходзіць.
І вельмі хутка мы – услед за ім...”
Люцеюць халады. Цямнеюць ночы.
Наперадзе – няпраглядная ноч.
Віецца шэры дым і ў бездань адыходзіць.
Малю свой дзень: “Хоць ты павольней кроч.
Дай асалоду бачыць сінім неба,
Дазволь паслухаць песні раўчукоў.
Ў астатні міг, мо’ болей і не трэба,
Каб васільком зрабіцца між жытоў.”

*01.2017 г.*

***

Рэха звонкае – німфа няўлоўная,
Рыфма лёгкая – песня чароўная.
Вы – сяброўкі мае назаўжды.
Марна хочуць разлукі гады.
Ветрык ласкавы мне павявае,
Песню лёгка на крылы ўзнімае.
Разам з рэхам нясуцца яны
Да абрыву, дзе мірна чаўны
Паўзатопленыя,
ціха сняць,
Як ім ветразь шаўковы узняць.
Два чаўны пад вадой
Ды вярба, што самотна схіліла галлё,
Спачувае ім разам са мной:
– Супакойцеся, кажа, быллём
Парасло, што было. Што гадаць!
Мары яваю вашай ня стаць.
Не убачыце мора бурлівае,
Не спаткаеце хвалі гуллівыя,
Ціха будзеце век дажываць…
Ну, навошта вам трызніць і зваць
Рэха звонкае – німфу няўлоўную,
Рыфму лёгкую – песню чароўную?
Вас трымаюць і ціна, і раска.
Ну нашто вам чароўная казка?

– Мы ня можам табе растлумачыць,
Як нам хочацца долі інакшай.
Вось і зараз ад нашай нядолі
Клічуць песня і рэха да Волі.
І лунаюць, і кружаць ў паветры,
І здаюцца цяжэй нашы нетры.
Дайце ветразь і з ім стырнавога,
Мы да мора пралажым дарогу.
На прастор! У кіпучыя хвалі!
Паўнату каб жыцця адчувалі,
Мы, змарнелыя ў завадзі соннай.
Да жыцця! І да хвалі салёнай!

*1977 г.*

***

Ўсё на свеце мінае:
І шчасце, і боль.
Слёзы высахнуць з твару,
І выступіць соль.

Як аблокі развее вецер радасць тваю.
Гараваць не умею, я спяваю-пяю.
Я пяю пра травіцу, што любіць цяпло,
Пра цямніцу, што марыць заўжды пра святло,
Пра глухіх, што ў прасторы бяз гукаў жывуць,
Пра сасмяглых, што воду крынічную п'юць.
Я спяваю пра зоркі на небе ўначы,
І пра тых, што захочуць ад сябе уцячы,
Ад сваіх разважанняў, ад спрэчак пустых.
Як іх гэта калечыць, я шкадую аб іх.
Я шкадую струменяў няўрымслівы бег
І паяцаў на сцэне наўмыслівы смех,
Часу марныя хвалі, што аднекуль прыйшлі,
І пра тых, што спазналі, ды выйсця не знайшлі.

Што прыйшло, тое зыйдзе, як струмені ракі.
Слухай, промні трапечуць каля бледнай шчакі.
Здавальняйся імгненьнем,
не марнуй ў смутку час.
Існаваннем валодай – вось гэта пра нас.

***

О, пясочны гадзіннік,
Непазбежнасці часу няўмольнага сымболь.
Я гляджу на цябе, а хвіліны бягуць
Раўчуком, што цурчыць з акіяна мінулага
Ў акіян, які будучым людзі завуць.
Мы плывем ад вытокаў.
Вытокі ў мінулым.
І дакладна на памяці мапу
заносім падзеі.
Але што за лукою?
Ў няведанні мучымся…
І цвітуць фантастычныя
кветкі надзеі…
За якой лукавінаю кветкі ня звянуць?
Як даведацца, што там, за выгібам тым?
Ты бяссільнаю робішся, о, мая неабсяжная
памяць.
Чым ты мне дапаможаш за тым паваротам
крутым?
Я кратаю гадзіннік,
і пясочны струменьчык
Зноў у бок адваротны цурчыць.
Ці змагу я свае
так пакратаць імгненні,
І закрэсліць няўдалае,
І прымусіць гучаць, што маўчыць?
Не паддайся адчаю.

У гэтым свая асалода,
Што нам дадзена раз
І ў напрамку адзіным праплыць.
Кожным існым імгненнем валодай,
Аздабляй, упрыгожвай,
Толькі так можна жыць.
Аздабляй дабрынёй, працы вынікам сталай,
Розум свой практыкуй, ды не марнай гульнёй,
Каб на памяці мапе
Сталі вехай удалай
Дні натхнення твайго,
Зодум здейснены твой!

*1976 г.*

***

Месячык-месяц зорачак пасвіць
Там, на бяскрайнім папасе сваім.
Сочыць за кожнай, каб не пагаслі.
Мне размаўляці весела з ім.

Ночкай марознай свае карагоды
Зорачкі водзяць у вышыні.
Месячык-месяц, доўгія годы
Жыў я у горы, а ў шчасці – дні.

Як я зайздрошчу зоркам нябесным,
Ім невядомы клапоты людскія…
– О, не зайздросці ім, бесцялесным,
Ёсць у вас сэрца, і ўсе вы жывыя.

– Цэлую вечнасць свецяцца зоркі,
Усе іх любяць, ім спагадаюць…
Я ж праклінаю парою лёс горкі,
Б'юся ў пакутах і ледзьве трываю.

– О, не зайздросці, ты маеш пачуцці,
Можаш смяяцца і плакаць ад болю,
Ў гневе бываеш няпраўду пачуўшы,
Маеш мысленне і моцную волю.

Думкай імклівай Сусвет працінаеш,
Зводзіш мінулае з будучым разам.
Ці ўсведамляеш тое, што маеш?
Ты – чалавек – уладар па-над часам!

Марна зайздросціш матэрыі грубай,
Іх прымітыўнаму, простаму з'зянню,
Вечнасьць аддаць ім заўжды было б люба
Толькі за момант твайго існавання.

Месячык-месяц зорачак пасвіць
На векавечным папасе сваім.
Сочыць за кожнай, каб не пагаслі.
Мне размаўляці весела з ім.

*1978 г.*

***

Шпурляе вецер чоўн між хваляў
То ўніз пад грэбень, то ўгару.
Магутным рытмам акіяну
Зачараваны, не памру
З вадой салёнай ў альвеёлах,
З крэветкамі у валасах,
Стырно трымаю і па зорах
Кірую у нікуды шлях.
Зноў на хрыбце у хвалі човен.
І раптам сціхла бура. Ціш.
У вымярэнні, безумоўна,
Ты іншым здзіўлена ляціш.
Стырно адкінуў, бо ня трэба.
Шукаць напрамкаў мне даволі.
Тут не існуе нават ценю.
Я апынуўся ў вольнай волі.
Усе напрамкі роўнапраўна
У кропцы сходзяцца адной.
А там стаіць панура Памяць
І мыецца сухой слязой.

*30.07.2014 г.*

# РАЗВАЖАННЕ

Калі,
Хто здольны розумам сваім
Сягнуць ў глыбіні з’яў,
Той ведае,
Што бітвы дабра і зла,
Дзе ім ні давялося б сутыкнуцца,
Заўсёды маюць сэнс вялікі.
І, безумоўна,
Будуць уплываць,
Калі ж сказаць дакладней,
Яны дадуць кірунак развіцця
Сусвету цэламу.
Няма ніводнай справы злой,
Ніводнай добрай,
Якія не адбіліся б на лёсе
Наступных пакаленняў.
Незалежна,
Ці то было пры сведках,
Ці без сведак.
Ці тое адбывалася ў палацах,
Ці паміж звыклымі людзьмі
У іх прытулках.
БО,
Як і ў добрым,
Так і ў злым
Няма нязначнага.
І ланцужок прычынаў
Зусім малых
Пацягне за сабой ВЯЛІКІ ВЫНІК.

*07.2014 г.*

## ПРА СВАБОДУ ВОЛІ

Стваральнік наш,
Неспасціжымы нехта
Даў волю вольную
Для кожнага стварэння.
Што гэта значыць? Толькі тое,
Што
Кожны момант
Кожнаму
Жыццё
Рабіць свой выбар пэўны прапануе.
Шмат рознастайнага
Плыве перад вачыма.
І несупынна кожны выбірае.
І, такім чынам, свой будуе лёс.
Яшчэ таксама
На лёсы блізкіх вельмі ўплывае
Сваімі схільнасцямі.
І нават
На лёс свайго народу ў цэлым.
Як бы дзіўна
Не паказалася б
На першы погляд гэта…
Далей, калі паўстане выбар канчатковы
Паміж Дабром і Злом,
Якія маюць аблiччаў шмат.
Тут чалавека якасці адразу
Праявяцца.
Бо поўную адказнасць душа мае
За ўчынак, зроблены
Сваёй уласнай воляй.
І паступова ўбачым,

Як ад дробных
Ці «так» ці «не»
У побыце
То на карысць ляноты,
То хцівасці. то зайздрасці, то злосці.
Ілжы й таму падобнага
Мы дойдзем да падмурку,
Да самых, што ні ёсць,
Фундаментальных рэчаў
Такіх,
Як здрада ўласнаму народу
Дзеля сваёй малой карысці
Альбо жадання ўлады непамернай…
Пасля таго,
Як асэнсуюць вынік,
Шукаць спрабуюць людзі апраўдання.
Бо ведаюць сваіх паводзін хібы.
А апраўдання, ўвогуле, няма.
І чорнае кляймо
Запляміць чалавека
Назаўсёды.
Бо воля вольная
Яшчэ спачатку
На карыстанне
Дадзенай была.

*25.09.2012 г.*

## ЧАРНОБЫЛЬ

Паветра не хапае. Слоў ня маю.
Нямею перад тэмаю такой.
Амаль штогод хварэюць, пакідаюць
Сябры і родныя, і дзеці вас са мной.
Чарнобыль выбухнуў.
    І чорным прасціpадлам
Накрыла землі нашай Беларусі.
Нябачная атрута распаўзлася.
Амаль штодзённа паміраюць людзі.
Наведай Бараўляны і убачыш
Ў якіх мучэннях хворыя канаюць.
Лядовыя будуюцца палацы,
А хоспісаў ніяк не прычакаюць.
Умоўна чыстым ад радыйнуклідаў
    Нас кормяць.
Без прынук амаль вядуць
На розныя відовішчы, як быдла.
Абы не думалі пра тое , як жывуць.
Ўсё меней нас.
    Хто з’ехаў.
                    Хто памёр.
Не нарадзілі беларусаў новых.
І з паралюшам волі мы жывом,
Прымаючы хлусню на ўсё гатовых
Улад дэбільных,
Што дзеля імгнення
Свайго татальнага над намі панавання
Распрадаюць краіну ў часе новым,
Таксама не жадаюць і не ў стане

Развязваць
    Рубам стаўшыя
                        Пытанні:
НАМ БЫЦЬ ЦІ НЕ?
Калі ж па праўдзе, ТО
Не жывуць у нас, а дажываюць,
Сагнуўшы плечы,
            Ўнурыўшы галовы.
На прышласьць добрую надзей не маюць.
ДЗЕ, ДАБРАДЗЕІ,
            БРАЦЬ
    НА ГЭТА СЛОВЫ?!

*17.04.2014 г.*

***

## *Прысвечана Украіне і ня толькі*

Зямлю спыніце!
Я з яе сайду,
Бо боль працяў нясцерпны маё сэрца,
Няхай ў прасторы шчасця не знайду,
Але пазбаўлюся таго, што прыкра ўецца
Вакол мяне на гораснай Зямлі
Паміж людзьмі, што не знайшлі лагоды,
Дзе зграі хцівых ўладу узялі
І прывялі ў мізэрны стан народы.
Дзе гнюсныя лісліўцы ліжуць пыл
На ботах ўладара, як бот, дурнога,
Які кіруючы на свой капыл,
Пераўтварыў багаты край ў убогі.
Зямлю спыніце!
Болей не хачу
Я назіраць, як плачуць рэкі, пушчы.
Хачу крычаць – заткнулі рот – маўчу.
Людзей пазбавіў зроку невідушчы.
Паўстаньце! Кіньце гэтае цярпець!
Сякеры ў рукі, вілы і пістолі!
Пара даўно ужо вам разглядзець,
Што толькі так сваю здабудзем долю!
Хай кулакі мацнеюць у дабра
На гэтым свеце. Гэй, даўно пара!

*05.2014 г.*

***

Травень 2017 г. Святочны Кіеў. Унучка на Еўрабачанні. Майдан. Ушанаванне кветкамі Нябеснай сотні і беларуса Жызнеўскага. Сусутрэча з даўнімі сябрамі – сям'ёй Цімашэнкаў. Успаміны.

## РАЗМОВА ДАЎНІХ СЯБРОЎ

Адказ Юры Сцяпанавача Цімашэнкі (Кіеў) на пытанне Гермагена Кірылавіча Каралёва (Анапа, Расія)

Ён запытаў мяне: "Што даў табе Майдан?"
Пытанне ў лоб. Адразу не адкажаш.
Але, як крокамі святочны Кіеў пляжыш,
То ясным робіцца наканавання плян.
Як хочаш пра выгоды ў грошах чуць,
То прамаўчу, бо не адчуў нічога.
Нябеснай сотняй стогне Перамога
І крыллі Волі за плячмі растуць.
Адчуў: былі калісь, мы ёсьць і будзем далей,
Што кроў сваю ад продкаў атрымалі,
Што мова і традыцыя жывуць
І з гонарам, як роўныя, ідуць
У свет шырокі непадзельны,
Адкінуўшы зняваги гнёт пякельны..
Час распачаў на нас нястомна працаваць,
Хоць круціць жорны вельмі ён паволі.
Але, здабытую крывёю Волю
Не згодны і будзем аддаваць!

*05.2017 г.*

***

*На Майдане гучала песня на словы Віталія Кароціча «Астатня пісьня старога лірніка». Нарадзіліся новыя словы...*

Перавядзі мяне цераз Майдан.
Жанчына плача там. Я быў калісьці з ёю.
Стаю сляпы, скалечаны вайною.
Перавядзі мяне цераз Майдан.
Перавядзі.. Я ёй скажу, ня плач,
Скажу, ня плач і не шкадуй пра страты.
Нябеснай сотні стогнаў не шкадуй.
Ты бачыш наш жовта-блакітны ўзняты.
Паветрам Волі дыхаем паўсюль.
Перавядзі мяне цераз Майдан.
Абпаленага "Градам" не пазнае.
Я ёй скажу, зірні, наш сцяг лунае
І ў небе – галубы, а не груган.
Перавядзі мяне цераз Майдан.
Перавядзі. Там плёскае фантан.
І дзеці ловяць колеры вясёлкі.
Я не шкадую, што згубіў здароўе.
Перавядзі мяне цераз Майдан.
Перавядзі. Скажу ёй, хай ня плача.
Шчаслівую Украйну дзеці ўбачаць.
То вышняй волі выкананы плян.
Перавядзі мяне цераз Майдан.

*05.2017 г.*

***

Вазьму галавой аб сцяну навярнуся.
Бо выйсця няма. Забіваюць і душаць.
За сцяг і за мову, за вольнае слова
Збіваюць і душаць ўсё больш адмыслова.
Пазбавілі працы і штрафам абклалі.
Маёмасць дзяцей і унукаў забралі.
Загналі у гета. Не рыпнуцца стуль.
Мой божа, дакуль гэта будзе, дакуль?
Канаем паціху, усе па адзінцы,
Бо кожны сядзіць у маленечкай скрынцы.
Камусьці маркоўка, камусьці капуста…
А ў нечыяй скрынцы даўнюсенькі пуста.
Кагось прыкармілі, яны імітуюць,
Як права і волю між скрынак ратуюць.
І бэкаюць нешта, ды так асцярожна,
Бо морквы з капустай тады не паложаць.
Расейскай пятой прытапталі жалезнай.
Дудзяць у мас-медыя пра незалежнасць.

*04.2016 г.*

***

Зняважаны гэній валяўся ў гразі.
Па  ім, як па кладцы, ішлі у князі
Распутства і глупства, і хіжая злосць.
Шпурляла са смакам абгрызену косць
Ў яго крывадушша. А здрада і здзек
Над ім рагаталі. Ня ўзняўшы павек
У брудзе зняважаны гэній ляжаў.
Ды жарам нясцерпным вулкан клекатаў
У сэрцы шляхотным. І далей па ім
Ішлі срэбралюбцы, пыхліўцы ішлі,
Таптталі, плявалі, размовы вялі,
Што добрае гэнію месца знайшлі.
Туды яшчэ добра б сумленне сапхнуць
І праўду, і шчырасць, бо жыць не даюць,
Ўладарыць без межаў на гэтай зямлі.
Бяз іх назаўжды яны тут каралі:
Хто голас узніме – то горла заткнём.
Рукой варухне, дык руку адсячом,
Гразёю замажам, засыплем пяском.
Хіжняк бессаромны у нас ўладаром,
Як выбярам, будзе усім кіраваць,
А мы у хаўрусе із ім панаваць.
Натоўп раўнадушных на ўзгорку стаяў.
Чым скончыцца гэта спакойна чакаў.
Цнатлівасць гаручыя слёзы ліла.
Рака яе слёзаў да мора цякла.
А гэній зняважаны ў брудзе ляжаў.
У сэрцы яго не на жарт клехатаў
Вулкан жараносны. З пад прэсу пакут
Ён выбухнуў моцна і вынішчыў бруд,
І хіжую зграю зласлівых спаліў,
А зямлю сваю да жыцця адрадзіў.

*2.05.2014 г.*

***

Папера церпіць ўсё.
Цярусіцца з газэт,
Хлуснёю аж заходзіцца рэкляма.
Бязбожна маняць дыктары з ЦТ
Пры раскартоўцы фактаў "Панарамай",
Прывыклыя к пакручастай хлусні,
Мяшанку з маны з праўдай вырабляюць,
І, сораму не маючы зусім,
Ў афяр, як снайпэр, цэляць і страляюць.
Радзіма змардаваная мая,
Дзе з амаль кожнага зрабілі дурня.
Між пазнішчоных рэкаў і палёў –
Насьмешкаю – трыумфы на трыбунах.
Час хваравіты катаў і ахвяр
І тых, каго сумленне не згрызае.
Цынізмам шлях пасцелены наверх
Архіваў змрок у цішыні хавае.
І быў заглушаны адчайны "SOS".
І РЭКВІЕМ загубленым не гралі.
А над усім, што зроблена было,
Чырвоны з зеленню злачынцы сцяг узнялі.

*2017 г.*

## НАТАТКІ ДЫЛЕТАНТА

Пра узнікненне рускай мовы

Калі "вялікі і магутны"
Кавалі ў Піцеры,
Сабраўшыся нячутна,
Міхайла Ламаносаў і Дзяржавін
Да іх у публікі ня мелася пытанняў.
Бо рознамоўнымі былі народы.
Арыстакратам быў французкі да спадобы
Ў той даўні час. Агульнага ня мелі.
Масква з Калугаю зусім не разумелі
Адна другую, а тым больш татары,
Што усталёўвалі арду на тых абшарах.
Царыца-немка хітра падыходзіць
І пастулат жалезны вынаходзіць:
Каб збіць імпэрыю у маналіт
Патрэбны – вера, мова і агульны міт
Пра яйца, што з адной кашолкі.
І сціхнуць на абшарах крыватолкі.
З агульнай моваю
Татарын і тунгус,
Башкір, пермяк і фін
І іншых многа
Рускімі пастануць,
"Обрящут речь" і бунтаваць не стануць
Супраціў трона у адзінай веры,
Бо мова скруціць дрэнныя намеры.
З вялікім вельмі "прымесам ілжы"
Гісторыю напіша Карамзін.
За ім паўторацца адзін ў адзін
Ўсе міты пра агульнае славянства,
Пра Рурыка дынастыю у панстве,

“Старэйшых” статус для сябе прысвояць,
А землі “маладзейшых” перакрояць.
Усё, што вымысляць,
Як летапіс запішуць.
Няхай цяпер сядзяць цішэй, як мышы
Пад венікам, скароныя народы.
Для развіцця свайго у іх няма нагоды.

Ды вышла мова ў іх “зело” карава.
На шліхаванне турку далі права.
Амбітны і старацельны Жукоўскі
Даў мове каларыт турэцка-львоўскі,
Ў славянску вязь балгар
Ўнёс цюркскія адценні.
І гэта так было. Руку на адсячэнне
Даю.
Аднак ізноў выходзіць слабавата.
І імпэратар не шкадуе “злата”.
Ліцэй загадвае зрабіць
Ў Сяле тым Царскім.
І юнакоў збіраць туды дваранскіх
Найлепшых.
Іх вучыць
І ім магчымасць даць
Сябе на розных мовах забаўляць.
Настаўнікаў паставіць наймудрэйшых
Хай вучаць іх пісаць трактаты, вершы.
Усё дазволена, каб вынік атрымаць…
З’явіўся Пушкін. Вершы стаў складаць.
Ён мову шліхаваў,
Як дыямэнт “Кімберлі”.
І рускія калмыкі не памерлі.

АЛЕ
“арапска кроў” пачне ўскіпаць.
Стаў Пушкін гучна ВОЛЮ выклікаць.
А РУСКІМ ВОЛЮ нельга дазваляць,
Якія ёсць кангламерат народаў малых:
Мудрэйшыя з “жыдоў”,
Астатнія з “адсталых”.
Прыціснуў добра ўсіх “ВЯЛІКІ І МАГУТНЫ”.
Дасюль ад тых часоў
Нас “ВЕЛІЧНАСЦЮ” мучыць.
Запуталіся ў гэтай павуціне,
Хто ў міт паверыў
І паціху гінуць.
Імпэрскі ж дух жывы
Й ніколі не пакіне
АРДУ,
З’яднаную пад птушкай
Дзьвухгаловай,
І з лютай ненажэрнасцю
Дзяўбсці
І Захад, і Усход,
Заўжды гатовай.

*17.02.2014 г.*

***

Куды ступае конь з капытам,
Туды і рак паўзе з клюшнёй.
У след патрапіць конскі хоча,
Ляцець галопам над зямлёй.
Ды толькі марныя стараннi
Прывыклым поўзаць паскакаць,
Напружваючы ў след патрапіць,
Ім лёгка незнарок сканаць.

*24.12.2014 г.*

## КАСКАДЗЁРЫ

Завые ярасна матор.
Рванецца з месца каскадзёр.
Казыча нэрвы пах крыві,
Альбо, як хочаш, назаві
Па краю смерці і жыцця
Той рызыкованы палёт.
І памінальная куцця
Не як заўжды. Наадварот.
З агульнай пляшкі ўсім каўтнуць.
Ні жалю. Ні перасцярог.
За край яшчэ раз зазірнуць –
Там іншых вымярэнняў бог!
Для іх мінулага няма,
Не маюць з будучым турбот.
Сэнс – у напоўненасці дня.
Ён – рызыкі сваёй пілот.
Заўсёды нэрвамі ўладаць,
Утаймаваць шалёны пульс,
Ўсім авалодаць, ўсё спазнаць
І па лязу не саслізнуць.
Раві ж у ярасці, матор,
Твае магчымасці па мне.
Дзень кожны бездань распрасцёр
Будзь тое ў яве альбо ў сне.

*1975 г.*

## СЭНТЭНЦЫЯ

Залаты ананас Коста-Рыкі,
(Мне гартанныя чуюцца крыкі,
Цёмнатварыя людзі ідуць
Вас зразаюць, у кошык кладуць...)
Ты, абласканы промнямі поўдня,
На экватары вырас і сёння
Упрыгожыш святочны наш стол.
З дальняй далі да нас ты прыйшоў,
Сушай ехаў і плыў акіянам.
Пра прыгоды твае у раманах
Анікому ніхто не раскажа.
Толькі думка мая ціха звяжа
У суцэльнасць прасторы Зямлі.
(А ці можна было уявіць
Ананас разам з бульбай і салам,
Мандарыны каб, ківі ляжалі
Побач з кіслай капустаю нашай?)
Вось глабальныя вынікі часу...
Свет Зямны і яго непадзельнасць.
Моў і розных народаў суцэльнасць.
Як мы блізка на нашай плянэце...
Мы усе яе родныя дзеці!

*12.2015 г.*

**УРАЖАННЕ** ад падарожжа ў Егіпт

Вось драмадзёр сярод пустыні
Брыдзе ў міраж блакітна-сіні.
Віецца між калень пясок,
Пякучым ўзвіхраны сірока.
Пустыня – дакуль бачыць вока.
Палімы смагаю нясцерпнай,
Барханы азірае зверху
Ў бурнусе белым бедуін –
Вярблюдаў паганяты вечны.
Панылы, сумны свой матыў
Выводзіць ён простасэрдэчна.
А то ўрачыста замаўчыць,
Складаючы багам малітву.
Вятры і сонца вядуць бітву
З пустыняю. Ніводнай хмары
На небе чорнае Сахары.

*04.2006 г.*

## МАЛІТВА

Дай, Божа, мне даваць, а не прасіць.
Дай, Божа, мне смяяцца, а не плакаць.
Дай, Божа, усё ўмець , хаця ня ўсё рабіць.
Дай, Божа, мне пачутае убачыць.
Дай, Божа, радасць плённа працаваць.
Дай, Божа, каб заўсёды было гожа,
Між родных і ўставаць, і начаваць,
І роспачы не мець на раздарожжах.
Дай, Божа, на жыццё , на доўгі век,
Дай, Божа, двое – шчасце і здароўе,
Каб шанаваў адзін аднога чалавек,
Каб быў лагодным і ня ведаў войнаў.
У імя трох, пасталых, як Адзін,
Найвышні бацька наш і Сын, і Дух Святы. Амін.

*20.02.2014 г.*

***

Воляй божаю, сілай нябеснаю
Хай зрабілася б так, што ўваскрэсла я.
Каб лісцё горкай скрухі абтрэслася,
Каб пагляд быў і ясны, і веселы,
Каб пабачыла тое, што ўмарыла,
Каб жыццё не было скрушнай яваю,
Каб па траўцы зноў борзенька бегала,
Каб хваробы і здрады ня ведала,
Каб былі мае дзеткі здаровенькі
І вясною, і ўзімку, і восенню,
Каб былі яны ў радасці лецейкам,
І каб з'зяла ім сонейка светлае
Круглы год і мяне ўспамінаючы,
Усміхаліся, гора не знаючы.

*2016 г.*

***

Нешта набрыняла хмара па-над полем.
Будзе навальніца. Працаваць даволі.
Дождж цурком паліўся. Пяруны ляскочуць.
А на сэрцы добра. Піць зямелька хоча.

*2016 г.*

***

Адкрыць я не хачу ўсё тое, што хаваеш.
Бясспрэчна кожны з нас свае заганы мае.
Бо прыклад дасканаласці святое
Разбурыцца, калі пабачу тое.

***

## РАДОК З К. КРАПІВЫ

Аслы пыхлівыя і ў сне, і ў яве
Мне сонца хочуць засланіць вушамі.
Але прырода так наканавала:
"Каб сонца засланіць, вушэй асліных мала."

***

Даволі, хлопцы, даўно даволі
Сядзець і хныкаць аб нашай долі.
Спявайце песні, шануйце слова.
Народ існуе, як жыва мова.
Бярыце шаблі, сядлайце коней,
Ўзнімайце вышай штандар з Пагоняй!

*2015 г.*

***

На стромкім беразе Дзвіны,
У Полацку Сафію збудавалі.
Яе крыжы да неба даставалі.
За іх, блукаючы, чапляліся аблокі.
Час  іншы быў тады, ад нас далёкі.
Быў камень Трувара абрушаны ў Дзвіну,
Каб меў тутэйшы люд рэлігію адну.
Стаялі моцна каб, з'яднаныя у веры,
І ворагаў адпрэчвалі намеры!

*2014 г.*

# У ПЛЫНІ АДНАГО ЧАСУ

## РАГУЛЯ АЛЯКСЕЙ УЛАДЗІМІРАВІЧ

Прафэсар Рагуля – сапраўдны філосаф.
Нябачнае бачыць яго востры розум.
Ён рэч разглядае і зверху, і з боку.
Пласт ніжні капае рыдлёўкай шырокай.
Аналіз і сінтэз. І што вынікае
З таго, што наш свойскі пісьменнік крэмзае.
Усё па паліцам разложыць заўзята.
Аж дзіву даешся, адкуль тое ўзята.
І цешыцца аўтар, што,нават, ня думаў
З'явіць ў інсітыве глыбокасць задумаў.

## ЯЎГЕН ГУЧОК

Гучок, як конь незацugляны,
Ты скачаш праз равы і ямы.
Ўздымаеш у архівах пыл,
Каб выкласці на наш капыл
Гісторыю сваёй краіны:
Дакладна, проста, аб»ектыўна.
Адвеяць прымесы ілжы
Ад праўды золата спрабуеш,
Кош самародкаў прапануеш.
Бярыце, кажаш, задарма.
Пазбавяць веды ад ярма!
Але брыдзе няўцямна міма
І толькі лыпае вачыма
Натоўп глухі і несвядомы,
Хлуснёй ачмураны штодзённай.
Ты ж, вольны конь незацугляны,
Нясесешся праз равы і ямы,
Не маючы ад іх пашаны.

*20.01.2014 г.*

## ВЕРА БУЛАНДА

Вочы блакітныя,
Постаць пластычная,
З'зяе натхненнем,
Уся артыстычная
Нашая Вера Буланда
Прыгожая.
Вершаў лірычнасць
Каханнем памножана.
Радасць жыцця ад яе прамяніць.
Нельга нам Веру сваю
Не любіць.

*18.01.2014 г.*

## КАСЯ КАМОЦКАЯ

Як рака, як ручай
Льецца голас яе.
Страпянецца душа –
Гэта Кася пяе.
Нізкай нотай ракоча
За пушчаю гром,
Разліваецца, цешыць
Цябе салаўём.
Ветрам ў коміне
Страчанай хаты гудзіць.
Чаратамі ля сініх
Вазёр шапаціць.
Боль і крыўда люцкая
У ім мне чуваць.
Замірае душа –
Будзе Кася спяваць.

*20.07.2014 г.*

## АЛЕСЬ ПУШКІН

Ў магутным целе – дух мяцежны,
Заўсёды сам сабой няўсцешны.
Сатыр і Марс, і Апалон –
Ў адной пэрсоне разам ён.

Ён – легэндарная асоба.
Найноўшых мітаў ён гэрой,
Тых узнімае за сабой,
Каму змаганне да спадобы.

Ў жыцці – руплівы дзецям бацька.
Раз'юшаны, сярдзіты дзядзька
Для тых, хто ганіць Беларусь.

Мастак з умелаю рукою
І разуменнем пра такое,
Чаго не можам уявіць.
Праз містыку ў яго карцінах
У яве бачыцца даўніна
І непарыўна ніць бяжыць
Праз час да нас ад нашых продкаў,
Як шнур бікфордавы смыліць,
Каб незаўбаве падпаліць
Той дынаміт у нас ў сяродку,
У нашых генах зпластаваны,
Каб выбухнуў і адрадзіў
У сэрцах –
Пакаленняў памяць.

*15.01.2015 г.*

## ЮРАСЬ ЖЫГАМОНТ

Жыгамонт – яго асоба
Беларусам да спадобы.
Хто, што бачыў,
Хто, што помніць
Лісты пішуць Юрасю.
Ўсе яму дапамагаюць,
Бо Юрась над нашым краем
Арлом пільным пралятае,
Шэрым воўкам прабягае,
Старажытны след шукае,
Што застаўся, не ўмірае
Ад мінуўшчыны сівой.
Ў сэрцы прагу абуджае
Вольным край убачыць свой.
Капялюш ад дылетанта
(Так сябе назваў ён жартам)
Ды праз мовы выкрутасы
Ў падарожнага нататках
Розум свеціцца жывы.
Паўз лясы, азёр люстранкі,
Гарады, мястэчкі , замкі
Правядзе Юрась цікаўных
Праз змрок часу за сабой.
Выглядае быццам волат,
Мае гучны ўладны голас,
І ад пят па светлу голаў
Сапраўды, ён – наш гэрой.

*21.06.2015 г.*

*БЕЛАРУСКІМ ХЛОПЦАМ*
*АЛЕСЮ І ЮРАСЮ з любоўю*

## ЖАРТ

Свае семкі Высоцкі сеяў
На палёх чужых Елісейскіх.
Вы ж, хлапцы, успрыняўшы ідэю,
На абшарах радзімы сейце.
Вы – два волаты моцныя, брацці,
(Я свайго не таю захаплення!)
Павялічвайце наша багацце,
Нашым бабам аддайце насенне.
Бо рассыпаны нашыя гены
Сярод іншых культур і народаў.
Сейце, моцныя сейбіты, сейце,
Паляпшайце нашу пароду.
Хай магутная раса ўзрастае
На святое зямлі Беларусі.
Гэй, наперад! Я вас заклікаю
Гэты подзвіг здзейсняць без прымусу.

*06.2015 г.*

## ВАЛЕР САНЬКО

Пра кнігу "Звіняць жаўрукі ў Чарнобыльскім небе"

Звіняць у небе жаўрукі
І над Чарнобылем таксама.
Гудуць і бомкаюць званы
Трывогай ад цямна да рана.
І з рана да цямна гудуць,
Збалелую варушаць душу,
Каб тым, што на Зямлі жывуць
Завалы памяці узрушыць.
На сэрца лёг чырвоны шнар,
Не зарубцуецца ніколі.
Адзін змагаецца ваяр
Супраць бяспамятных у полі.
Адныя спалены агнём…
Другія чорнаю атрутай…
Б'е ў звон Чарнобыльскі Санько
І кліча дзейнічаць і думаць.

*10.02.2015 г.*

***

**ЛЮДМІЛА ДЗЯЦЭВІЧ.** Прывабная Люся.
Знаёмствам із ёю амаль ганаруся.
Чысцюткая мова. Манэраў шляхотнасць.
Адразу прыпомніш і гонар, і годнасць.
Пытаннем дасціпным цябе падтрымае,
Злагодзіць душу і ты сам вырашаеш,
Як жыць, што рабіць, куды рухацца далей.
Гаворку вядзе, быццам песню спявае.
Псыхолагам Люся недарма завецца.
Усім спагадае ад шчырага сэрца.

*10.2015 г.*

## МІХАСЬ СКОБЛА

З нагоды прэзэнтацыіі кнігі «Духу магутныя чары»,
прысвечанай Ларысе Геніюш

Ты ніколі Ларысе не здрадзіш,
Прыкаваны душой да душы.
Яе духу магутныя чары
Уладараць табой без мяжы.
Сніш Ларысу ў яе капялюшы,
Ў пражскім строі, з усмешкай на твары.
Маладую. што Музаў чаруе
І суворую, мудрую ў старасць.
Сваёй думкай шляхамі Ларысы
Ты прайшоў след у след без сумневу.
І ў натхняючы велічны прыклад
Закахаўся, як паж ў каралеву.
Ў сваё сэрца другіх не пускаеш.
Лорку Геніюш толькі кахаеш.
Сцеражы цябе божа ад бед,
НАЙВЫБІТНЕЙШЫ ЛА-РЫ-СА-ВЕД.

*7.10.2015 г.*

## ІВАН РАМАНЧУК

Вось музыка ад Бога – ІВАН РАМАНЧУК.
Слухаць песні яго я бясконца хачу.
У іх роднае, наша заўсёды гучыць.
Грай гармонік Іванаў, прашу, не маўчы.

## ГАЛЯ ПАРХІМЧЫК

Ў вокнах шыбы шкляныя трымцяць ва ўнісон.
Голас кліча ляцець за сабой наўздагон.
Песня птушкаю б'ецца ў празрыстае шкло.
Заіграла вясёлкай ў пакоі святло.
Слова роднае грэе і ласкай спаўе,
Да вышыняў узніме, апусціць ў траве.
Ў сэрцы радасць і слёзы ўсё разам кіпіць.
Калі слухаеш Галю, хочаш верыць і жыць!

*12.2015 г.*

## Юбілей беларускай паэткі **ВЕРЫ МІХНО**

(пасля урачыстай часткі)

Ціхусенька-ціха Вера спявае.
Кудзеляю смутак душу абвівае.
Сягоння адбыўся яе юбілей:
Гасцям – спавяданне – і крочыць далей.
Зрабіла ў жыцці, як здаецца, нямала:
Дзьве кніжачкі шчырыя вершаў удалых.
Як лекар працуе яна ў Бараўлянах,
Дзе шчыльна з тугою наш боль паяднаны.
Штодзённа цярэбіць душу грэбень скрухі:
Бо мова гібее і гінуць, як мухі,
Нявінныя людзі ад той завірухі,
Якою Чарнобыль нам землю атруціў.
Няма дзе падзецца ў сваім краі людзям.
Ды трэба ісці і да скону змагацца,
У вершах сваіх суцяшаць, пераймацца
Ўсім болем люцкім. Ён уласны заглушыць,
Падтрымку дае і трымацца прымусіць.

*20.12.2015 г.*

## ГРАМАДСКІ ДЗЕЯЧ

Жыве на свеце абяцала
І раздае, як раздавала,
Свае цацанкі-абяцанкі
Пустыя, звонкія, як шклянкі.
Гэта – таму, а тое – гэтай.
Хлусня заўжды яго прыкметай.
Гару наабяцае булак,
А атрымаеш кошык скулак.
У грудзі б'е сабе. клянецца.
І, як бы не мана, здаецца,
Лісліва ў вочы заглядае
І абяцае, абяцае…
Раззявіш рот, развесіш вушы,
Бо абяцалаў добра слухаць.
Але чакаць ад іх спаўнення
Маркота будзе і мучэнне.
Назад, як кажуць. не паўзе,
А ў бок імгненна саслізнецца,
Марочыць дурням галаву
І, як адвернецца, смяецца.

*15.02.2014 г.*

***

Алег, сын Анатоляў ТРУСАЎ –
Надзея шчырых беларусаў.
Ён ТБМ даўно кіруе,
Ні сіл, ні часу не шкадуе.
Дзяліцца ведамі гатовы.
Цячэ рака чысцюткай мовы –
Тут пра часы сівой даўніны,
Пра лёс народа і краіны,
Пра каралёў і людзей звыклых,
Таксама пра людзей выбітных.
Далёка думкаю сягае.
З вачэй іскрынка залатая
Злятае, ў сэрцах абуджае
Упэўненасць, што прычакаем,
Калі пачнем, як ён рабіць,
Паўсюльна мова загучыць..

*2014 г.*

## ЯЎГЕНІЯ ЯНІШЧЫЦ

Па-над рэчкай Ясельдай спрэс у зорах неба.
Геня, мая Генечка, ці было так трэба?

Кветкі сарамлівыя ў воду пазіралі,
І на шчасце Генечцы чары чаравалі.

Гаварылі Генечцы – Шчасце толькі з намі,
Па-над рэчкай Ясельдай з марамі і снамі.

Тут твае мы, Генечка, крэўныя, свае,
А Вялікі горад шчасця не дае.

Заблукае шчасцейка ў горадзе вялікім,
Там, дзе мала шчырасці, дзе адны разлікі.

Па-над рэчкай Ясельдай ветрык павявае.
Там душа збалелая хай адпачывае.

## ЗЯНОН ПАЗНЯК

*Спрэчкі наконт выказвання Зянона Пазняка пра «апазіцыйныя» марыянетачныя партыі ў Беларусі*

«Ён – небяспечны нам –
і з гэтага не можа
быць ён правым!» –
Вось вынік гвалту ўзнятага,
падставай
Яны ўзялі Зянона прапановы.
«Ён небяспечны нам» – у думках іх,
а словы
Гучаць – «Такі і растакі,
І гэткі і ня гэткі,
Сам на свабодзе,
Нам ня пырхнуць з клеткі...”
Стараюцца,
(Хоць нам з той працы – дулі),
Якраз, як лебедзь, рак, шчупак,
што разам воз цягнулі.
А воз і зараз там стаіць. Ніяк не каціць.
А Пазняка праз гэта вінавацяць.
І, што ні скажа, – ўсё яму у кпін,
Як быццам ён між іх ўбівае клін,
Між «партый» спульна робячых работу
Па закалыхванню спакою ідыётаў.
І тчэ, забыўшыся рука,
Партрэт Зянона Пазняка.
Якім яны яго хацелі б бачыць.
Здаецца гэдак мне.
Ну, а каму іначай?

*11.2012 г.*

## ГЛЕБУ І АЛЕСІ

УРАЖАННЕ ад заняткаў на «МОВА-НАНОВА»,
прысвечаных 500 годдзю БІТВЫ ПАД ВОРШАЙ

Глеб з Алесяю на пару
Задаюць на «Мове» жару,
Іскры словаў рассыпаюць,
Ў сэрцы нашыя сягаюць
Тыя словы векавыя.
Чуем, што яны жывыя.
Што з-пад попелу нанова
Смела мкнецца НАША МОВА.

*08.09.2016 г.*

## НІНА БАГІНСКАЯ

Сумненняў не маю – Багінская Ніна-
З усіх найвялікшая ў нас малайчына.
Сцяг наш узнімае – і з гонарам крочыць.
А як жа зламаць, растаптаць яго хочуць
Праціўнікі нашы. У міг налятаюць,
Як коршуны хцівыя, дрэўка ламаюць.
Бел-чырвона-белую рвуць палатніну.
Але не зламаць непахісную Ніну.
Зноў шые і ўпарта са сцягам выходзіць.
Сцяг кліча, заве: «Аб'яднайся, народзе!
Тут наша зямля! Тут былі мы заўсёды!»
Хай ведае кожны пра сцяга прыгоды:
І Сінюю воду! І Воршу! І Грунвальд!
Народ ВКЛам з'яднаны магутным!
Бялюткія, чыстыя помыслы ў сэрцы.
З чырвоным агнём у крыві нам не ўмерці.
З Пагоняю сцяг нам святы ад даўніны.
Шыхтуйце рады і рабіце, Ніна!

*06.2016 г.*

***

Кісліцына Ганна – кабета жывая,
Шмат ведае словаў, іх спрытна ўжывае.
Напрамак культуры заве градыентам,
Галовы марочыць нясчасным студэнтам,
Сваёй парадыгмаю бедных здзіўляе,
Яшчэ сымулякр зверху ўсё прыціскае.
Старалася вельмі і выдала кнігу,
Але бачу з кнігі вялікую хвігу:
Старанны яна драбязу апісала,
А вартых паэтаў з гразёю змяшала.
Няма ў градыенце Гілевіча Ніла,
Някляеву, можа, радкі тры ўдзяліла,
А варты паэт наш Андрэй Хадановіч
Пададзены ёю са знакам адмоўным.
Аднак, нацурболіла дзьвесці старонак.
І што з таго маем? Ўсё гэта пустое.
Пісьменнікі пішуць. Паэты складаюць.
Ды знаўцы вучоныя іх не чытаюць.
Сваю парадыгму вярхом асядлаюць
І між трох хваін градыента шукаюць.

*2016 г.*

З нагоды выхаду ў друк кнігі Ганны Кісліцынай "Градыент культуры" і яе прэзентацыіі. Але, шчыра кажучы, то увогуле можна падзякаваць за навуковую працу, за увагу да беларускай сучаснай літаратуры. Бо аб'ектыўнай аналітычнай крытыкі мы не маем. Як лектара Ганну Кісліцыну студэнты паважаюць, лічаць цікавай. І гэта цешыць. Хацелася б, каб сувязь творцаў і крытыкаў была інтэрактыўнай.

## БЕЛАРУСКАМУ ПАЭТУ Віктару Жыбулю

*Нясуць вампіры на талерцы*
*Ізноў чыюсьці галаву.*
*А я стаю з нажом у сэрцы.*
*У сэрцы нож – а я жыву. (В. Жыбуль)*

Паслухай, калега, давай сустрэнемся.
Можа, і выйдзе трохі цікава…
У шыбы звонку калоціцца вецер.
І гэта знешняга свету праява.
Там, у знешнім, шпацыруюць самнамбулы,
Паціху, так сабе, без усялякай прэамбулы
Нешта трызняць, ці, папрасту, ходзячы спяць.
А як жа хочацца зь некім паразмаўляць.
Цябе абрала, бо з табою жывом у адзіны час,
Бо хто яшчэ узгадае пра нас,
Калі мы,нават, ва ўпор ня бачым адзін аднога?
Бо сказаў ты, што пішаш пра памерлых вельмі даўно,
А між жывых не цікавіць цябе ніхто і нікога.
Ды, можа, з сустрэчы і ня выйдзе нічога.
Кожны боўтаецца у сваім замутнёным акварыўме,
Калі ня горш яшчэ, зусім у тэрарыўме,
А то у сэрпэнтарыі, здрацянеўшы ад жуду, сядзіць
Паварушыцца баіцца і толькі у дзьве дзіркі сапіць.
А самнамбулы кружаць і , здаецца, глядзяць,
Але ніхто з іх ня хоча павекаў угору узняць.
Калі-небудзь, у далёкіх вяках
Сустрэнемся пад вокладкай адной анталёгіі.
Нейкі нашчадак настырны зробіць замах
На казанне нам адной апалёгіі.

*04.2013 г.*

## ПАРАДА ВОПЫТНАГА І ЗНАНАГА ПІСЬМЕННІКА

– Дзеля пацехі, можа, скажаш?
А то яшчэ дзеля чаго?
Ты пішаш вершы, мэтры пляжыш
Паперы. Смешна ад таго.
Няма карысці анікому,
Найболей дык самой табе.
З чаго смяешся невядома.
А то ківаешся ў журбе.
Пакінь. Жыві, як усе людзі,
Еш, пі, кахай, шукай цяпло.
Ад вершаў грошай не прыбудзе.
Паслухай голасу майго.
Пісанне – марнасць і загана.
І аніякае пашаны.
Бяры уладу услаўляй!!!
Тады ўжо шырай разяўляй
Свой рот. Пасыплюцца даброты.
Багатай станеш і з ахвотай
Цябе паўсюльна прывітаюць.
І дзеці ў школах прачытаюць...

## АДНАМУ ЗНАЁМАМУ

Вы не перамяніліся нічуць:
Насмешка ў позірку. Разгорнутыя плечы.
Хаця прайшло амаль што дваццаць год
Ад моманту апошняе сустрэчы.
Цікава бачыць вас, але жыццё
Па розныя старонкі барыкадаў
Нас развяло. Між мітынгамі я,
А вы з парлямэнта прывыклі нам загадваць
Дурным "свядомым", мовячым між вас
На мове нейкіх бабак з агароду.
Ў сталіцы, можа, брыдка размаўляць
На мове невядомага народу?
Народу, невядомага для вас,
Вы ім заўсёды вельмі пагарджалі.
І бацька ваш, калісь, растрэльваў нас,
Як загадаў яму Іосіф Сталін.
Незразумела вам, што хочам МЫ,
"Свядомымі" нас клічуць іранічна.
А вы, як пацукі ў сваю нару
З гумна цягаеце нахабна і прывычна.
Хапаеце для ўласных вы патрэб
Усё, што можна і чаго не можна.
І душыце, і топчаце народ,
Ужо без хованак, зусім не асцярожна,
Як абяцалі дваццаць год назад,
Калі вужакамі да ўлады лезьлі.
Цяпер вальяжным панам акурат
Вы сядзіцё у парлямэнцкім крэсле.
І ўсё хапаеце, і усё мала вам.

Нахапаўшыся хочацца пашаны.
Але яе не будзе стаўбунам
І свіным рылам, гледзячым з экранаў.
Нахапанае, пэўна, адбяруць
Чужынцы, якім служыце старанна.
Магілу ж вашу людзі аплююць.
Няма ў людзей да здраднікаў пашаны.

*2014 г.*

## БУДАЎНІКІ

Будаўнікоў хачу я павітаць,
Бо будаўнічыя душой паэты.
І муляры… І грабары… Праз гэта
Нам першародства нейкае аддаць.

Муры старых часоў і гмахі ў часе новым
Складаюць муляры з цаглін
  Так, як паэт
            складае верш
                     са словаў.

Хаця паэтаў у нашай старане
Не хочуць шанаваць,
І багна забыцця
Імкнецца іх глытаць.
Але, як яскарка, свіціцца след
У душах тых, каму спяваў паэт.

Імёны дойлідаў губляліся здаўна.
Але ствараем мы. Ці ў гэтым ёсць віна?
Аб невядомых памяццю багаты,
Што узвялі хібары і палаты.

Бліскучы зодум сапсуе выпадак.
Але ня зломіць нас. Шукаем іншых згадак.
Альбо забыцця ў смеху і віне…
Наліце ўсім і паднясіце мне.

Мы разам з вамі вып’ем за паэтаў –
Будаўнікоў, адважных ў сваіх дзеях,
Якіх вядзе жывастваральны дух неўтаймаваны
Па шляху слаўнаму, што ім наканаваны.

*1988 г.*

**СЯСТРА ЗАКОННІЦА** ў чорных апранахах

Паспавядайся у цішы
На гэтых прыступках касцёльных,
Анёлам з неба раскажы
Пра горкі лёс сірочай долі.
Як пры жывых бацькох сваіх
Расла бядачкай сіратою.
Ў казённы дом цябе ад іх
Забралі шчэ' зусім малою.
Дзіцячы дом, казённы дом...
Няма пяшчоты рук ласкавых,
Каб на галовачцы тваёй
Любоўна банцікі вязалі.
Усмешак толькі для цябе...
Ні даравання, ні спагады...
Ніхто увечары ня йдзе
Туліць і казачку расказваць,
Не пацалуе, як баліць,
Не запытае, што ты хочаш,
Што табе заўтра прынясці,
Аб чым ты марыш ўдзень і ўночы.
Журба і крыўда у вачах...
Чаму, за што, навошта гэта?
А бацьку з маткай п'яны чад
Успомніць не дае пра дзетак.
Расла у смутку і журбе.
Сардэчка ціснула адчаем.
Жыццё не склалася ў цябе.

Каго вініць сама не знаеш.
Вучыцца не было за што,
Няма дзе жыць, няма адзёжы...
Навошта гэткае жыццё?
Хай лепш жывою ў дол палажаць.
Ў касцёле боль суцешыў ксёнз,
Параіў стаць сястрой закону,
Забыцца пра уласны боль
І іншым памагаць да скону,
Пазбыцца радасцей людскіх,
Ад тлуму свету адцурацца...
Чакае Езус. Пры жыцці
І з ім ты мусіла пабрацца.
Да хворых, бедных ты ідзеш,
Малітваю дапамагаеш.
Парвана сэрца на шматкі,
Але, даруючы, трываеш.

*2016 г.*

# ТРЫ СУСТРЭЧЫ З НІЛАМ ГІЛЕВІЧАМ

**СУСТРЭЧА ПЕРШАЯ.** Няўдалая. 1985 год. Я толькі прыехала на сталае жыхарства ў Мінск. Захацелася атрымаць прафесійны водгук на свае вершы і, можа, нават, калі пашчэнсціць, нешта і надрукаваць. Знаёмая аспірантка юрфака БДУ дала тэлефон Сяргея Грахоўскага. Грахоўскі прызначыў сустрэчу у Доме Літаратара. Пачытаўшы мае крэмзы, запытаў: "Адкуль вы ведаеце беларускую мову?" Пытанне здалося дзіўным, але я ветліва адказала:"Як адкуль? Гэта ж мая родная мова." Ні слова болей не кажучы, Грахоўскі павёў мяне ў залю на апошні рад, дзе сядзеў мажны прыгожы мужчына, як мне паказалася з адценнем нуды і пагарды на твары. (Я тады не ведала, што гэта Гілевіч Ніл – зорка нумар адзін нашай паэзіі і да таго ж старшыня Саюзу пісьменнікаў.) Грахоўскі падвёў мяне да яго і сціпла сказаў:"Вось паэтка..." Гілевіч абыякава запытаўся:"Як прозвішча?" А я ганарліва адказала:"А навошта вам маё прозвішча, калі вы яшчэ тавар не бачылі?" Пасля чаго Гілевіч рэзка падняўся і выйшаў з залі. А Грахоўскі развёў рукамі:"Ну, што ж вы так? Я, можна сказаць, толькі прыватная асоба." Я зразумела, што парушыла нейкі рытуал, сэнс прыватнай асобы стаў ясны многа пазней. Крыўды ў мяне не было, проста стала смешна і, пакуль ішла дадому узніклі радкі пра маё ўражанне ад гэтай сустрэчы:

Вы – прыгожы мужчына
І вочы у Вас блакітныя,
А рукі, мабыць, зусім аксамітныя.
Мне здаецца, што Вам на Вашым Парнасе сумна.
І не заўсёды паводзіце Вы разумна.
Чаму з шанавання Бялевіча Вы уцяклі,
А мяне за сабою запрасіць не змаглі?
А я сядзела і шкадавала,
Што гэткага цуда за спіною не стала.
Назірала за змучаным лёсам Грахоўскім,
Які сціснуўся ў жменю перад важнай асобай такоўскай.
На яго я глядзела са стоеным смуткам,

Бо пакрыўджаны быў Сяргей Вашай няўвагаю гэтай мінуткай.
З нейкай горычччу назваў сябе асобай прыватнай,

А мне сказаў:"Ты са сваёй пісанінай адпраўляйся дахаткі."
Яму б тазік пяшчоты з бульканнем раўчука,
А ў мяне цвёрдая, як у мужчыны рука,
Я маю на ўвазе у вершах толькі,
Вас гэта не датычыцца аніколькі.
Для Вас я была б цікавай жанчынай добрай пароды,
Якая вельмі любіць спорт і прыгоды.
Паімчаліся б з Вамі праз лета у восень,
Не зважаючы на драбязу, што навокал галосіць.
Парастаўлялі б, дзе трэба, коскі і кропкі.
О, якім бы цікавым між вершаў быў бы галоп наш!
Але, што тут зробіш, я крыўды не маю.
І, можа, усё да лепшага, так сябе суцяшаю.
Яшчэ не вечар, лета буяе, што маю даспее
І іншага час наварожыць,
Але сустрэчу нашую здзейснім мы ці адложым?

*1985 г.*

**СУСТРЭЧА ДРУГАЯ.** Праз трыццаць гадоў. Упершыню прачытала "Родныя дзеці" Гілевіча. У захапленні пазваніла яму, растлумачыўшы, як, чаму і за што спадабалася. Запытаўся: "Хто Вы?" – Проста чытачка. Запрасіў у госці. Сабралася ісці з ружай. Але акурат у той дзень яго забралі ў шпіталь.

ПЕРАД СУСТРЭЧАЙ.
Яшчэ жывы...
Яшчэ жывая...
Іду я з класікам сустрэцца.
Зіма сумёты намятае.
Ў грудзёх няроўна сэрца б'ецца.
Нясу чырвоную я ружу,
Каб сваю выказаць пашану.
(У будні дзень між зімняй сцюжы
Не на кладах яго застану,

Куды хадзіць без запрашэння
Ужо каму заўгодна можна.)
Самім запрошаная ў госці
 Ступаю з ружай асцярожна.

*20.12.2013 г.*

**СУСТРЭЧА ТРЭЦЯЯ.** Потым былі яшчэ пяць цікавых размоваў па тэлефоне. Ветліва і падрабязна тлумачыў мне пытанні аб ужыванні тых ці іншых беларускіх словаў, іх правапісу. Павінна была адбыцца трэцяя сустрэча, але, на вялікі жаль, гэта сталася на паніхідзе ў саборы і на Кальварыйскіх могілках. Узялася чытаць Ніла Сымонавіча Гілевіча, Бо як яшчэ лепей пазнаеш творцу?

Уражанне, пасля чытання чацвёртага тома з 23-х, выданых Нілам Сымонавічам за свой кошт:

Не магу перадаць асалоду
Пры чытанні ад Нілавай мовы:
То яна ручаінкай плюскоча
У бярозавым гаі вясновым,
То павее свяжуткім паветрам,
Шматкалёрнасцю і шматгалоссем,
Промні сонца праз лісцейкі свецяць,
Пракаветнае наша даносяць.
І на кожнае Нілава слова
Ва ўнісон струны сэрца трапечуць.
Дуб вялізны з карэннем глыбокім,
Мы пад кронай тваёй толькі дзеці.
Далікатнасць, дасціпнасць і гумар,
Дух адвечны, сапраўдны народны.
Сплаў пачуццяў із мудрасцю думак.
Ты – магутны, як з'явы прыроды.

*04.2016 г.*

## MEMENTO[1]

За дротам,
З калючкамі дротам,
Грудок парастае асотам…
А, можа, няма
Ніякога грудка,
А толькі калючая жухне трава.
А можа быць,
Нават травы там няма,
А дзікая тундра,
Вятры і зіма.
І месца не мае наймення.
І спрэс там імхі ды каменне.

Абое дзяды мае там паляглі.
Даведку – за што – атрымаць не змаглі
Ні мы,
ні тыя,
якіх пахапалі,
Як быццам
і не існавалі.
Ў Сібір і на Поўнач,
у ямы ,
у роў
Лілася ракою гарачая кроў.
Ліліся сірочыя слёзы,
Як сок веснавы у бярозы.
Там косці людзкія цягалі звяры.
Там скуру з'ядалі ушчэнт камары.
Там рэзалі шчокі ў палосы
Пурга, галаднеча, марозы.

---

1. Помні, памятай

За дротам,
За дротам,
За дротам
На Поўначы ўсё патанула.
А модлаў нат неба не чула.

І менела добрых, разумных людзей,
І цешыўся вельмі ў Крамлі ліхадзей,
Што новую вывеў пароду
З савецкага назвай народу –
Рахманых, зайздросных і хцівых,
Да працы заўсёды лянівых.

Знішчаўся у лепшых людзей радавод
Пад корань на нашых абшарах.
Драбнеў і рахманым рабіўся народ.
А хто не такі – той на нарах!

Ну што ж, не народзіць сава сакала,
А толькі такога, якая сама.
І маем мы тое, што маем.
Пад совамі ціха здыхаем.

Што гэта было? Не магу зразумець –
І здзекі. І кроў. І фанфарную медзь…
У імя чаго і навошта
Такія вялікія кошты?

*3.05.2012 г.*

***

Няма прарока ў сваёй Айчыне.
Няма прарока.
Узніме голас і ўраз загіне.
І ўжо далёка.
І толькі попел і дым атрутны,
Ды скача нечысць.
Канае продкаў у нас дух магутны.
Сагнулі плечы.
Зблукалі ў цемры сляпыя людзі
Ў напрамках розных.
Няма такога, які б паклікаў
І вёў праз роспач.
Апанавалі і Ўсход, і Захад,
І Поўнач з Поўднем.
Укралі гонар, і сцяг, і назву,
Сябе не ўспомнім,
Што мы таксама былі калісьці
Чагосці варты…
Адных забілі, другіх скруцілі…
Якія жарты…
Не чуе модлаў божа ўсявышні.
Такая кара.
Ды толькі ў сэрцах аб лепшай долі
Квітнее мара.
Квітнее мара аб аб'яднанні
Ў адзінай веры,
Каб сталі разам і адчынілі
У прышласць дзьверы.

*10.08.2012 г.*

## ІНФЕРНАЛЬНАЕ

Як думкі ў галаве, ляцяць па небу гусі.
Я сам з сабой даўно гуляю і смяюся.

Ну, вось і шах і мат. Кароль хадоў не мае.
Гараць і лес і дол. Ён рукі узнімае.

Я чую ветру спеў, што волю заклікае.
Але збыдлелы люд пад пугай жыць жадае.

Рука мые руку. Усход Захад цалуе,
Пакольki паміж іх прасторы не існуе.

Пакольki паміж іх, з чым можна не лічыцца,
Ляжыць ў паралюшы згвалчоная сястрыца.

Адзін ляціць у роў. Другі ўгару ўзлятае.
Аднолькава зямля абодвух іх прыймае.

Я чую недзе плач, а недзе і смяюцца –
Тлумачаць, што дарма вадою слёзы льюцца.

Губляю думак ніць. Губляю мэту, веру.
Хоць некалі не меў я гэткага намеру.

Кінь камень у ваду – разыйдзецца кругамі.
А потым гладка зноў і ціха, як між намі.

Між намі гэта кім? Жывымі? Мерцвякамі?
А на стале стаіць куфэрачак з касцямі.

Тые косці чыі? Каго не пахавалі.
Пад музыку свінцу у лесе закапалі.

Рабіна вось стаіць. Яе чырвоны гронкі.
Маглі б мяне забіць і не было б старонкі.

Маглі мяне забіць, застрэліць ці павесіць.
Ды літасціва даў мне нехта сем па дзесяць.

Пражыць аж семсят год, не разглядзеўшы сэнсу.
Кругамі па вадзе ідзе то боль, то нэндза.

Праехаць на свінні не кожны фэрт захоча,
Але пасадзіць Лёс, дык едзе і рагоча.

Вялікі жартаўнік той Лёс у нашым краі.
Дурны царом пастаў, разумнікаў ганяе.

Вар'ят баян купіў казе і ціха млее.
Нашто тое казе, яна не разумее.

Але ж і жартаўнік у царстве Лёс далёкім.
Там дурань у царох разумнікаў загнобіў.

Чырык птушка, чырык у садзе на галінцы,
А я сабе сяджу у хаце нібы ў скрынцы.

А я сяджу, гляджу у вугал з павуціннем.
Ці жыць, як набяжыць, ці выйсці і загінуць?

Кругамі па вадзе удалеч думкі мкнуцца,
Як з кімсьці супадуць, то бурай адзавуцца.

Але яны, калі па фазе не саўпалі,
То ціш ды гладзь ляжыць, як лёдам закавалі.

Ляцяць гусі , ляцяць ў блакітныя нябёсы.
А думкі прамільгнуць і лягуць пад калёсы.

Апроч мяне яны нікому не патрэбны,
Бо думкі, як і я, мае ў кашулі зрэбнай.

Як пудзіла стаю, варон, шпакоў пужаю,
Падыйдзеш да мяне – цябе перажагнаю.

*2013 г.*

# ЧЫТАЮЧЫ ЛЕГЕНДЫ І МІФЫ СТАРАЖЫТНАЙ ЭЛЛАДЫ…

Цывілізацыя Эўропы узрасла
На глебе грэчаскай навукі і культуры.
І зараз вабіць пільны зрок яна.
Адтуль і мудрасць, і архітэктуры
Гармонія. Складаных рэчаў і паняццяў назвы
Адтуль бярэм. І сорамна прызнацца,
Што разумней за іх так і не сталі
І прыгажэй не сталі мы таксама.
І гонару з пыхлівасцю праграмы
Нашы здаліся б смешнымі Платону і Сакрату.
Што мы прыдбалі і якія страты
Мы маем за мінулыя тысячагоддзі?
Ці чалавечней стаў агульны розум?
І зараз, як тады, змагаюцца Дабро са Злом,
А Глупства з Розумам паміж людзей блукаюць.
Дурныя ж найчасцей перамагаюць.

Рэлігіі праходзяць па калейцы.
Ніхто не можа ўзяць у рукі лейцы,
Каб пэўна сваім лёсам кіраваць,
Каб добрае жыццё усім ствараць.
Ні ў чым, нідзе не маем мы адказу.
Нас хрысціянства вучыць, што адразу,
Як цябе вытне хто, то ты скарайся,
З уладамі ніколі не змагайся,
Рахманым будзь, цярпі на гэтай глебе,
За гэта шчасце атрымаеш ў небе…

А старажытнай Грэцыі героі
Маглі заўжды змагацца між сабою,
Маглі з багамі уступаць у спрэчкі…
Здаецца гэта болей чалавечным…

Перамагаў дабрэйшы, разумнейшы,
Героям складваліся песні. вершы.
Старэйшых і мудрэйшых шанавалі
І Філязофіяй – любоў да мудрасці назвалі.

Там патаемна пралі Мойры лёсу ніць.
Які ніхто не мог перамяніць.
Праходзілі трагедыі і драмы,
Як і цяпер, як і у нас таксама.
І ў іх былі пытанні да багоў:
Чаму і як? Навошта і за што?
Ды яснасці, як мы, ня мелі грэкі.
Нічога не мяняецца пад небам –
Сваіх дзяцей бог Хронас[2] пажырае,
Народжаных той самы лёс чакае.
Рэлігіі і Мудрасць кругам ходзяць,
А Ісціну чамусьці не знаходзяць.

Так цар, досыць някемлівы, Мідас[3]
У Сілена мудрэйшага пытаўся,
Злавіўшы, калі той ў лясах бадзяўся:
«Што будзе пераважней і найлепей
Тут на Зямлі для проста чалавека?»
І Сілен адказаў, зарагатаўшы,
А перад гэтым, трохі памаўчаўшы,

---

2 Кронас, Хронас – тытан бацька галоўнага бессмяротнага бога грэчаскага пантэона Зеўса. Хронас пажраў усіх дзяцей ад Геі-Зямлі. Зеўса удалося схаваць. Мабыць, Хронас з»яўляецца алегорыяй Часу, у якім усё спараджаецца (ствараецца), і з цягам якога усё знікае (пажыраецца).

3 Мідас – цар, выказаў няслушнае пажаданне да бога Дыяніса, каб усё да чаго ён (Мідас) дакранецца пераўтваралася ў золата, у рэшце рэшт мог памерці ад голаду, бо нават ежа у Мідасавых руках рабілася залатою. Мусіў маліць Дыяніса зрабіць яго ізноў звыклым чалавекам. Пасля чаго хацеў даведацца у старога мудрага настаўніка Дыяніса – СІЛЕНА, што найлепшае чалавек можа сабе пажадаць. Адказ быў атрыманы.

Сказаў: «О, аднаднеўны род, дзіця выпадку
І нэндзы – спадчыны тваіх нашчадкаў,
Карысней для цябе было б ня чуць.
Але паслухай, што табе скажу:
Выгодней для цябе. але недасягальна,
Зусім не нараджацца. А спрыяльней,
Другім па важнасці было б – памерці лепш!..
Тут зноў зарагатаў і знік у лес…

# АД САКРАТА І ГАМЛЕТА ДА «HOMO» СУЧАСНАГА

«Быць» альбо «не»? –
Вось Гамлета пытанне –
Нашчадка даўніх дацкіх каралёў.
Бунтуе ў жылах маладая кроў
Ды й рух да дзеі звязвае спазнанне,
Пра марнасць спраў бягучых адчуванне
І разуменне вострае таго,
Што дзеяннем сваім
Ніколі і ніяк,
Нідзе,
Ні потым, ні адразу
Не зможа запаволіць поступ Часу.
І кожны далей сплянаваны Крок,
Што розум кволы ці магутны набліжае
Да самае Сусветнае Мяжы,
Сабой пакуты толькі ўзмацняе
І ў Логіку усаджвае нажы,
І робіць дзеянне абрыдлым і нямілым.
Ніхто перамяніць зусім не ў сілах
Ні сутнасці, ні існавання рэчаў.
– Спазнай сябе спачатку, чалавеча, –
Яшчэ дзьве з лішнім тысячы гадоў назад
Сакрат казаў.
Ды гэтае пытаннне час не зняў.
І «HOMO» , гледзячы цяпер назад,
Не прамаўляе «SAPIENTI SAT» (разумны зразумее)

Так «Быць» ці «Не»?  Афеліі вар»яцтва
Нагадвае варункі лепшых цацак:
Без разважанняў можна толькі «Быць»,

У стане гэткім можна ўсё любіць,
Сэнс не шукаючы, бяздумна весяліцца
І пад псыхічны ўласны рытм кружыцца,
З паветра ловячы няўцямны такт музычны.
Такі і ёсць варунак паэтычны
Ілюзіі, што дазваляе жыць
І папрасту філёзафам не быць.

*5.11.2012 г.*

# ПЕСНІ

*З Марыяй Трапашка мяне пазнаёміў мастак Алесь Пушкін у снежні 2016 г на вечарыне прысвечанай Нілу Гілевічу у мінскім музеі Максіма Багдановіча. Спадарыня Марыя прэзентавала сваю кнігу песень "Надзеі прамень". На музыку паложаны вершы Ніла Гілевіча і гэты зборнік сваіх песень Марыя прысвяціла менавіта яму. Патрэбна заўважыць, як уважліва і з якім густам і разуменнем глыбінь паэзіі Марыя выбірае тэксты і якую цудоўную музыку да іх стварае. Не стамляюся дзівіцца і захапляцца таленавітасцю нашага народа. І, заўважце, зараз спадарыня Марыя служыць Богу і людзям у Вішнеўскім касцёле – грае на аргане. Пакуль ёсць у нас такія людзі жыве і будзе жыць Беларусь. У гэтым раздзеле майго зборніка змяшчаю песні, напісаныя кампазітарам Марыяй Трапашка на мае тэксты.*

*Аляксандра*



Марыя Трапашка

Марыя Іосіфаўна Трапашка нарадзілася ў 1941 годзе ў вёсцы Навасёлкі Валожынскага ра-ёна, Мінскай вобласці.

Закончыла Навасёлкаўскую школу-сямігодку. У 1964 г. – Маладзечанскую завочную сярэд-нюю школу, 1969 г. – Маладзечанскае музычнае вучылішча па спецыяльнасці дырыжор-харавік, у 1976 г. – філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Працавала напачатку культработнікам, затым настаўніцай беларускай мовы, спеваў і музыкі ў школах Валожынскага раёна. З 1973 г. і да выхаду на пенсію – у сярэдняй школе №1 г. Валожына і школе-інтэрнаце для дзяцей-сірот. Зараз служыць (людзям і Богу) у Вішнеўскім касцёле ў якасці арганісткі.

# КАЛЫХАНКА

Словы. : Ал. Грыцкевіч
Музыка : М. Трапашка




1. Сярод цёмнай ночы
Маці маці маладая
Ціха немаўляці
Песеньку спявае:

Прыпеў:
Люлі, люлі, баю, бай,
Спі, маленькі, засынай.
Спі, засні, сыночак,
Мілы мой званочак.
2. У сваёй калысцы
Спі, засні, маленькі.
У ваконца свеціць
Месяц залаценькі.
Прыпеў.
3. Спяць у лесе дрэвы,
Спяць у вуллях пчолы.
Хай табе прысніцца
Добры сон, вясёлы.
Прыпеў.

*7.01.2017 г.*

# ПАКАХАЙ

Словы : Аляксандра Грыцкевіч

Музыка: Марыя Трапашка




1. Пакахай – і пабачыш: інакшым я стану,
З неба пацеркі зорак, павер мне, дастану.
Ад кахання твайго я магутным зраблюся,
Быццам казачны прынц табе раптам з'яўлюся.

2. Пакахай – і пабачыш: акрыленым буду,
Ў сабе сілы знайду і пабачыш ты цуда.
Буду чулым, прыгожым, амаль Апалонам,
Будуць словы твае непахісным законам.
3. Пакахай – і пабачыш: я добрым зраблюся.
Дагаджаць я ніколі табе не стамлюся.
Гаварыць буду самыя шчырыя словы.
Ведай, што для цябе на ўсё буду гатовы.

4. Пакахай – і пабачыш: зраблюся харошым.
Плён кахання з табою мы разам умножым.
Будзем жыць мы з табою каханнем сагрэты,
Як расліны зямлі, узбуяўшыя летам.

# А ТЫ ЎСЁ ДАЛЕЙ

Словы: Ал. Грыцкевіч
Музыка: М. Трапашка




1. А ты ўсё далей – да небакраю.
Хутка схавае цябе ён зусім.
О, не хвалюйся, не патрывожу,
Не патрывожу цябе я нічым.
Не патрывожу нічым.

2.Не патрывожу, не нагадаю
Ні аб сабе, ні аб лёсе маім.
Радуйся сонца цёпламу промню,
Дзень пачынай кожны ў радасці з ім.
Не патрывожу нічым.

3. Мукі мае цябе не кранаюць.
Птушка ты вольная ў лесе густым…

Не патрывожу, не нагадаю,
Не патрывожу цябе я нічым.
Не патрывожу нічым.

4. А ты ўсё далей – да небакраю.
Хутка схавае цябе ён зусім.
О, не хвалюйся, не патрывожу,
Не патрывожу цябе я нічым.
Не патрывожу нічым.

*10.10.2016 г.*

# ІДУ ДАДОМУ

Словы: Ал. Грыцкевіч
Музыка: М. Трапашка




* 2-гі голас – пры паўтарэнні фразы.

1. Хоць кужаль прасці, хоць слаць салому –
Ўсёроўна, маці, прыйду дадому.
Да весніц родных, да бульбы з салам,
Бо са сваімі мне больш прыстала.

2. Я доўга, маці, па свеце блукаў
То за жар-птушкай, то за навукай.
Няма жар-птушкі. Ёсць толькі казкі.
Навука ж вучыць: за ўсё адказвай.

3. Навукі поўны жыцця няпростай,
Аброс я ёю, як пень каростай.
Хачу спакою, ласкі дзіцячай.
Прабач мне, маці, не змог іначай.

4. Я гэты крок свой раблю свядома.
Сустрэнь жа, маці, іду дадому.
Свідруе думка, што гэтак лепей,
Чым на чужбіне пытаць аб хлебе.

5. Там, можа, булкі, ды мне вядома,
Што хлеб смачнейшы, спечаны дома.
Даволі блукаць, усім чужому…
Сустрэнь жа, маці, іду дадому!

*17.09.2016 г.*

# ВАСІЛЬКІ

Словы: Ал. Грыцкевіч
Музыка. : М. Трапашка




* 2-гі голас пры паўтарэнні фразы.

1. Сінім цветам у жыце цвітуць васількі.
У сінечу нябёсаў гляджу з-пад рукі.
То вачэй тваіх сінь, то адчаю пасаг –
Аб далёкіх і страчаных днях.

2. Калі шчырыя словы на вушка шаптаў,
Калі моцна за плечы рукой абдымаў,
Калі ветах свяціў на траву-мураву –
Пах чаромхі кружыў галаву.

3. Ветах поўню змяніў, а яго маладзік,
Час чароўны між намі так знік, як і ўзнік.
І чаромха за рэчкай даўно адцвіла,
І не кружыцца больш галава.

4. Зацвілі васількі, адцвілі васількі
Жыта зжалі, змалолі, ў засекі зняслі…
Толькі сэрца сумуе у светлай жальбе,
Калі ветах між хмараў плыве.

# ЯКІМ БЫ ТЫ НІ БЫЎ

Словы: Ал. Грыцкевіч
музыка. : М. Трапашка




Заўжды з табою успамін дзяцінства.
Ад крыўды і бяды, і ад няўдалых спраў
Крылом сваім атуліць мацярынскім.

2. О, як бы я хацеў крок павярнуць назад,
І матчынаю ласкай зноў сагрэцца,
І плакаць, як тады, і выйсці ў росны сад,
І слухаць, і любіць дзіцячым сэрцам.

3. Якім бы ты ні быў, якім бы ты ні стаў,
Усё ж аднойчы ноччу здрыганешся,
І зойдзешся слязьмі ад жалю, што губляў,
Губляў і не бярог крышталь маленства.

Якім бы ты ні быў, якім бы ты ні стаў…

*Далей тэксты песняў, якія мэлодыі яшчэ не маюць*

* * *

Кожны вечар сустракаю
Ў зале той, дзе люстраў бляск
Марна келіх асвятляе,
Каб развеяць смутку час.
Раптам музыка узнікла
І да сэрца паплыла,
Зчаравала песняй скрыпкі,
Над зямлёю панясла.

ПРЫПЕЎ: Мы танчым з табою.
Гукаў рытмы п'яней ад віна.
Смялей будзь, ня бойся,
Прыцiскай, бо я зараз твая.
Пра наша каханне
Гарачыя словы кажы
І, моцна абняўшы,
У рытмах пякучых кружы.

Спальвае, як пацалунак,
Пранікнёны позірк твой.
Кружыць танец і чаруе,
Узлятаю над зямлёй.
Закружыў мяне, загушкаў,
Патану ў вачах тваіх.
Быццам пара дзіўных птушак
У бязмежнасці ляцім.
ПРЫПЕЎ:

* * *

Трам-па-па, трам-па-па
Музыка гучна іграе.
Трам-па-па. Хлопец мяне
Танчыць у круг запрашае.
Трам-па-па. Сэрца маё
Як жаваронак трапеча.
Трам-па-па. Хай бы было,
Хай бы было гэта вечна.

Трам-па-па, трам-па-па...
Вірам жыццё закружыла.
І панясло трэскай малой.
Хвалямі гора накрыла.
Дзе той хлапец? Дзе вечар той?
Музыкі болей не чую.
Трам-па-па, трам-па-па...
З ранку да ночы працую.

Але парой, трам-па-па,
Між паху бэзу вясною
Думаю я, трам-па-па,
Гэта было не са мною.
Трам-па-па, трам-па-па
Слёзы з вачэй маіх льюцца.
Трам-па-па, хочацца мне
Зноў у былое вярнуцца.

**ПЕСНЯ** (*накшталт народнай жартоўнай*)

Выйдзеш ты на круты беражок,
Прынясу я табе піражок.
Будзем есці яго і глядзець,
Як вада па каменям цячэ (ць).

Разламлю піражок напалам
І табе палавіну аддам.
У вадзе адлюструецца сінь.
Не пакінь мяне ты, не пакінь!

Вось і з’елі увесь піражок.
След згубіўся. Зраўняўся пясок.
У сінечы аблокі плывуць.
Не забудзь ты мяне, не забудзь!

Смак у роце растаў піражка.
Абыякава плешча рака.
Сівы горыччу пахне палын.
Я – адна. І ты дзесьці адзін...

# ЧАПЁЛАЧКА

ЁН:
Адчапіся, чапяла,
Цябе не чапаю.
Прыйшоў, ціхенька сяджу,
Нешта ўспамінаю.
Ўспамінаю я сяброў,
Зь імі вудзіў пільна.
Мне папаўся дужы сом,
Паламаў вудзільна.

Хор муж. ПРЫПЕЎ :
Чапі-чапі-чапёлачка,
Не чапляйся.
Ў полі перапёлачка
Адгукайся.
Ты не будзь зласліўкаю,
Мая жонка.
Ў лесе птушка ціўкае
Жаваронкам.

ЯНА:
Ах, ты, чорт, таўкач стары!
Ведаю, што хлусіш.
Няма рыбы у вядры.
Быў ты у Марусі.
Працы ўдома аж пад дах.
Мне адной не здужаць.
Ты ж за вуду, з хаты шасьць.
Толькі вецер кружыць.

ЖАН. ПРЫПЕЎ:

Таўкуць, таўкуць таўкачыкі
У паветры.
Мне ад клопату, працы цяжкае
Куды збегчы?
Таўкуць, таўкуць таўкачыкі
Растаўкаюць.
Мужыкі нашы з хаты некуды
Уцякаюць.

ЁН
Ой, не злуйся, не бурчы
Мне ты усміхайся,
Ўсё зраблю, што скажаш ты.
Толькі спадзявайся.
Няхай згода паміж нас,
Любая пануе.
Наша шчасьцейка яна
Ад бяды ўратуе.

МУЖ. Прыпеў:
Чапі-чапі-чапёлачка,
Але жартам.
Часам лепей памаўчы,
Бо я дужа ўпарты.
Чакай, мілая мая,
Трохі супакойся.
Ў цэлым  свеце у мяне
Ты адна, не бойся.

ЯНА
Ой, як душаньку маю
Твае цешыць слова,

Для цябе ды на усё
Я заўжды гатова.
Павячэраць я табе
Смачна згатавала.
Пакуль прыйдзеш ты дамоў
Цэлы дзень чакала.

МУЖ. І ЖАН. Разам . ПРЫПЕЎ:
Чапі-чапі-чапёлачка,
Адчапіся.
Люба мая перапёлачка,
Не журыся.
Таўкуць. Таўкуць таўкачыкі
Усё лета.
На надвор'е добрае
То прыкмета.

## ПЕСНЯ ПРА КАХАННЕ

*(паводле песні з к-фільма "Дзень добры, я ваша цёця")*

У нерат моцны назаўжды
Каханню я папаўся.
І маніць той, хто кажа мне,
Што з ім не сустракаўся.
На гэтай гораснай зямлі
Яно, як сонца з'зяе.
І жыць мне далей без яго
Паветра не хапае.

ПРЫПЕЎ:
Але навошта жорсткі лёс
Кахання крышыць з'явы?
Й кахання кветка не цвіце
Без поспеху і славы?
ЛЯ-ЛЯЙ-ЛЯ-ЛЯ...
Багаты будзеш, ці бядняк
Ўсяроўна сэрца маеш.
І, не пытаючы ў цябе,
Каханне расцвітае.
Хто будзе кветку даглядаць,
А хто наўмысля зломіць...
Цвіце каханне між людзей
Й няверачых сароміць.

ПРЫПЕЎ:
Кахаю моцна і прашу
Спагады у каханай,
Бо толькі ласкаю сваёй
Мае загоіць раны.
На гэтай гораснай зямлі
Каханне зоркай з'зяе.
І жыць мне далей без яго
Паветра не хапае.
ПРЫПЕЎ.

# ВЕРШАВАНЫЯ АПАВЯДАННІ

*(з прымесам "фэнтэзі")*

## МАЧАНКА

Каляхуе у рондлі мачанка.
Сам варыць яе Косця узяўся
Адвячоркам дзьве жмені грыбоў
Замачыў. Зараз рондаль знайшоў,
На вагонь акуратна паставіў
I кавалкі там курыцы варыць.
Ноч грыбы размакалі. Дастаў.
Мыць старанна пад кранам іх стаў,
А ваду, у якой размакалі,
Працадзіў і у рондаль дабавіў.
Туды ж мытыя кінуў грыбы
I падумаў: «Што далей рабіць?»
Ўспомніў: «Мама мукой запраўляла.
Як жа робіцца гэтая справа?»
Вось мука. Возьме лепей грачанай,
У халоднай вадзе разбаўтае,
Плюхне ў рондаль, дзе ўсё каляхуе,
I з цікавасцю сочыць-цікуе.
Як у мамы ня выйшла мачанка.
Ды, з чаго ж гэта неспадзяванка?
Растлумачу памылкі я Косці.
Слухаць можаце й вы, ягамосці.

Для найлепшай мачанкі патрэбна
Нам пасекчы свінячыя рэбры,
Часначком трэба злёгку нацерці,
Зцярушыць чорным молатым перцам,
Пасаліць, зверху кмінам пасыпаць,
На патэльню гарачую кінуць,
Каб абсмажыць не моцна, а трохі.
Ў каляхуючу воду у рондлі

Перакласці і далей дадаць
Туды морквіну, пару цыбулін,
Хай і далей сабе каляхуе.
А сухія, як маем, грыбы
Перш памыць і на ноч замачыць,
Потым з рэбрамі разам варыць.
Бубкі перцу, лаўровы лісточак
Палажыць, маяран, калі хочуць.

З даўніны беларусы у стравы
Рознастайных давалі прыправаў.
Бо калісьці з паўднёвых краін
Яны выйшлі да нашых мясцін.
У арыйскіх іх генах і звычках
Не прайшла да прыправаў прывычка.
Ёсць магутная сіла ў прыправах.
Дух і цела яны людзям правяць.
Моца сонца у тых мікрадозах.
З даўніх вельмі часоў іх прывозяць.
Каб прыправаў ўласцівасці ведаць,
Трэба вам пачытаць «АЮРВЕДУ»
(Косця, пэўне, яе не чытаў
І з мачанкаю промаху даў.)
Старадаўні «З варагаў у грэкі…»
Шлях вялі беларускія рэкі:
Ад Балтыйскага мора ў Дзвіну,
Праз прытокі ў Дняпро. Далей мкнуў
Ў мора Чорнае, ў Грэцыю шлях.
Гандаль попрасту тут віраваў.
Як ад нас – збажыну, лес, дзічыну.
А прыправы адтуль і тканіны,
Дзіўных вырабаў бляск, пазументы,
Нават золата і дыяменты.

Звычка ў нас да прыправаў была
І мачанка без іх не пайшла.

Для запраўкі, Кастусь, мусіш браць
Не грачану муку, а пшанічну
У разліку на варыва літар
Паўтары лыжкі прыкладна толькі
І разводзіш вадою халоднай
Ў нейкім кубку, а потым бярэш
Ў каляхуючу воду ліеш,
Несупынна ўсё лыжкай мяшаеш
І мачанку тады атрымаеш.
Не забудзься ў канцы пасаліць
І бліноў да яе напячы.

*1.06.2014 г.*

## ПРА ЦМОКА

Атабарыўся ў нары
Пад гарою цмок стары.
Пацішэў ён, затаіўся
І чакае, як хто прыйдзе…

Быў калісьці ён зялёны
З залацістым грэбнем,
А стаў шэры і стамлёны,
Не ўзляціць да грэблі,
Дзе лавіў калісьці рыбу,
Потым еў са смакам…
Ой, стары, зусім нягеглы…
Пуста ў яго лапах.
Есці хоча, а не мае.
Крыллі не трапечуць.
Хоча жыць, а памірае,
Бо чакае вечнасць.
Ўспамінае пра часіны,
Як над долам лётаў
Бесклапотны і шчаслівы
І заўжды вясёлы.
Жартаваў пад час паўночы,
Пужаў дзевак, хлопцаў,
Пацяруху сыпаў ў вочы.
Рагатаў. Падскокваў.
Насіў золата збяднелым
На добрыя справы,
Спрыяў моцным і умелым,
А не злым – нахабным.

Ды на тое людзі – людзі
Ў будні і у святы.
Ўсё загнюсяць, напаскудзяць,
А цмок вінаваты.
Пачалі паміж сабою
Яны звады, сваркі.
І на золата зайздросцяць
Й на чужыя скваркі.
Сірацінаў не шкадуюць,
Не дапамагаюць.
Хціва, што ўпадзе у вока,
Задарма хапаюць.
Найслабейшых сталі крыўдзіць,
Цмока абылгалі,
Быццам толькі чорнакніжным
Ён дапамагае.

Угнявілі людзі бога.
Цмока узлавалі.
У нары залёг глыбока:
Хай ім беды валяць.

Наляцелі на краіну
Каршуны – чужынцы.
Хто быў лепшы,
Той загінуў
Ў полі пры гасьцінцы.
Засталіся баязліўцы,
Чужым дагаджаюць.
Веры, мовы адракліся.
Волі не жадаюць.
Абы ціха, абы толькі
Былі бульба з салам.

Нават цмоку брыдка ў сэрцы
Ад іх дзеяў стала.

Цмок чакае ды чакае,
Каб хто нарадзіўся
Чысты сэрцам, справядлівы
Да яго з'явіўся.
Ён тады б пра таямніцы
Таму чалавеку
Без баязні памыліцца
Усё распаведаў:
Дзе ляжаць мячы чароўны
Волю здабываці.
Край забраны
Ў праве роўным,
Як адбудаваці.
Як паклікаць духі продкаў
Ды на дапамогу.
Заклік продкі той пачуюць
Ў гуках роднай мовы.
Не загіне край забраны.
Цмок ляжыць, чакае…
Ды надзея разам з цмокам
Ціха памірае.

*05.2015 г.*

## СУПЕРПОЎНЯ

Дзевятае жніўня.
Ўзыйшла суперпоўня,
Каб бледным святлом
Нам прастору запоўніць.
Святло наваколле змяніла чароўна.
Хто спалі удзень, узняліся раптоўна
Істоты начныя яе прывітаць.
Патрэбна і нам, каб іх бачыць, ня спаць.
Павук-крыжавік першы выпаўз са схаваў,
Крутнуўся і крыж свой нацэліў на поўню.
Калматыя лапкі, сам, як галавешка.
У момант стае небяспечнаю сцежка.
Бязгучна за ім кажаны узняліся,
Спачатку, як ком, потым бачу у высі,
Як рэй павялі, карагод запялі
І кружаць ў паветры. А тут на зямлі
Вужакі спляліся і ціха сіпяць,
Як быццам бы поўню хацелі б дастаць.
Вось вожыкі кругам на ўзгорку сядзяць:
Ці дваццать, ці трыццаць мне не разабраць.
Вялікая ў цэнтры ляжыць вожычыха.
Ніводзін із іх не асмеліцца чмыхаць,
Тапыршчаць іголкі на цёплай зямлі,
А лычык і вочкі да поўні ўзнялі.
Глянь, жаба-рапуха сядзіць на згародзе,
Ад поўні пукатых вачэй не адводзіць.
Не ціўкаюць птушкі. Цвыркун не стракоча.
Душа замірае і вырвацца хоча
З палону у целе найдалей кудысь,
Найлепей было б, каб да поўні, у высь.
Пярловае, мройнае поўні святло

Блукаючых зданей сабой узняло:
Віюцца, трапечуць, між дрэў шамацяць
І здолеюць слабыя душы пазваць
Услед за сабой да ўладарыні-поўні.
І бачу: па даху, па краі няроўным
Ідзе чалавек, ну, зусім, непрытомны,
Хоць раніцай, потым пра гэта не помніць.
А поўня чаруе, а поўня ўладарыць…
І кожны пра нешта дзівоснае марыць.
Флюідаў таемных яе магнетычнасць
На стан уплывае фізічна-псыхічны.
Далёкага Месяца кожная фаза,
Як ўзмах дырыжора за пультам. Адразу
Аркестар істотаў жывых паслухмяны
То спіць, то расце, то загойвае раны.
Як выпала некаму ў поўню радзіцца,
Той будзе свой век сумаваць і нудзіцца.
Не будзе ён моцным, не будзе рашучым,
А будзе сябе недасяжнасцю мучыць.
На ветах таксама, калі разабрацца,
Не раіла б , людзі, я вам нараджацца.
Адзін маладзік толькі справам спрыяе
І моцу дае, і дабру прыспарае.
Як прыйдзеш на свет разам з маладзіком,
Здаволішся цэлым шчаслівым жыццём.
Калі у пачатку ты фазы радзіўся,
То шчасце пабудзе з табою ў дзяцінстве.
Калі ж у сярэдзіне здолеў з'явіцца,
То выпадзе шчасце пры росквіце жыцця.
Калі на канец прыпадуць нарадзіны,
Шчаслівымі старасці будуць гадзіны.

*9.08.2014 г.*

КАМЕНТАР. Уплыў Месяца на жывыя істоты прызнае і сучасная навука.

Суперпоўню назіраюць, калі адлегласць паміж Зямлёю і Месяцам робіцца мінімальнай. На 2014 год выпала ажно тры суперпоўні.

1 жніўня можна было назіраць і рабіць здымкі гэтай цудоўнай з'явы.

Усе прымхі пра Месяц і яго уздзеянне ідуць ад вельмі даўніх часоў. Гледзячы на Месяц знаўцы прадказвалі не толькі лёс, але і пагоду, і ўраджай і гэдак далей. Апісаныя праявы паводзін жывых істот давялося мне назіраць на лецішчы пад Ратамкай, а вожыкаў ля Мінскага мора на пагорку сярод лесу. Мусіць у іх там з даўніны нейкае сакральнае месца.

Пра уплыў Месяца на лёс расказала суседка па лецішчу Таня. Яе бабуля была знахаркай і заўсёды бабуліны прадказанні вызначаліся вялікай дакладнасцю. Так што я нічога не прыдумала. Застаецца толькі паўздыхаць аб тым, што ня толькі мову мы страцілі, але і шмат сакральных ведаў аб чалавеку і прыродзе.

## АПАВЯДАННЕ ПРА ВАНДРОЎКУ Ў ЗАСЛАЎЕ НА ДЗЯДЫ

Збяруся ўвечары, а зранку
Паеду я у вандраванку.
Бо будзе Дзмітрава субота
І едзем мы не так далёка
Ад Мінску. Толькі у Заслаўе,
Дзе на кургане старадаўнім
З этнографам зацятым – Тоняй,
(З мянушкай даўняй “вайдэлотка”)
Ўвесь беларускі род успомнім.

Па трасе едзем паўз чыгунку,
Крыжоўку, Ратамку мінаем,
Падлічваем свае рахункі,
Рабункі іншых ўспамінаем.
Зялёнае далёка збоку.
Бабулька клыпае па ўзгорку,
Вядзе пярэстую казу,
Што далей там не разбяру.

Мінулі Лысую гару,
Што ўслаўлена вядомым Нілам.
Пісьменнікі зламжылі крылы
Ў сваіх павецяў дальні кут.
Піцьменнікі больш не піюць,
Сваё здароўе берагуць,
Ці тое, што ў іх засталося.
Вятры упартыя галосяць
І змену новую завуць.
Але вакол маўчыць пустэча
І роднай мовы не пачуць.

Заціхнуў гул ад даўніх сечаў.
Блеянне чуецца авечак,
Якіх на бойню павядуць.
Хіжы маскаль зямлю руйнуе.
А голасу крыві не чуе
Амаль ніхто.

Так. Едзем. Думкі мітусяцца.
Ні з кім ня хочацца спрачацца.
Там, на гары паставім свечкі,
У круг пастаўшы, як авечкі.

Я думку спрэчную агучу.
Яна із тых, што мітусяцца.
Са мною можна не згаджацца,
Бо фантазіраваць без краю
Даўно паэтам дазваляюць.

Нямнога нас, асоб трынаццаць.
Лік атрымаўся ў нас цікавы,
А ў чым цікавасці праявы
Намёкам трохі патлумачу,
Пункцірам злёгку абазначу.

Далёка ў глыб, вякі вякоў назад
Нябесны шанаваны Задыяк
Сузор'яў меў ажно трынаццаць.**
Адно з іх з цягам часу страціў.
(Інвэрснасць полюсаў,
Прэцэсія васі Зямлі і гэдак далей.
Да Вікіпэдыіі цікаўных адсылаю.)
Той знак з другім сузор'ем паяднаўся.
І, акурат, падвойным знакам стаў.

Хаця яго мы і не назіраем,
Нябачны, ён на лёсы уплывае.
У Біблії мы адпаведна маем
Дванаццаці сузор'ям відавочным
Апосталаў набор усім вядомы.
Трынаццаты ад чорта, папы кажуць.
Дасведчаным жа вочы не замажуць.
(Бо Біблія напісана пазней.
У змроку часу праўда тых падзей.)

Ды вось ён, нечаканы паварот:
Трынаццаты нябачны – ВАЙДЭЛОТ.
Душа працівіцца, не хоча яму здраджваць.
Адтуль паганскія абрады нашы.
Як адгалоскі праарыйскіх дзён.
Хто хоча падрабязней гэта ведаць,
То мусіць пачытаць санскрыцкіх Ведаў…
І болей вас ня буду затлумляць.
Машыны едзе. Хвоі мільгацяць.

Ды вось ужо яно – Заслаўе.
Перш наперш ў хату Маркаўца,
Што недалёка ад чыгункі.
Пра лёс і творчасць мастака,
Складаныя жыцця варункі
Раскажа нам Таццяна, яго жонка.
Разгорнуцца цікавыя старонкі…

Напісаны майстэрскаю рукою,
Вісяць карціны ва усіх пакоях:
Заслаўя віды і яго ваколіц.
Гісторыя ў свае званы тут звоніць.
І энергетыка ад тых часоў плыве.

Вось Федзькаў крыж схаваўся у траве,
Курган высокі да сябе заве,
Княгінька рэчка і рака Чарніца…
Душы ў прасторы той не заблудзіцца,
Бадай, што толькі з тымі паяднацца,
Што за вякі вякоў да нас жылі ў Заслаўі…

Далей на замчышчэ наш шлях ляжыць.
Тацяна ж запрашае зноў прысці
У хату, за яе гасцінны стол,
Каб традыцыйна памянуць Дзядоў.

На Чорную гару ідзем паволі.
Сівец густы і маладыя хвоі
Накрылі склон. Як толькі падняліся,
Бы на далоні нам із тое высі
Раскінулася слыннае Заслаўе.
А аб мінулым зараз яго слаўным
Этнограф-краязнаўца нам раскажа,
Ў вузлы гісторый доўгіх ніці звяжа,
Натхненнем вочы засвіцяцца
І тады, нават, прыйдзецца схіляцца
Перад гарою цэлай фактаў даўніх
Жывых у краязнаўцы трактаваннях.

На самай-самае святой вяршыні
Бульбянішча завораны барозны.
Я кідаю на іх свой позірк грозны.
Ды колькі ні кідай яны пакінуць
Шукальнікам наступным
Свае адзнакі нашага жыцця –
Глыбокай паняверкі забыцця.

І з долу паднімаю я каменьчык,
Што за вякі вякоў абгладзіў глетчар.
Акруглы камень, голы ён , як чэрап.
Сінечай неба у ім кобальт свеціць,
А пыркскі крэмнію блішчаць,
Як вочы колішніх дзяўчат,
Што тут купалле святкавалі,
Ў Чарніцу рэй вянкоў пускалі,
А ў неба радасна шугалі
Агні вясёлыя кастроў.
Ды час усіх іх пабароў.
А зараз мы прыйшлі дзядоў
Сваіх усіх да нас паклікаць
І пацягнуць за тую ніць,
Што праз вякі да нас бяжыць.

Ідзем на замчышчэ Рагнеды.
У цэнтры крыж аблічам даўні.
З граніту. Ён шануе памяць,
Што праз вякоў імглу і замець
Высвечвае трагічны лёс
Княгіні слаўнай, яе сына
І, мабыць, з гэтае прычыны
Мы тут. Схіляюцца галовы.
Сціскае сэрца. Мы гатовы
На вернасць духу прысягаць
Нязломнаму, што нас прымусіў
Ў сабе заўважыць беларусаў
І абароны запытаць
У продкаў нашых на гары,
Што з даўняй сталася пары
Народу нашаму святою.
І голас паляціць ў сутоннях
Нябёс адвечных над зямлёю:

“Раскрыйце шчырыя далоні
І да зямлі іх павярніце,
Глыбока тройчы уздыхніце.
Павекі вочы засланіце,
Каб гэты свет не замінаў,
Каб вы адчулі, як працяў
Вас па хрыбту ад пят да цемя
Цяпла струмень, што выпраменьваць
Пачне да вас з зямлі улоння.
Вось ужо горача далоням
І праз заплюшчаныя вейкі
Убачыце,
          як карагод
                    жанчынаў нейкі
Ў бялюткай белі залунаў,
Вас акружыў святлом любові.
А далей кругам сталі воі
Чырвонай тарчаю ў прастору
      Да вас магутнаю спіною
            Непрабіваемай сцяною,
Каб бараніць сакральны хорам
І рэй, што продкі павялі.
Барджэй, хутчэй круціся кола.
Вось бачым строгіх і вясёлых
Дзядоў у строях старадаўніх.
Праз цемечка да самых пят
Йдзе па хрыбту цяпло да нас.
Нам стала горача і цесна.
Дзяды у коле. Уваскрэсне
Не згіне наш вялікі Род.
Мы разам з вамі. Мы – народ.”

Гарэлі ясна нашы свечкі.
З гары ідзем не як авечкі…

А аднадумцаў гуртам новым
У хату рушым Маркаўцову.
Тацяна шчыра сустракае.
Накрыты стол даўно чакае.
Паселі. Чаркі наліваюць.
Дзядоў паціхеньку гукаюць.
Вялікі стос бліноў нясуць,
Вакол стала перадаюць
Па сонцу іх адзін адному.
І жычаць добрага для дому.
Услед даецца за блінамі
У рондлі поліўка з грыбамі.
Прыйшлі нябачнымі садамі
Вось Маркавец і продкі з намі.
Багаты стол стаіць накрыты –
Чаго душа ні пажадае –
Ўсё за сталом за гэтым маем:
Каўбасы, салца і вяндлінка,
З імбірам печыва ў разынках.
Капуста з бочкі хрупасціць.
Цудоўна пахнуць агуркі.
Квас натуральнага браджэння.
А фарбы яблыкаў асенніх
Сталу прыгожасць надаюць.
Наліснікі на кожны густ –
З салодкім тваражком і рыбай.
Ні ў чым, нідзе не бачу хібаў.
Частуйцеся, дзяды, і з намі.
На добры час мы вас гукалі.

За ласку дзякуем Тацяне.
Няхай надалей захавае
Высокі творчы дух іх дому,
Каб беларусам ўсім вядомы
Ён стаў і гэткім заставаўся.
Як Віктар Маркавец стараўся
Рабіць, рабі і ты, Тацяна.
Хай прыспарае тваім плянам
Магутны Божа наш адвечны.
Няхай ў сузор'і чалавечым
Жыве й квітнее Беларусь
Свабодная. Аб гэтым марым.
Хай згінуць ўсіх нядобрых чары.

*8.11.2014 г.*

КАМЕНТАР:

**Трынаццаты знак Задыяка называўся –ЗМЕЯНОСЕЦ – паміж СКАРПІЁНАМ і БЫКОМ. У яго склад уваходзіць зорка БАРНАРДА.

Але ў 143 веку нашай эры Пталямэй, вядомы сваёй канцэпцыяй утрымання Зямлі ў Сусвеце на трох кітах, разам з тагачасным папам Рымскім вырашылі, што лічба 13 нядобрая, дванаццаць сузор'яў размеркавалі паміж апосталамі хрысціянскай царквы, а трынаццатага аддалі д'яблу, чорту. З таго часу лічба 13 лічыцца неспрыяльнай і нядобрай.

## РАЗМОВА

– Куды ты сабраўся пад вечар ісці?
Паснулі ўжо чаплі ў балотным трысці.
Птушынага спеву даўно не чутно.
Зачынены моцна і хлеў, і гумно.
І гусі, і куры пайшлі пад павець.
А ў лесе тупоча сярдзіты мядзьведзь.
Ён выспаўся ўзімку. А ў гэтакі час
Чакае такіх небаракаў якраз,
Што ў пору не хочуць пакласціся спаць,
А йдуць супраць ночы чагосьці шукаць.
– Спакойней, матуля. Я ў лес не пайду,
А толькі высока на гору ўзыйду.
Адтуль, на узвышшы, лацвей цікаваць
Як месяц выходзіць да зорак гуляць.
Дзе сонца хаваецца нанач ад нас,
Як промнік апошні на небе пагас.
Цікава, матуля. Я ведаць хачу.
А, можа, як птушка, калі палячу
Далёка-далёка, дзе ты не была
Ад нашае рэчкі, палёў і сяла.
– От, дзіўныя мары цябе аплялі,
Капаўся б, як бацька, свой век у раллі,
Вырошчваў бы бульбу, пшаніцу, авёс,
А восенню поўны засекі натрос,
Скацінцы паставіў бы сена стагі,
Не страшны зімою мароз і снягі.
Наквасім капусты, яшчэ агуркоў,
Да свята Калядаў заб’ем вяпрукоў.
А там незаўбаве і зноўку вясна,
Бо круціцца кола пор года без сна.
Мы вышнюю волю павінны прыняць

Рупліва на гэтай Зямлі працаваць.
– А я і не супраць. Дзянькі хай бягуць.
Спакою мне думкі мае не даюць:
Як свет збудаваны? А што там далей?
Чаму прылятае да нас салавей?
Дзе вырай ягоны? І толькі чаму
У выраі там не застацца яму?
Навошта заўсёды да нас ён ляціць?
Што гэтак яму на Радзіме карціць?
Так зладжана ў свеце да самых драбяз,
Але, як у багне, мой розум завяз.
Навошта увогуле розум людзям?
Жылі б, як жывёлы, як птушкі, там-сям.
Ды, не, вынаходзіць, ваюе свой век,
Не мае спакою адзін Чалавек.
Чаму неба ў зорах так вабіць яго?
Душа і сумленне зраблёны з чаго?
Чаму не аднолькавы розум ва ўсіх?
Чаму трэба бога аб ласцы прасіць?
Мо' трэба самім больш ласкавымі быць?
Дзівосы, пытанні канца ім няма.
Падумай, матуля, і ўбачыш сама.
– Ня вельмі я думаць, сыночак, хачу,
Свой век весь працую, цярплю і маўчу.
А думкі разбураць цярпенне маё
І стане нясцерпным такое жыццё.
Жаданні і мары вяжу на ланцуг,
Бо жыць перашкодзяць, як іх разбуджу.
Ды часам у песню яны прашмыгнуць,
Ў ручнік вышываны мой слёзы пральюць
Аб долі гаротнай без Волі, без сіл,
Адно толькі бога аб ласцы прасі.
А ласкі і шчасця на свеце няма.

І, можа, поп кажа ў царкве нездарма,
Што будзе па смерці для ўсіх добрых рай,
А тут на Зямлі не спрабуй, не шукай.
Што ёсць – то ад Бога – і пан, і бізун,
І ляснулы ў новую хату пярун,
Хваробы дарослым і дзеткам малым
Нявінным, харошым, бацькам дарагім.
Не, лепей не думаць, мне гэтак лацвей,
Бо думкі узрушаць спакой між людзей.
Бяз думак жыццё прамільгне, быццам сон.
І цяжка адрозніць, дзе ява, дзе ён.
Нядобрым сном цяжкія дні праплывуць,
А ў снах мары кветкай прыгожай цвітуць.
Чаму? Як? Адкуль? Ну, навошта табе?
Жыві, як жывецца і век праплыве.
Яшчэ малады ты, твой розум кіпіць,
Але пройдзе час, як усе будзеш жыць…
– Вой, матухна-маці, усёткі пайду,
У свеце шырокім адказы знайду.
Вярнуся – дык,  добра, а не – не гаруй,
Бясследна не згіну, мяне не вартуй.
На свет нарадзіўся яго спазнаваць,
Праўдзівыя досведы пільна шукаць.
Я скрыпку з сабою сваю забяру,
Зайграю – і голас пачуеш ў бару,
Пачуеш і ў полі, як ветрык дыхне,
Як кветкі буяюць паўсюль па вясне.
Пачуеш, як пчолкі улетку гудуць,
Камарыкі нешта звіняць і таўкуць,
Свіст буры і грому разгневаны рык –
То скрыпка іграе на струнах душы.
Душой беспрытульнай хачу вандраваць,
Імкнення майго табе ўжо не стрымаць.

– Ну, добра, як ведаеш, ты малады.
Мяне ж да зямлі прыціскаюць гады.
Паўсюль, дзе ні будзеш, ты ўсё ж памятай
І маці, і хату, і родны наш край.
І добраславенне з табою маё.
Ляці, птушка вольна, ды помні гняздо.
Хай матчына слова цябе сцеражэ,
У розных варунках жыцця зберажэ.
Бацькі застаюцца, а дзеці ляцяць
Бяскрайняга свету шляхі спазнаваць.

*07.2015 г.*

## СОН

На выспе між возера замак стаіць.
Цікаўнасць мяне падбівае. Карціць
Ўзяць човен, вясло і праз водную гладзь
Да выспы на золаку шлях скіраваць.
Наважыўся неяк і човен узяў,
Ды толькі ў туман непраглядны папаў.
Праз белую бель навакольнай сцяны
Ні бераг, ні выспа вачам не відны.
Жахнуўся, не ведаю, што мне рабіць,
Уперад ці ўзад патрабуе мне плыць?
Злавесныя крыкі уверсе чуваць.
Пад вёсламі гадзіны ўюцца-пішчаць.
Апуталі. Човен, як ўкопаны стаў.
Малюся, каб бог промнік сонца паслаў.
Ды раптам гарой узнялася вада.
Лячу, як у прорву, а там галава
Страшыдлы раззявіла пашчу сваю
Глыне – і ня ўспомняць, што быў я ў краю.
Праглыне страшыдла і час праміне,
Ніхто не прыпомніць, ці быў я, ці не.
Зрабілася страшна, бо жыць я хачу.
І вось ва ўвесь голас “Ратуйце” – крычу.
“Ратуйце, – прашуся– я ціхенька жыў,
Нікому благога ў жыцці не зрабіў,
Залішне цікавасці, можа, займеў,
А крыўды рабіць анігды не хацеў.”
Страшыдла завыла і булькат пайшоў.
Слізнуў міма пашчы маленькі мой чоўн.
Абтрэсліся гады і зніклі ў вадзе.
Густога туману няма анідзе.
Я ў ложку на лецішчы цёплым ляжу

І проста ва ўпор на карціну гляджу.
Там возера, выспа і замак на ёй,
Напісаны вельмі мастацкай рукой.
Чарот прыбярэжны, лаза, асака –
Ўсё пільны заўважыў пагляд мастака.
Люструе вадзіца аблокі і лес.
І замак прыцягвае мой інтарэс.
І, можа, калі мне яшчэ раз заснуць,
То здані да замка мяне правядуць

*07.2015 г.*

## ЛАСІНЫЯ ПРЫГОДЫ

У далёкім нейкім краі,
У якім, таго не знаем
Лось рагаты, нос гарбаты
Пазіраў на лесу шаты:
Вось дрыготкія асіны,
Хвояў шыхт зялёна-сіні,
Там бярозы, дуб адвечны,
Хмызнякі, ляшчынаў веццє.
На ускрайку ёсць рабіны
І чаромхі між крушыны.
Дзе ніжэй – лаза ля рэчкі,
Пападаюцца парэчкі.
Мох і сівы, і зялёны,
Зёлак проста міліёны
Дол сабою усцілаюць
І прылегчы зарашаюць.
Ўсё расце– цвіце ад веку
Добра й зверу, й чалавеку.
Ды адчуў лось небяспеку.

Носам лось гарбатым водзіць.
Чуе – нехта з стрэльбай ходзіць.
Не ўцячэш, хоць ламанешся.
Куля трапіць проста ў сэрца.
Нельга доўга разважаць,
Трэба дзетак ратаваць.
Бо за дрэвам, ля вадзіцы
Пасвяць ласянят ласіцы.
Чмыхнуў лось – так папярэдзіў –
І паджгаў наўпрост на стрэльбу.
Паляўнічага сабакі

На лася ляцяць ў атаку,
Гучна брэшуць і пужаюць.
Лось імчыцца– уцякае.
Ад ласіц далей адводзіць
Праз кустоўе на балоце.
А за ім сабача зграя
(Вой, парве-паразрывае).

Лось імчыць, ламае вецце.
Што рабіць і дзе падзецца?
Вецер свішча між рагоў.
Адчувае, што адвёў
Ад маленькіх небяспеку.
Пераплыў лясную рэку,
Абскакаў вакол балота –
Бачыць перад ім вароты
З вежамі старога замку.
Паляўнічы каля брамкі.
Змоўклі злосныя сабакі.
Нехта ў чорным робіць знакі.
Лось спыніўся, разумее
Будуць дзіўныя падзеі:
Узнімаюцца вароты.
Цмок з'явіўся. З яго рота,
А,дакладней, проста з пашчы
Язык полымя вылазіць.
Слупам з ноздраў дым шугае,
Страшыць, смерцю пагражае.
Паляўнічы пакланіўся:
"Гаспадар, я тут з'явіўся
Далажыць ў чарговы раз,
Што пакорны край. У нас
Сілы злоснае хапае

І табе не пагражае
Непакора. Вось высновы:
Мы пазбавілі іх мовы
Тых людзей, што тут жылі
Вольна цэлыя вякі.
Непакорных у крыві
Іх уласнай патапілі.
Памяць, думкі ачмурылі
Тым, хто засталіся жыць.
Будуць верна нам служыць.
Мы у велькай зараз сіле.
Хто супроць – той у магіле
Без размоваў апынецца.
Ўсё па плану. Так, здаецца.
Плачку іхнюю замкнулі.
Хай скуголіць. Не пачуюць.
Ды ужо не хочуць чуць.
Куды скажам – туды йдуць.
Ад калыскі да магілы
Крочаць з музыкай нам мілай.
Песні нашыя спяваюць,
Нашай мовай размаўляюць,
Ў школах нашых навучаюць
Зноў народжаных дзяцей.
Як патрэбна нам ідзе.
Мудра мы кіруем імі,
Лічаць нас даўно сваімі
Ўладарамі і братамі.
Што ні скажам – то за намі
Ў адзін голас паўтараюць,
Думак, нат, сваіх не маюць.
Цмок зароў і пыхнуў дымам:
"Добра служыш! Малайчына!

Атрымаеш ўзнагароду.
З гэтае табе нагоды
Плачку паглядзець дазволю.
Плача, стогне яна ўволю.
Льюцца рэкі слёз празрыстых,
Цэла возера ўжо маю.
Ў ім гатэль для марскіх гадаў,
Што здалёку прыязжаюць
Выказаць сваю пашану
І надзею, што на свеце
Панаваць адзін я стану.
У рацэ са слёзаў чыстых
Бруд з лускі сваёй змываю.
Луска свеціць, серабрыцца,
Мая сіла прыбывае.
Дай хартам тых слёз напіцца =
Злосць сабача разгарыцца,
Будуць бегаць і шукаць,
Як няўгодных нам парваць.
У такіх варунках доўга,
Вечна будем панаваць.

Плачку знішчыць – ёсьць прычына.
Толькі гэта немагчыма.
Неўміручая яна – душа гэтага народа.
Растаптаць яе не шкода.
Хоць і б'ецца у адчаі,
Маёй сілы не хапае.
Вось і схована ў глушы –
Разапнута на крыжы.
Плач і енк яе жалобны
Людзям гэтым чуць не можна.
Бо пачуюць – ў азін  голас

Разам з ёю загалосяць,
Узбунтуюцца, паўстануць...
І прымусу
майго ў міг адзін не стане.
Вежаў, сцен не застанецца...
Плачка раптам засмяецца
Паразвейваюцца чары –
Дымам я сплыву ў абшары.
Знікну, мушу растварыцца.
Толькі гэта – таямніца!
(Плачку моцна тут вартуюць.
Не убачаць, не пачуюць
Людзі, страцілыя памяць,
Яе гораснага плача
Аб часінах, што мінулі,
Калі лес і долы чулі
Пераможных песняў гукі,
Як мячы ўзнімалі рукі
Ворагаў пагнаць гэроі.
Запляла усё сувоем
Часу сівага нягода,
Лепшых знішчылі з народа.
Пазасталіся сугнеі,
Што пад позіркамі млеюць
Дзікіх прыхадняў здалёку
І надзейна служаць цмоку.
Зрэдку дзе-нідзе у краі
Родну песню заспяваюць,
На сваёй паразмаўляюць
Роднай мове, баючыся
Служак цмокавых увішных.)

Пашчу шчэрыць цмок. Вартуе.
Плачкі голас хто пачуе?
Паляўнічы з хартоў зграяй
Люта носіцца па краі.
Дзе галовы паўзнімаюць –
Папарвуць-паразрываюць.
Ды пайшлі ў народзе чуткі,
Што народжаны магутны
Духу моцнага хлапчына,
Падрасце і ўсіх уздыме.
Ў буры гневу цмок загіне.
Да народу хлопец мовіць
Запаведных продкаў словы,
Аб'яднае і адновіць
Дух у людзях раз'яднаных.
Ў шчыльны рад яны пастануць,
Край свой родны адбудуюць.
Чуткі йдуць. І людзі чуюць.

Лось рагаты, нос гарбаты
Зноў вяртаецца пад шаты
Лесу роднага хваін
Да ласіц і да малых
Яшчэ кволых ласянятак.
(Змог, аднак, уратаваць іх!
След свой блытаў, уцякаў,
Ды жыццём рызыкаваў!)
Разважаць ён доўга будзе,
Як давесці ў краі людзям
І пра цмока, і пра зграю,
І пра замак, дзе трымаюць
У цямніцы душу-плачку.
Як ім шлях той абазначыць?

Дзе шукаць таго хлапчыну,
Што павінны цмока зкінуць,
Плачку выпусціць на волю,
Каб не плакала і долю
Люд займеў і край тутэйшы?
Каб у гонары быў лепшы,
Гаспадарлівы, руплівы,
Каб ізноў быў край шчаслівы.
Доўга прыйдзецца чакаць.
Час ідзе. Ды як нам знаць?

Лось рагаты уздыхае,
Усім сэрцам спачувае
Ў адабраным краі людзям,
У якіх забралі душу,
Душу-плачку неўміручу.
Куды тым людзям падзецца?
Ні схавацца, ані збегчы,
Ні дзяцей ўратаваць.
Трэба шлях ім паказаць!!!
У гушчар, дзе цмок і зграя
У зняволеньні трымаюць
Плачку-душу патаемна.
Кожны ведаў каб напэўна!
Бо як вызваліцца плачка,
Зажывуць яны іначай.
Цмок загіне разам з зграяй
І вясёлка заіграе
Ў небе па-над вольным краем!

*06.2016 г.*

# ЖАРТОЎНЫЯ

*Казала некалі бабуля:*
*“Не жыць, калі не пажартуем.*
*Каб не пацешыўся, казала,*
*Дык бы павесіўся няўдалы”.*
*Ад даўніны, мы добра знаем!*
*Жыць цяжка людзям ў нашым краі:*
*То пан з падпанкамі на карку,*
*То камуністы з іхнім гартам,*
*То шыхт адборны чынавенства*
*Аж цэлай вэртыкаляй зверху.*
*Нам душу ціснуць– выціскаюць,*
*Ды нашы людзі не зважаюць.*
*Ў сваім жыцці плывуць віруюць*
*І ў жартах толькі рэлаксуюць.*
*Бо, як не стане кпінаў– жартаў,*
*Тады лічы пабіты карты.*
*Слязьмі зальемся і сканаем.*
*А так пацiху выжываем.*

## КОЖНЫ ПРА СВАЁ

*(размова дзядзькоў у аўтобусе)*

– Чаму глядзіш, як мент паганы?
За што табою я абраны?
Ці я бандыт? А мо' шпіён?
(Навошта вылупіўся ён?
Сам ведаю, што трохі п'яны.
Але сяджу зусім рахманы,
Не задзіраюся, ня б'юся...)
Чаго глядзіш, як хто прымусіў?
– Аціхні, дзядзька, адчапіся.
Свае сто думак завяліся.
Гляджу ў Сусвет і разважаю...
Пра ўсё сваё. Цябе не знаю.
І так сваё кручу і гэтак,
Як нешта выкруціць для дзетак...
А з кім параіцца не маю,
Бо з жонкаю не размаўляю.
А калі што не гэтак ляжа,
Дык хто табе ўсю праўду скажа?

# РАЗМОВА МУЖА З ЖОНКАЮ

– Што стракочаш, як тая сарока?
Памаўчы, бо абрыдла. І вока
Маё цэліць табе даць у храпу,
Каб ты больш не раззявіла ляпу!!!
– Ах, таўкач, ах, ты дурань заядлы,
Каб цябе чэрці з'елі, як падлу.
Ты жыццё мне скруціў маладое,
Ну, навошта я зараз з табою?
Кавалераў я мела культурных,
А пайшла за хамулу і дурня,
Ачмурыў, прытварыўся харошым.
Хлус, нягоднік, такіх я не зношу.
Ўвесь імпэт твой мужчынскі за чаркай,
Потым лезеш за смачнаю скваркай.
З сябрукамі гергечаш сваімі...
Каб скапыціўся ты разам з імі!
Ад цябе я не маю карысці.
Каб ты скіс, закаціўся пад лісце!
Пагляджу я на іншых. Пільнуюць
Гаспадарку і жонак шануюць,
Ім абновы да святаў купляюць,
Непрытворна заўжды паважаюць...
Памаўчы!!! Ты адно, а я дзесяць!!!
Мой кулак з цябе цеста замесіць.
А качалку вазьму, ды як пляснy,
Тое вока, што цэліць пагасне.
– Ну, прабач, дарагая Адэля,
Гаварыць можаш аж да нядзелі.
А ў нядзедю, як справы залатвім,
Табе добру абновачку справім.
– Ну, калі ты такі далікатны,
То хадзем, мой каханенькі ў хату.
Там абед нас цярпліва чакае -
Боршч з грыбамі ды клёцкі ў смятане.

## ВЯРТАННЕ З ЛЕСУ

*(тлумачэнне кабеты, чаму прыйшла з лесу*
*з пустым кошыкам)*

Пайсці ў лес захацела ў аўторак.
Ахапіў там мяне сіні морак.
Раптам белага свету не стала,
Штось зарохкала, заякатала,
Скрыгацець пачало, засіпела,
Загундосіла, засвірысцела,
Стукацела, раўло, грукатала,
Бразгацела, аж дух пераймала,
Замарочыла і закружыла,
Стаць прымусіла, шлях перакрыла.
Я – жагнацца, а рукі знямелі
І ня слухаюць, як ачмурэлі.
Спруцянеў язык жвавы у роце
І крычаць паратунку не хоча.
Вось і ўсё. Верце мне ці ня верце.
Можа звер гэта быў, а мо' чэрці.
Страх працяў да прытомнасці страты.
З пустым кошыкам бегла дахаты.

# СТАРЫ ДЗЕД НА КАМАРОЎЦЫ

– Чым гандлюеце, дзеткі, цікава?
Бачу моркву, капусту і страва,
Як дадаць яшчэ нечага выйдзе.
Як завецца, пра тое забыўся...
А вось яблыкі, слівы і вішні...
Каб вы ведалі толькі, увішны
Быў я хлопец, мужчына быў спраўны,
Меў я хату і сад і, напраўду,
Тут на гэтым во месцы стаяла
Мая Бэра. Антонаўка далей...
Камароўкай сады нашы звалі.
Ўсё звялі, пад асфальт закаталі...
А якія ж былі дулі – БЭРЫ...
Што твой мёд, ні за што не паверыш:
Сакавітыя, пахкія... Божа,
Растаюць, як у рот іх паложыш.
А гішпанскія гэтыя вашы,
Не угрызці, ня тое, што нашы.
Няма смаку, на выгляд ня тыя.
Эх, мінуліся дні залатыя...
Паспытаю я трохі чарэшні.
І куплю. Трэба грошай з кішэні натрэсьці.
Але хто мне, дзіцякі, напомніць,
Скуль, адкуль сюды зараз прыйшоў я?

## НА БАЗАРЫ Ў ПЯСТОВЕ ПАД ВАРШАВАЙ

*( 2000 год, праўдзіая гісторыя)*

– Чаго пан тут ходзіць і штось выглядае,
З гандляркамі мувіць і нешта пытае?
– Не нешта. Я добрую жонку шукаю.
Гароду гэктары са тры, мусіць, маю...
– Што полек у Польшчы для пана замала?
Пенькнюткія панны. Аж дух пазаймала.
– Ды не, проша пані, ест справа ня ў гэтым:
Прывучаны полькі паліць цыгарэты,
Ды каву на дзень разоў трыццаць папіць,
Ў гародзе зусім не жадаюць рабіць.
Як грошы ў кішэні маёй завядуцца,
ТО– ХОП – і ў Варшаву за момант збяруцца.
У жонкі сабе беларуску шукаю.
Жанчыны цяглівыя, вопыта маю.
Да працы заўсёды іх рукі гарац,
Ня ўмеў я такую адну шанаваць.
Шкадую, што зробіш. Ну, далей пайду.
Шукацьму старанна і, бог дасьць, знайду.

* * *

– Мы з мужам тры месяцы не размаўляем.
– Авой, божа мой, як ты гэта трываеш?
– На працы за дзень я так на-га-ва-руся,
Што ўдома маўчу без ніякіх прымусаў.

* * *

Настаўніца ласкава вучня пытае:
– Дзе сшытак твой, Пеця? Буквар, што чытыем?
– Буквар ён вось тут. Ну, а сшытак я ўзяў
І ўдома глыбока ў "пяшок жакапаў"

* * *

Далёка, дзесь за небакраем
Спявае птушка залатая.
Але пра што яна спявае
Ніхто не ведае, не знае.

* * *

Дзяўчына з глыбінкі залік рыхтавала.
Том тоўсты гартала, парой пазяхала.
А потым прамовіла, крывячы рот:
"Пакуль зад вучыла, забыла пярод."

* * *

Каб ведалі толькі, які ўнук разумны -
Сядзіць ў інтэрнэце і ў хаце не тупні.
Гарод мой зарос, плот зусім паваліўся.
Сын кажа: "Няма з тае працы карысці."
Ўвесь час у кампутары нешта ляскоча,
Піпікае, енчыць, а часам скрыгоча.
За імі сыночак падскоквае ў жары.
Прынесла заўчора яму акуляры.
Зусім, як прахфэсар зрабіўся вучоны.
Калі ж запытаю пра дзённік ягоны,
Нэрвуецца попрасту аж да гістэрык.
Зрабіўся чужы. Але ж хто мне паверыць?

## АНГАЖАВАНАМУ ЖУРНАЛІСТУ

Гэны гэнага лупіў.
Гэны паваліўся.
Будзе ведаць, як хлусіць,
Што за праўду біўся.
Хай уцяміць,што казаць,
Хлусу не дарую.
Майго гневу не суняць,
Калі што пачую.
Зноў адпяру, павучу
Гэнага хлуслiўца,
Натаўку яму ў каршэнь,
Аж зачне маліцца.
Памятае, помнць хай
Хлуслівы пісака
І прадажны свой язык
Хай засуне ў сраку!

*2014 г.*

# ІНТЭРЎЮ З САМАЗАДАВОЛЕНЫМ ПАЭТАМ

Кар. – Я вас вітаю...
Паэт: – А нягож!
Паэт даўно я прэсай знаны.
Я маю вершаў цэлы кош,
Паэмаў два мяхі напханы.
Эсэ няцяжка мне пісаць
Пра тое-сёе і пра нешта.
І сам галоўны Трындунец
Назваў мяне з усіх найлепшым.
Адкрыў зялёнае святло
Да друку у свае друкарні.
Я творы хуценька пяку,
Як кексы, у сваёй пякарні!
За гэта маю ганарар
І на кар'еру добры шанец.
Да носу з фігай не падлазь
Якійсьці самадрукаванец!

*(самадрукаванцамі я называю паэтаў і пісьменнікаў, якія друкуюцца за свой уласны кошт)*

*2016*

## ГЛІНЯНЫ ЗБАН

Пырхаў-мырхаў і зваліўся,
І пакуль што не пабіўся
Той гліняны збан, ў якім
Воду носяць да пары.
Воду носяць, есці просяць
У мяне старыя боты.
І ня здольны да работы
Я на лавачцы сяджу,
Ў неба сіняе гляджу.
Да мяне хто завітае,
Маіх яблык паспытае
І на лаўцы пасядзіць,
Каб са мной пагаманіць:
Ні аб чым. Пра тое-сёе.
Пра надвор'е не такое,
Пра цану на хлеб і мяса,
Пра заробкі час ад часу....
Што прайшло, а нешта будзе.
Як эаўсёды – хрэн на блюдзе...
Нехта брэша – вецер носіць.
Дзед сабакам сена косіць.
Не пабіўся збан – і добра.
Ля хлева цвіце аглобля.
Будзем жыць, як набяжыць.
З дай прычыны – не тужыць.

*03.2015 г.*

* * *

Птушкі прыляцелі – Ціў-ціў-ціў -
У маім вазоне васілёк расцвіў.
У маёй кватэры – цёпла і утульна.
Нехта на гародзе ужо садзіць бульбу.
Ўключу тэлевізар, пагляджу праграмы:
Ўсё у нас цудоўна, як у таты з мамай.
Там спяваюць-танчаць, там футбол з хакеем,
Прыбіраюць сьмецце, нешта ў полі сеюць.
Пэнсіі дабаўка – тры рублі на месяц.
Ну, а хлеб у краме даражэй на дзесяць.
Ды гэта ня страшна – трэба меней есці.
Голад і нястачы – то ў Афрыцы дзесьці.
Куфайку схаваю, выйду у кашулі.
Нам жывецца лепей, чым ў Эўропе. Чулі?
Беспрацоўных многа? Хай не лайдакуюць.
Ўсім заняцца можна падмятаннем вуліц.
Стогнуць ў захапленні браты-расіяне :
Як жа у вас добра, мы сябруем з вамі.
Толькі вы пазбаўце нас ад вашай мовы
Брыдкай сярмяжнай, як вашы каровы.
Малако давайце, мяса нам і сала -
Гэтага ў Расеі заўжды бракавала.
Хлеб нам ваш смакуе, вашае паветра,
Вашыя абшары, а таксама нетры.
Вы ж сядзіце ціха, слухайце старэйшых,
А ня то адправім вас Сібір засельваць.

*05.2015 г.*

**ПЕСНЯ БЕЛАРУСА** (пародыя – жарт)

Жытнёвыя нівы
Пад ветрам вясновым шумяць.
Іду я шчаслівы
І радасць маю не суняць.
Вось пожня, вось лес,
А вось чысты ручай булькаціць
Іду я здаровы,
Смяюся і хочацца жыць.
Шчабечуць мне птушкі
З галінаў на мноства ладоў.
І статак на лузе
Пасецца пярэстых кароў.
Выгульваюць хлопцы
За рэчкаю коней табун.
Павесіла баба
На плот сохнуць чысты стаўбун.
Усё ў свеце добра,
А лепей ў мяне на душы.
Тры бульбіны дружна
Качаюцца моўчкі ў кашы.
Няма ў мяне хлеба
І чаркі, і скваркі няма.
Я – голы і босы,
Ды лета ідзе, не зіма.
Іду я шчаслівы
І радасць маю не суняць.
Усё пазбаёдваў,
Няма у мяне аб чым дбаць.
Ні думка, ні клопат
Не тлумяць мне болей душу.
Іду я вясёлы

І з ветрам у тахт галашу.
І нівы, і коні, і статак –
Усё не маё.
І кажуць мне людзі:
Ніколі цябе не было.
Адкуль ты узяўся
Ня ведае зараз ніхто.
І дзе узьвей-вецер
Тваё шкмытае жытло.

*05.2015 г.*

* * *

Ў душы запалу поўна
І хочацца экстрыма.
Жыццё ж такая сука
Заўжды праходзіць міма.

Ляцець – не маю крылляў.
Адплыць – далёка мора.
Так і жыву бяссільна.
Ну, вось такое гора.

Хачу рызыкаваць я,
Ды толькі чым не маю.
Сяджу ля цёплай печы
Ды горасна ўздыхаю.

Хачу зрабіць я нешта,
Ды не дае лянота.
Так і памру між іншым
З цярпення ды нудоты.

*2016 г.*

* * *

На высокай гары
Каркнуў воран стары.
За ім граяць пайшлі маладыя.
Закружылі – авой -
Угары над гарой.
Усчарнелі нябёсы сівыя.

Агарнуў мяне смутак,
Што лета прайшло.
Што зіма свае коўдры пасцеле,
Што самотны, як пень,
Я і ўночы, і ўдзень
І што час на муку жыццё меле.

Пылам стану, гразёй...
Мяне сцісне зямлёй.
Паляціць душа з граем вароньнім.
І ці быў я, ці не,
Хто прыпомніць мяне?
Бо дабра не рабіў я нікому.
Хто паставіць мне крыж? Дамавіну саб’е?
Хто слязінку змахне над магілай?
Бо заўсёды ў жыцці шанаваў я сябе.
Адчуваю, што ўсім быў нямілы.

Каркнуў воран стары.
Маю прышласць прадрок -
Пра грудок і збуцвелае зелле.
Позна я зразумеў і раблю свой вырок.
Грайце, вораны, ў небе вяселле.

*10.2016 г.*

## ДРЭННАЕ СЛОВА

Я ужо вялікай стала і умею я ужо –
Скокнуць з ложка на падлогу
І садзіцца на гаршчок.
І зусім я не малеча,
Лялькам суп магу зварыць.
Толькі мне не дазваляюць
Слова "срака" гаварыць.
Маёй бабе стала дрэнна,
Як сказала я гучней.
На мяне крычыць "дурніца",
А сама не разумней.
Тата з мамаю казалі:
Пастарайся зразумець,
Слова гэткага не маем
І не будзем яго мець!
Перад люстрам я стаяла
Мо' гадзіну, а мо' дзьве.
Нават ногі задрыжэлі,
Загудзела ў галаве.
Бачу вельмі я выразна:
Вось, я мацаю сама.
Срака ёсьць і гэта ясна.
Слова ж гэткага няма.
Штосьці тут ня так . Напэўна,
Мяне хочуць надурыць.
Не паддамся, буду лепшай,
Паспрабую так зрабіць:
Крэйду белую у брата
Раніцою папрашу.
І на ўсіх платах заўзята
Слова "срака" напішу.

*09.2014 г.*

## ДЫЯЛОГ З СЫЛІКОНАВАЙ ПРЫГАЖУНЯЙ

Сылiконавыя пэрсi,
Сылiконавыя вусны...
Выступае супэрвумэн,
А насустрач мастак Юшкiн.
Захапленння перад вумэн
Мастак, нават, не хавае:
"Вельмi робiць той разумна,
Хто прыроду папраўляе.
Ды, прабачце, ў вас на срацы
Сылiкону не хапае."
Вумэн кажа: "Ноу проблем!
Як ты хочаш, заўтра зробiм!"
Мастак слушна заўважае:
– "Вось тады усе адчуюць,
Дасканаласцi хапае.
I цябе, як Галатэю,
Маё сэрца пакахае,
Ўвекавечыць на карцiнах...
Ну, а ўночы, о, мой бог..."
Вумэн сцiпленька смяецца:
" Будзе "трах i цiбiдох?!"
КАМЭНТАР: Сылiконавую сраку
Не уважаць i сабакi,
Iм мiлей жывая косць.
Ў тым, што вымыслiць прырода
Сэнс глыбокi, няма шкоды,
А свая ёсьць прыгажосць.

*10.2014 г.*

## ПРА МАЛУЮ АНЦЮ

Пайшлі дзеўкі летам,
Дзеўкі ў лес гуляці.
А за імі прэцца
І малая Анця.
Хлопцы з лесу выйшлі
Дзевак пераймалі.
На ускрайку самым,
Пад бярозай ветлай
Дзевак разабралі.
Хлопца не хапіла
Толькі малой Анці.
Сядзіць Анця,
Анця горка плача:
-І за што мне гэта,
Мне такая кара?
От, чаму ж мне, Анці,
Не хапіла пары?
Курачка ды з пеўнем,
З лебедзем лябёдка
Цешацца у шчасці,
Іх жыццё салодка.
А мне, Анці беднай,
Худой і маленькай
Хоць бы хто знайшоўся,
Хай сабе дурненькі.
Хай сабе дурненькі,
Хай і непрыгожы,
Ды душою добры,
Ды са мной харошы.
Я б яго вучыла
Песенькі спяваці.

І было б нам люба
Разам працаваці.
Плача мала Анця,
Слёзкі праліваe.
А яе хлапчына
Яшчэ падрастае.
Вырасце і моцна
Анцю пакахае,
Бо тады ўжо Анця будзе не малая.
Будзе каса віцца ў Анці ла паяса.
Сінь вачэй – нябёсам
Зайздрасць і прыкраса.
Ходзіць, як лябёдка, танчыць і спявае.
Кожны, як пабачыць, Анцю пакахае.

*02.2015 г.*

## ПРЫПЕЎКІ

Ў агародзе – агурочкі.
Яблынькі у садзе.
А на сэрцы май квітнее,
Як мілы паглядзіць

* * *

Ў палісадніку – вяргіні,
А ў садочку – вішні.
Не хадзі, Рыгор, за намі.
Ведай – трэці лішні.

* * *

Годзе піць сваю гарэлку,
Кіндзюкамі трэсці.
На хаўтурах нашай мовы
Вам нальюць па дзьвесці.

* * *

Трэба падаіць карову,
За гуркамі скочыць.
Не магу йсьці на спатканне –
Бацька пільна сочыць.

* * *

Каля кветак
Пчолкі ўюцца.
Дзеўкі хлопцам
Не даюцца.

* * *

Роем, роем
Ляцяць пчолы.
Быў пахмуры –
Стаў вясёлы.

* * *

Замятае, замятае,
Ды ніяк не замяце.
А у сэрцы, як у маі,
Бэз з чаромухай цвіце.

* * *

Бяжыць рэчка, уцякае,
Па камнёх плюскоча.
Казаў любы, што кахае,
Але толькі ўночы.

* * *

Стаіць пудзіла ў гародзе,
Рукавом варушыць.
Пазаве да шлюбу любы,
Як з'ем з вербы грушаў.

* * *

Бяжыць певень , даганяе
Курыцу ў гароху.
Не дагоніць, плюне, скажа:
"Хоць пагрэўся троху".

* * *

Бяжыць кура, уцякае
Прэч ад зуха пеўня.
Ды паціху разважае:
"Мо' павольней бегчы?"

* * *

*У куточку, на анучы*
*Я скуголю. Мне балюча.*

# ПЕРАКЛАДЫ

**ФРЫДРЫХ ГЕББЕЛЬ** (1813-1863 Германія)

Мне сэрца працінае не свядомасць,
Што тое ўсё, чым вабіла жыццё,
Калі глядзеў праз змрок і невядомасць,
Пустой маёю мараю было.
Калі б, магчыма, для усіх жаданняў
Заўсёды спадарожнік поспех быў,
Ён бы ня ўцехі з радасцю рабіў,
А быў бы на шляху выпрабаваннем.
Другая думка душу разрывае:
Нашто чакаў я шчасця і спакою,
Калі іх свет ў сапраўднасці не мае.
Бо ненажэрным полымем сваім
Дашчэнту палім сэрцу дарагое.
А захаваць яго і зліцца з ім
Не можам мы, адкінуўшы благое.

**РЭДЗЬЯРД КІПЛІНГ** (1865-1936 Вялікабрытанія)

О, калі ты ня ў роспачы, спакойны,
Як свет вар'яцкім робіцца вакол,
Калі адстойваць гонар будзеш здольны
Бясстрашна ты і без дарэмных слоў.
Як лепшыя сябры табе не вераць,
Ты застанешся верным праваце.
Мішэньню стаўшы, ты не згубіш меры,
Святым не называючы сябе.
Як валадарыш ты сваёю жарсцю,
А не табой валодае яна,
Як цвёрды ў поспеху і у няшчасці,
Якім па сутнасці цана адна.
Калі гатовы да таго, што словы
Твае у пастку трапяць махлярам,
Паразу атрымаеш, ды, нанова
Адпрэчыш ворагаў без сіл ранейшых сам.
І, калі здольны ўсё, што сёння маеш,
Без разважанняў вылажыць на стол,
Пачнеш спачатку, калі праіграеш,
Не пашкадуеш тое, што знайшоў.
І, калі зможаш сэрца, нэрвы , жылы
Напружыць так, каб рух наперад быў.
Калі з гадамі здрадзяць табе сілы,
Трымацьмеш воляю, што ты здабыў.
Калі ў натоўпе можаш быць сабою,
Пры каралях з народам сувязь мець,
Не схіліш галавы перад маною
І без пагарды будзеш ў свет глядзець.
Адолеўшы далёкую адлегласць,
Не спыніцца твой лёгкі крок і бег.
Скажу, Зямля табе належыць.
І, больш таго скажу:
ТЫ – Чалавек!

**ЎІЛЬЯМ ШЭКСПІР** (1564-1616 Вялікабрытанія)

## САНЭТ 66

Заву я смерць. Нясцерпна бачыць мне,
Як годнасць з торбай дранаю вандруе.
Распуста на цнатлівых бруд ліе.
Нікчэмнасць недарэчнасць ганаруе.
Ў палоне немачы бяззубай моц
І справядлівасць пад вайсковым ботам.
І кляп, засунуты натхненню ў рот,
І дасканаласць ў дзёгці і за дротам.
Пад маскай знаўцы, ўзяўся ніадкуль,
Далей не бачыць за свайго парога,
Картуе дурань лёс людзей пакуль,
Надзею мець магу толькі на бога.
Мярзотна ўсё, што бачу навакол.
Калі б ня ты, даўно б зышоў у дол.

## САНЭТ 121

Скажу па-праўдзе, грэшным лепей быць,
Чым пагалоскі навакол пачуць такія.
Загіне пачуццё, калі судзіць
Будзеш ня сам, а нейкія другія.
Ці ёсць магчымасць у чужых вачэй
Крыві гарачай бачыць віраванне?
Хай грэшны я. За вас я не грашней,
Майстры на плёткі, звады, шальмаванне.
Я – гэта я. А вы мае грахі
На свой капыл з сабою параўналі.
Калі я ўсёткі паміж вас прамы,
А вы крывую мерку прыкладалі.
Судзьдзя няправы бачыць плям мільён,
Бо думае, што я такі, як ён.

*М.Б.Б. ШАХ* (Велікабрытанія )

## ЖНІВО ВЕРШАЎ

### *ПРЫСВЯЧЭННЕ*

Жыццё кароткае, але тлумачэння ў яго няма.
У падарунак мы атрымалі жыццё і смерць – такая прырода.
Паэт стаіць на адлегласці ад сваіх вершаў.
Вершы – толькі трапяткі цень ад сэрца паэта.
Маё ЖНІВО ВЕРШАЎ прысвячаю мінуламу,
якое вечна са мною.

* * *

Я зорак не пералічу,
Што сеюць святло ўначы.
Сам– насам з самім сабой –
Сабе не дапамагчы.

Ніяк не забыцца дарог,
Маланак, віхур, што былі...
Ды, як пазбавіцца дзён,
Што ў вечнасць даўно сплылі?

Мне помніцца поўня ўзыйшла,
Святло адбіўшы ў вадзе.
Цябе ля крыніцы чакаў
І чуў – каханне ідзе.

Сустрэчы не помню той.
Кароткай яна была.
Але не забыцца мне,
Як руку рука ўзяла.

* * *

Без зорак я цёмная ноч.
Змярцвелі мае шляхі.
Я – дрэва між камянёў,
Чый ліст абляцеў сухі.

Засохлі галіны мае.
Ў карэння сілы няма.
Я – варты жалю расток,
Які накрыла зіма.

Стары, сляпы я жабрак,
Вакол якога імгла.
Я той разбураны дом,
Адкуль гаспадыня пайшла.

Жыццё валачэ мяне
У прорву, на самае дно.
Далёка бераг душы.
Мне з прорвы яго не відно.

* * *

Не думаць аб тым,
што ляжыць
На сэрцы
амаль немагчыма.
Ні лёгкасць усмешкі,
ні жарт
Не будуць
палёгкі прычынай.
Я б, можа, і словы знайшоў
Пра ўсё распавесці знаёмым.
Ды, дзе тую душу мне ўзяць,
Каб слухала сэрца аповед?

Як дзеля каханай на смерць,
На подзвіг заўжды быў гатовы...
Ды цяжка прымусіць людзей
Паверыць ў паэтавы словы.

Хто побач, дарэмна у тых,
Шукаць для сябе спачування.
Каб шчыры пра ўсё гаварыць,
Паклічу я вобраз кахання.

Дый думкі мае ў мітусні
Збіваюцца ў гурт і ўцякаюць.
Свет вонкавы – перад вачмі.
Схаванага ў сэрцы – не знаюць.

* * *

Навек знікае мой спакой
І бесклапотнасць уцякае,
Калі лятучы вобраз твой
Палонам сэрца забірае.

Напэўна ў вочы ты ўвайшла,
Як здолелі яны пасмець,
Блюзнерачы, у весялосці
Без страху ў неба паглядзець

Скажы, нашто перада мною
Анёльскі свет тады узнік?
Навошта сцежкай патайною
Ты падыйшла ўсяго на міг?

Маланка бліснула праз хмары.
Сусвет палае і трымціць.
Чаму між гэтага пажару
Ніяк надзея не гарыць?

* * *

Жыццё, як разважыць, само -
Мяшанка з усмешак і слёзаў.
Адважна грудзі дамо
Маланак кахання пагрозам.

А там, шамацяць няхай
Пяскі на ўзбочыне часу.
Ты мужнасць, глядзі, не губляй.
Надзея – у сэрцы адважным.

Пры страце усіх сяброў
Няспынна слёзы цякуць.
Пры просьбах кахання – кроў
Усю яму аддаюць

* * *

Ёсьць радасць і ў смутку.
Не так, каб да гора прывык.
Захоўвае памяць.
Не вымавіць скаргаў язык.

Ты марай прайшла.
І у марах навек ажыла.
Я ўдзячны за тое табе,
Што мне вечнае гора дала.

Няўтульна мне вельмі
 на гэтай зямлі.
Шукалі пачуцці спакою,
але не знайшлі.
Услед за табою
праз цемру брыду.
Шлях гэты бясконцы.
                Іду за табою. Іду.

## **Ф. І. ЦЮТЧЭЎ** (1803-1873 гг. Расія)

* * *

Што ў сэрцы маеш, можаш мець?
Як тое іншым зразумець?
Ўсё дарагое, чым жывеш –
Мана, як словам назавеш.

*1830 г.*

* * *

Развагу, клопаты пакінь.
Вар'ят шукае. Глупства судзіць.
Сном раны дзённыя лячы,
А заўтра будзе, хай, што будзе.

Ўсё навучыся перажыць -
Самоту, радасць і трывогу...
Нашто жадаць? Аб чым тужыць?
Дзень перажыў – і дзякуй богу.

*1850 г.*

* * *

Прырода – сфінкс.
І тым яна мацней
Сваёй спакусай цвеліць чалавека,
Што, можа быць, ніякае ад века
Няма таемнасці і не было ў яе.

*1869 г.*

* * *

Пашлі, бог, з літасцю спагаду
Таму, хто сцежкаю жыцця,
Няшчасным жабраком ля саду,
Брыдзе ў спякоту без піцця.

У садзе не яго гасцінна
Пад шаты кліча дрэваў цень.
Не для яго булькоча дзіўны
Ручай срабрысты цэлы дзень.
Не для яго квітнеюць ружы,
Не для яго і яблык сок.
Хай колькі хоча вочы мружыць,
Расплюшчыць – спёка і пясок.

Пашлі, бог, з літасцю спагаду
Таму, хто сцежкаю жыцця,
Няшчасным жабраком ля саду,
Брыдзе ў спякоту без піцця.

*1850 г.*

* * *

Маўчы, прашу, і не спрабуй будзіць
У гэты час злачынна-бессаромны,
Бо зараз лепш зрабіцца непрытомным
І лепей спаць ці проста камнем быць.

КАМЭНТАР: Гэтыя радкі напісаў Цютчэў ў 1855 г, памеціўшы (з Мікельанджэла (1475-1564г.г.)) На беларускай мове я агучыла ў 2016 годзе. І, як ні дзіўна, кожны раз гэта актуальна.

**МІКАЛАЙ ЗАБАЛОЦКІ** (1903-1958 г) Расія

## НЕ ДАЗВАЛЯЙ ДУШЫ...

Не дазваляй душы ляноту.
Ваду у ступе не таўчы.
Павінна мець душа работу
Твая ад ранку да начы.

Не патурай, калі бушуе,
Як яна галасна раве.
Астатнюю з цябе кашулю,
Распеpазаўшыся, сарве.

Гані яе, гультайку, з дому,
Цягні за шкірку, за каршэнь,
Праз бездарожжа, буpаломы.
І ў ноч, і ў дзень. І ўноч, і ў дзень.

Не дазваляй ёй спаць ў пасцелі
Пры свеце ранішняй зары.
Трымай гультайку ў чорным целе,
Усе прысмакі адбяры.

Хапай мацней яе за плечы,
Вучы і мучай да цямна,
Каб жыць з табой па чалавечы
Прызвычаілася яна.

Табе служанка й каралева,
Якую трэба берагчы.
Няхай працуе без сумневаў
З табой ад ранку да начы.

**МІХАІЛ ЛЕРМАНТАЎ**( 1814-1841 гг) Расія

Сам-адзін выходжу на дарогу.
Шлях крамністы уначы блішчыць.
Дасылае пусташ скаргі богу.
Зорка з зоркай можа гаварыць.

Урачыстасцю спавіта неба.
Сьпіць зямля, святло ад зор мігціць.
Што ж так цяжка? Можа гэтак трэба?
Што чакаю? Што ў душы баліць?

Не чакаю ад жыцця нічога,
Не хачу мінулае вярнуць.
Я б хацеў, скарыўшыся прад богам,
Мець спакой, забыцца і заснуць.

Ды ня тым халодным сном магілы
Адпачыць навек хацеў бы я,
Каб ў грудзёх жыцця кіпелі сілы
І цяжкою не была зямля.

Нада мной, каб вечна быў зялёны
Дуб магутны сярод іншых дрэў.
Каб гучаў мне голас улюблёны-
Мілы сэрцу ціхі родны спеў.

*1831 г.*

*2014 г. – 200 гадоў ад нараджэння М. Ю. Лермантава*

* * *

Жыцця  хачу! І прагну смутку
На ліха для шчаслівых мар.
Яны распесцілі мой розум,
Разгладзілі занадта твар.

Пара, пара люцкім насмешкам
Спакою разагнаць туман.
Што без пакут жыццё паэта?
І што без буры акіян?

Ён мусіць зведаць кошт пакутаў,
Знямогу, бы ў палёх  арэ.
Бо гукаў, ад нябёс пачутых,
Паэт задарма не бярэ.

*16.06.2016 г.*

## МАЛІТВА

Не вінаваць мяне, магутны,
І не карай мяне, малю,
Што голас  твой мне ледзьве чутны,
Што жарсьць і тлен зямлі люблю,
Што ў цемры розум мой блукае
Далёка вельмі ад цябе
І што натхненне апякае,
Кляхоча лавай, ў грудзі б’е.
Што дзікіх хваляванняў хмары
Туманяць позірк ў ясны дзень,
Што ў грэшных песнях, грэшных марах
Звяртаюся не да цябе.
Але, як полымя пагасне
Вагню, што спальвае ушчэнт,
Як стане замест сэрца камень,
Галодны зніке бляск вачэй,
Калі ад прагі пяяць песні
Адмовіцца душа мая,
Па цесным шляху ўратавання
Скіруюся к табе і я.

*06.2016 г.*

## 10 ЛІПЕНЯ 1830 года

Ізноў вы з гонарам паўсталі
За Волю льецца ваша кроў.
Пад вашай шабляю спадае
Шмат самаўланіцтва сыноў.
Сцяг ўецца вольнасці крывавы,
Да перамогі рвецца зноў.
Быў гэты сцяг любімы славай.
Суворан – яму вораг зноў.

*06.2016 г.*

## ЖАБРАК

Каля сцяны святой царквы
Жабрак прасіў ахвяравання.
Бядак худы і ледзь жывы,
Пакутай змучаны дазвання.
Кавалак хлеба ён прасіў
З пакораю, амаль без гуку.
Ды нехта камень палажыў
Яму ў працягнутую руку.
Твайго кахання я маліў
Са слёзьмі горкімі, з журбою.
Пачуццям лепшым так маім
Афяравала ты маною.

*06.2016 г.*

**МАРЫНА ЦВЯТАЕВА** (1862-1941 Расія)

Яшчэ учора мілаваў,
А сёння ў бок глядзіць без сораму.
Да птушак ранніх абдымаў,
Ды жаваронак стаўся воранам.

Дурніца – я, разумнік – ты.
Жывы, а я збуцвелай крыгаю.
О, плач жанок ва ўсе часы:
– Каханы, чым цябе пакрыўдзіла?

Учора у нагах ляжаў,
Раўняў з кітайскаю дзяржаваю.
Абедзьве ручанькі разняў –
Жыццё ляціць капейкай ржаваю.

Сплываюць мілых караблі,
Іх на зваротны шлях не выведзе.
І стогн стаіць па ўсёй зямлі:
– Каханы, чым цябе я скрыўдзіла?

І кроў, і слёзы ёй – вада.
Ў крыві. Ў слязах яна памылася.
Зляцела коршунам бяда –
Не прычакаць ніякай літасці.

Забойцай дзетак пад судом
Стаю, а ты – нявінным голубам.
І ў пекле я крычацьму зноў:
– Чым скрыўдзіла цябе, каханы мой?

Хачу я ложак запытаць:
– За што бяду цярплю нясцерпную?
Адцалаваў? Закатаваць!
– Не, лепей, хай з другімі цешыцца.

Жыць прывучуў мяне ў агні,
Ды сам у лес здзічэлы выкінуў.
Вось што ты, мілы, мне зрабіў.
– Чым я цябе, каханы скрыўдзіла?

Усё ведаю – не супярэч.
Са зрокам ясным – не любоўніца.
Каханню надыйшоў канец –
І падступае Смерць-садоўніца.

На дрэве яблык не вартуй.
Само спадзе, як яно выспее.
Прашу за ўсё ты мне даруй,
Каханы, чым цябе пакрыўдзіла.

## **ГАННА АХМАТАВА** (Расія)

## ШЭРАВОКІ КАРОЛЬ

Будзь пахвалёны, бязвыхадны боль.
Ўчора памёр шэравокі кароль.
Вечар асенні пунсовым заззяў.
Муж, як вярнуўся, спакойна сказаў:
"Там з палявання яго прыняслі.
Цела ля дуба старога знайшлі.
Шкода яго каралеву цяпер.
За адну ноч пасівела, павер."
Люльку сваю на каміне знайшоў,
Потым на працу начную пайшоў.
Сваю дачушку вазьму разбуджу.
Ў шэрыя вочкі яе пагляджу.
А за вакном уздыхае зямля:
Больш не пабачыш свайго караля.

***

Адны ў ласкавыя глядзяцца вочы.
Другія п'юць, гульня спатоляй ім.
Я ў перамовах паміж цёмнай ночы
З сумленнем неўтаймованым маім..

Кажу яму: "Твае я нараканні
Нясу шмат год і гнуся ад ярма."
Ды час ў яго не мае існавання,
Як і прасторы паміж зор няма.

Ізноў ахутаў чорны душны вечар
Злавесны парк, няспешны бег каней
І поўны шчасця з весялосцю вецер,
Што з неба круч павеяў на мяне.

А нада мной суворы і двухрогі
З'явіўся сведка. О, туды, туды…
Па старажытнай ледзяной дарозе,
Дзе лебедзі між мёртвае вады.

## МУЗА

Калі ўначы яе прыход чакаю,
Жыццё як-бы вісіць на валаску.
У забыцці я госцю сустракаю,
Што дудачку дае ў маю руку.
Вось увайшла. Заслоны паўзнімала.
Уважліва зірнула. Дае знак.
Пытаюся: "Ты Данту дыктавала
Старонкі пекла?" І адкажа: "Так."

***

Пачуццяў шчырасць, свежасць словаў нам
Губляць так, як акторам голас і дакладнасць,
Жанчынам – маладосць і іх прывабнасць,
Як пільнасць зроку страчваць мастакам.

Не спакушайся тодькі для сябе
Схаваць дарунак шчодры ад нябёсаў.
Ты падзяліцца мусіш, воляй лёсу,
Растраціць тое, што далі табе.

А ў намаганнях даць святло сляпым,
Спазнаеш у нялёгкі час сумненняў
Ад вучняў і зларадства, і глумленне,
І абыякавасць натоўпу разам з тым.

***

Гучала музыка здалёк
Для сэрца горам невыносным.
На блюдзе морам пахлі востра
Кружэлкі вустрыц і міног.

– Павер, я лепшы твой сябрук, –
Павольна скінуў парушынку.
Як не падобны да абдымкаў
Пяшчотны дотык гэтых рук.

**СЯРГЕЙ ЯСЕНІН** (Расія 1895-1925)

Хай жыццё адна мана з журбою,
Ды  чаруе нас  яно сабой,
Бо на ім прарочаю рукою
Тойма лёс выводзіць напіс свой.

Я заўжды, калі заплюшчу вочы,
То кажу, ледзь сэрца закрані:
– Ўсё – мана, але, калі захочаш,
То заз'зяе праўда у агні.

Добра мне ў чаромхавай завеі
Пра жыццё, як сцежку узгадаць.
Хай каханак лёгкіх вецер звее,
Хай сябры, што здрадзяць адляцяць.

Хай мяне пяшчоты цешаць словы.
Брытвай рэжа злосны хай язык.
Я жыву да усяго гатовы,
Да ўсяго бязлітасна прывык.

Глянь парою на сівое неба,
Глянь на ветах і скажы сабе:
– Спакайней, смяротны, мо' ня трэба
Праўды той, што спапяліць цябе.

Холадна душы у гэтай высі,
Толькі зоры ціха мільгацяць.
Тыя, што любіў, даўно зракліся.
Кім я жыў, мяне не хочуць знаць.

Але,  хай, прыгнечаны, ганімы
Святло сонца буду услаўляць.
На зямлі мне блізкай і любімай.
За жыццё каб "дзякую" казаць.

***

Не шкадую, не заву. Ня плачу.
Ўсё развеецца, як з белых яблынь дым.
Золата звядання я растрачу
І ня буду болей маладым.

Ты не будзеш болей гучна біцца
Сэрца, куды холад ўсунуў нож.
Гай бярозавы мне не прысніцца,
Не завабіць бегаць басанож.

Дух вандроўны, ты вайшоў у межы,
Не варушыш полымя ў грудзях.
Дзе ты, дзе, мая былая свежасць
І ў вачах паводка пачуцця?

Я скупы зрабіўся у жаданнях.
О, жыццё! Прывідам у агні
Ты прайшло, як быццам бы я раннем
На ружовым праскакаў кані.

Усе мы, усе калісь сатлеем.
Медзь між лісцяў клёнавых відаць.
І вітаю ў сонечным святле я,
Што прыйшло квітнець і паміраць

*24.10.2014 г.*

* * *

Адгаманіла восень залатая
Бярозавым вясёлым языком.
І журавы журботна пралятаюць,
На ростанях махаючы крылом.

Што сумаваць? З нас кожны падарожны:
Падыйдзе, зойдзе і пакіне дом.
Пра адыйшолых трызніцца трывожна
Каноплям разам з месяца ражком.

Стаю самотны на раўніне голай.
У далячынь адносіць журавоў.
Пра маладосць я поўны дум вясёлых,
Гадоў не шкода – шпаркіх мінакоў.

Я не шкадую страчаныя мары,
Ўсяго, што буйна здолела квітнець.
Гарыць вагонь рабінавы пажарам
Ды тым вагнём нікога не сагрэць.

Не абгарэць ў тым полымі рабіне.
І не прапасці зжоўклае траве.
Як ціха дрэва сваё лісце зкіне,
Так сумна словы ападуць мае.

І, калі час вятрамі пазмятае,
Зграбе ўсе іх у непатрэбны ком,
Скажы тады, што восень залатая
Адгаманіла мілым языком.

## **А. С. ПУШКІН** ( Расія 1799-1837)

* * *

– Руху няма, –
мудрэц
прамовіў барадаты.
Змаўчаў другі
і проста стаў хадзіць.
Пярэчання мацней не уявіць.
Адказ ухвалены, дасціпнасцю працяты.
Але выпадак той тым цікавей,
Што прыклад іншы нам да памяці прыводзіць:
З дня ў дзень па небе кругам сонца ходзіць,
Але ж правы упарты Галілей!

* * *

Як жыццё надзеям маніць,
Не гнявіся, не сумуй.
У няшчасці не бядуй.
Ведай, добры час настане.

Сэрца будучым жыве.
Хай сучаснае паныла.
Ўсё мінуе і сплыве.
Што мінуе – стане міла.

* * *

Пагроза гібелі заўжды
Ў смяротным сэрцы, на мяжы
Хавае, тоіць асалоды
Нетлумачальнае прыроды.
Мо' несмяротнасці залог?
Шчаслівы будзе, хто імгненняў
Тых пераважыць і зведаць змог.

* * *

Мне від мілей апошніх кветак
За пышных першынцаў палетак.
Яны паныласць, змарнаванне
Сабою ажыўляюць ў нас.
Бывае развітання час
Жывей салодкага спаткання.

* * *

Мой шлях паныла. Толькі працу з горам
Рыхтуюць хвалі будучыні мора.
Але, спадарства, не хачу ўміраць,
Хачу ў пакутах жыць і разважаць.
І ведаю сустрэну асалоды
Паміж нагодаў гора і турботы.
Надзеямі напоўніцу уп'юся,
Над вымыслам слязою абальюся.
І на заход, магчыма, мой самотны
Каханне усміхнецца мне журботна.

У воз адзін запрэгчы нельга
Каня і трапяткую лань.

## АБУ АЛІ ІБН СІНА (АВІЦЭННА)
(980 г. БУХАРА, дз. Саманідаў)

## РУБАІ

* * *

Дрэнна, калі ты пра справы свае пашкадуеш,
Раней, чым дні у самоце ад свету змарнуеш.
Сёння рабі тую справу і тое, на што сілу маеш.
Заўтра, магчыма, ты болей ужо і не ўстанеш.

* * *

Душа, ты звязана з жаданнем палкім,
Спяшайся, бо кароткі міг валодае ўсім цалкам.
Кахання не купляй, не патрабуй чыны з багаццем,
Шануй, што маеш, каб не зблізіцца з няшчасцем.

* * *

Вандроўнік, сонца, ты усім вядомы,
З вандровак вестку мне нясі дадому.
Каго ты бачыла ў садах кахання рана,
Чый твар засмучаны, а ў сэрцы боль схаваны?

* * *

Мы далучыліся да бога, калі пайшлі прамой дарогай.
А зараз добрага з благім ў сабе карэнне нішчым мы.

А калі бог праўдзіва будзе судзіць усіх нас прыканцы -
Благое параўнае з добрым, узважыць добрае з благім.

* * *

Па пустках  Сусвету прайсці
спяшалася, сэрца, ты смела.
Але не спазнала яго,
Хоць вельмі спазнаць ты хацела.
Дзе мне дасканаласць шукаць,
Дагэтуль дарогі не знаю.
Хаця быццам сонцаў мільён
Дапытлівасць шлях асвятляе.

* * *

Віно з прапойцамі бясспрэчна варагуе.
Няма сумненняў – з трэзвымі сяbруе.
Нямнога вып'еш – лек, а многа п'еш – атрута.
Пры памяркоўнасці – віно – з найлепшых цудаў.

* * *

Маім сябром быў вораг мой ушанаваны.
Не трэба цукар мне з атрутаю змяшаны.
Сяброўства больш не існуе між нас.
Ўцякай ад матылька, што з гадам бавіў час.

* * *

Валодаю ўсім я, што ў словах схавана.
Таемнасць Сусвету спасціг беззаганна.
Ды толькі, ці добра сябе самаго зразумеў?
Бо стала мне ясна, што поўная цемра ва мне.

* * *

Ад тлену чорнага і да нябесных з'яў
Я мудрасць разгадаў патайных слоў і спраў.
Пазбег я здрады, ўсё злічыў на свеце,
Ды толькі не разблытаў вузел смерці.

* * *

Ісці да невукаў пыхлівых не імкніся.
Аслом паміж ілжывых мудрацоў прыкінься.
Асліных рысаў так у іх багата,
Што той, хто не асёл не будзе там прыняты.

* * *

Маё нявер'е – не гульня,
Не слоў пустых убранне.
Я веру ісціне адной, аддany ёй дазвання.
Такіх, як я, зараз адзін, а з часам будзе многа.
Лічуся хай ерэтыкам, ды ў сэрцы маю бога.

## **ХАФІЗ ШЫРАЗІ** (1326, Іран)

### ГАЗЭЛІ

* * *

Ці ёй падзякаваць. а мо'
Яе за жорсткасць дакараць?
Хто праз каханне ўсё спазнаў,
Не ведае, як боль суняць.

Да скону рады быў служыць,
Узнагародаў не чакаў.
О, неба, як мне перажыць
Боль ад няўдзячнасці праяў?

Спяшайся міма, не злічыць
Усіх адсечаных галоў,
Якія трапілі ў палон
Яе мускусных валасоў.

Стаёна кінула пагляд,
Каб сэрца ў бездань завясці.
У крыважэрнай, о, душа,
Ці зможаш літасці знайсці?

Ў пустыні змрок мяне застаў,
Куды мне рухацца не знаў.
О, зорка, не згасай святі,
Каб далей зноў мяне вясці.

Ў бязлюдных стэпах я блукаў.
Імкнўся жах за мной ісці.
Пабойся пустак і дарог,
Дзе сэрцу шчасця не знайсці.

О, пашкадуй спалёны дух
Ў праменнях ад тваёй красы.
Ў цяні пяшчоты атулі.
Там – паратунак на зямлі.

Аднак, мне мэты не відно.
Бясконцы мой віецца шлях.
Прыпынкаў многа там было,
Але імпэт мой не зачах.

Як ні зневажаны табой,
Парог не буду пакідаць.
Мець лепей крыўду ад сяброў,
Чым ласкі ворага чакаць.

Паклічаш ты, як і Хафіз,
Ў бядзе кахання памагаць.
І на чатырнаццаць ладоў
Святы каран пачнеш чытаць.

* * *

Ў кахання канца шляху не відаць.
Згубіць усё там, душу змарнаваць.

Кахання зведаем пакуты з асалодай.
Дабра і шчасця сутнасць іх нагодаў.

Адкінем забароны! Нам віна нясіце.
Грахі замолім потым. Зараз піце!

* * *

Жывы, як мёртвы я. Твой погляд забівае.
Але не лёсу гнеў, не меч мяне карае.
Ты – серп маладзіка між зорак вечаровых.
Не кожны ведае твой морак адмысловы.
Па сцежцы рындаў ты да мілай падбірайся.
Заклятая яна, не забывайся.
Але Хафіз дарэмна слёзы лье.
Душа каменная, без водгуку ў яе.

## **ХАФІЗ.** З кнігі разважанняў ТЭРКІР-НАМЭ

Пяць якасцей важных у свеце існуюць
З другімі пяццю непазбежна яны варагуюць.
І зараз мяне ты уважліва выслухаць мусіш:
Ніколі Пыхлівасць з Сяброўствам не будуць ў хаўрусе.
Ад Грубасці з Хамствам ты Ветлівасць не прычакаеш.
А Велічнасць марна паміж Ліхадзейства шукаеш.
Скупы не падасць жабракам ці калекам –
Вялікая ў Скупасці да Дабрыні непрыхільнасць ад веку.
Праўдзівасць з Хлуснёю ніколі паладзіць не зможа.
І мой запавет у жыцці табе хай дапаможа.

З кнігі незадаволенасці **РЭНДШ-НАМЭ**

* * *

Дзе рыфмач, які не ўявіць,
Што няма яшчэ такога?
Дзе скрыпач, які пахваліць
Не сябе, кагось другога?

Рацыю абодва маюць:
Іншых хваліш – сябе бэсціш.
Дай другому жыць на свеце,
То сабе не знойдзеш месца.

І нямала сустракаў я
Між асоб высокіх чынам,
Што маглі папутаць часам
Кардамон з гаўном мышыным.

Дзеля гонару ратунку
Мятлу новую ўсе ганяць.
Новая мятла адпомсціць
І старой не паважацьме.

І народы злосць пасварыць,
Зайздрасць разам з непавагай.
Аднаго яны не бачаць -
Ў іх аднолькавая прага.

* * *

Калі сумленны быў – жыў-марнаваўся.
Чакаў удачы я. Не дачакаўся.
Павагі аніяк – хоць йсьці, хоць ўпасці.
І вырашаю я, што буду красці.

Нагараваўся я і так, і гэтак.
І стала сорамна глядзець на дзетак.
Сумленным лепей быць. Напэўна знаю.
Багацця з крадзяжу больш не шукаю.

Няхай і цяжка мне, але прывольна.
У вочы ўсім гляджу і сплю спакойна.

## З кнігі парса **ПАРСІ-НАМЭ**

* * *

Заўжды сонцу людзі рады –
Любяць і зямлю, і лозы,
Любяць гронкі вінаграду,
Што пад нож струменіць слёзы.
Але, як віно з іх зробяць,
З гронак, выспелых між спёкі,
То адно ў нас абудзіўшы,
Нішчаць іншага вытокі.
Ведаюць, што ў небе сонца
Сілай уладарыць рознай:
Салаўём адзін спявае,
Другі каркае пагрозна.

## **АМАР ХАЯМ** (Харэзм, 1048-1122)

Мы п’ем не ад таго, што хочацца віна,
Не ад таго, што прагнем весялосці.
Мы, часам кубак выпіўшы да дна,
На міг займець хацелі б прыгажосці.

***

Ані пекла няма, ані раю. О, сэрца маё!
Няма з цемры звароту. О, сэрца маё!
Спадзявацца ня трэба. О, сэрца маё!
І ня бойся нічога. О, сэрца маё!

***

Да таго, як заціхнеш на апошняй мяжы,
Ты падумаць паспей пры жыцці аб душы.
Бо, калі туды прыйдзеш з пустымі рукамі,
Што ты скажаш таму, хто чакае ў цішы?

***

Не раздзяляй з людзямі таямніц сваіх,
Бо ты ня ведаеш, хто найпадлейшы з іх.
Як абыходзіцца ты з іншымі сам будзеш,
Для самаго сябе таго чакай у людзях.

***

Уяві, што высока ў жыцці ты ўзляцеў.
Уяві, атрымаў усё ты, што хацеў.
Ты напоўніцу скарбы узяў пры жыцці.
Але мусіш пакінуць усё прыканцы.

***

Адкуль прышлі? Куды вядзе нас шлях?
Ці мае сэнс жыццё ў кароткіх нашых днях?
О, колькі душ пад сонцам залатым
Згарэла ўшчэнт, а дзе, скажыце, дым?

***

Да бунту з веры – лёгкае імгненне.
Да праўды ад ілжы – адно імгненне.
Нагбом сваю ні маладосць і радасць.
Жыццё, як подых – лёгкае імгненне.

***

У кельлях, і мячэцях, і царквах
Расце надзея ў рай ўвайсці і перад пеклам страх.
Для тых, хто зразумеў будову свету,
Сок пустазелля гэтага зачах.

***

Дарэмна думаць, што бог літасці не мае.
Хаця мы грэшныя, ён міласць адшукае.
Памры з гарэлкі ты сягоння ад гарачкі,
Даруе ён касцям тваім праз год іх спячкі.

***

Калі я трэзвы, белы свет ня мілы.
Калі п’яны – ў трызненьні розум хілы.
Ды толькі стан між трэзвасцю і хмелем
Найбольш цаню і чэрпаю ў ім сілы.

***

З той жменькай слепакоў, што ў свеце ўсім кіруе
І найвышэй за ўсё саміх сябе шануе,
Ты спрэчкі не вядзі. Таго, хто не асёл,
Адправяць у вагонь ерэтыком.

***

О, неба, да падлюг шчадрэй твая рука –
Ім лазьні і млыны, і воды арыка.
А чыстаму душой – адна скарынка хлеба.
Такое неба – плюнь – ня варта і пляўка!

***

О, сэрца, ты, не ведаючы сна,
З жалобнага келіха п'еш да дна.
Нашто было душы прыйсці да цела жыць,
Каб праз імгненне мусіць адыйсці?

***

Каханнем хто не цешыцца да мілай,
Без суцяшэння скончыць век панылы.
Дні, што пражыў без радасці кахання,
Лічу пустымі, марнымі дазвання.

***

Філозаф – мяне ворагі завуць.
Ды, бачыць бог, памылка іхні суд.
Наймізэрнейшаы я, нічога мне не ясна.
Ці, нават, хто я? І навошта тут?

***

Ці можам мы бязгрэшнага знайсці?
Ці можам мы бязгрэшны шлях прайсці?
Нядобра робім мы, а ты нас злом караеш.
Між намі і табой дзе розніца, скажы?

***

Сягоння – свята. З жонкаю маёй,
Дачкой бясплоднай Мудрасці пустой
Я разважуся!О, мае сябры,
Дачку бяру я простае лазы!

***

Што свету да цябе? Ты перад ім – нішто.
І існаванне толькі дым – нішто.
Дзьве бездані з тваіх бакоў абодвух.
І паміж імі ты, як і яны – нішто.

***

Я навучу цябе, як падабацца ўсім:
Габрэяў, мусульман і хрысьціян хвалі.
Усмешкі дасылай налева і направа.
І добрую тады сабе займееш славу.

## ЧЖАН ЧАО з кнігі "ЦЕНІ ГЛЫБОКАГА СНУ" З АНТАЛЁГІІ ДААСКАЙ ФІЛЯЗОФІІ

Ня добры і не злосны – такі мудрэц.
Многа добрага і мала благога – такі чалавек шаноўны.
Мала добрага і многа дрэннага – такі чалавек звыклы.
Нічога добрага і многа злосці – такі нізкі чалавек.
Адно дабро і зусім няма зла – такі святы.

* * *

Калі ты маеш хоць аднаго блізкага сябра, табе нельга наракаць на лёс.
Ты – не самотны, а, дзякуючы табе, на свеце на аднаго самотнага чалавека меней.

* * *

Лягчэй быць гэроем, чым мудрацом.
Пісьменнікі сустракаюцца часцей, чым сапраўдныя таленты.

* * *

Калі абставіны прымушаюць нас да ліслівасці, гэта лепей рабіць вусна, а не пісьмова.
Калі мы не можам стрымаць лаянку, то гэта таксама лепей зрабіць не пісьмова, а вусна.

* * *

Палкі чалавек абавязкова любіць жанчын, але той, хто любіць жанчын, не абавязкова мае палымяны характар. У прыгожай жанчыны абавязкова няшчасны лёс, але жанчына, якая мае ў жыцці многа няшчасцяў, не абавязкова

прыгожая. Таленавіты паэт абавязкова любіць віно, але ахвотнік выпіць не абавязкова таленавіты паэт.

* * *

Пі віно, ды не рабіся захмялелы буйным. Кахай жанчын, але не растрачвай сваю сілу. Працуй дзеля грошай, але не дазваляй ім авалодаць тваім сэрцам. Жыві палымяна, але не губляй галавы.

* * *

Начытанасць у кнігах хаця і не прыносіць выгады, але усё ж лепей невуцтва. Узнёсласцю духа можна захапляцца, але яна не мусіць быць адзнакаю няведання навакольнага жыцця.

* * *

Сакрэт майстэрства пісьменніка ў тым, каб як мага проста і ясна выказаць самыя складаныя думкі, а ісціны простыя і ясныя выкласці прыгожай мовай. Агульнавядомую тэму трэба падаць па-новаму, а ў ідэі, якая знаходзіцца на паверхні, павінна знайсці новую глыбіню. А што тычыцца акцэнтаў, скарачэнняў і выдалення замусоленых словаў і сказаў, каб зрабіць твор больш узвышаным, гэта ўжо справа пазнейшай праўкі.

* * *

Мне не пад сілу заараць цэлае поле, здаволюся тым, што буду даглядаць палісаднік. Мне не пад сілу пазбіраць усё сухое галлё у лесе; здаволюся тым, што выпалю траву каля ганку.

**КАТУЛ ГАЙ ВАЛЕРЫЙ** каля 87 г. да новай эры

## СЯБРОЎСТВА

Досыць ужо табе клопаты мець пра любога.
Марыць пакінь, што заплаціць нехта дабром за дабро.
Свет наш няўдзячны паўсюль.
Ласку з прыхільнасцю траціць
Увогуле сэнсу не мае,
Нават, калі-нікалі і небяспечна бывае:
Бо ніхто і ніколі ў жыцці
Мне так не помсціўся крыўдна і злосна,
Як стаў помсціць
Сябра адзіны, што быў.
Самы надзейны калісь.

**АВІДЫЙ ПУБЛІЙ НАЗОН** 43 г. да новай эры

Мне абурацца? Маўчаць?
Я той хаўруснік табе найбліжэйшы, цяснейшы.
Толькі нядаўна яшчэ сябрам адзіным я быў...
Так, гэта я!
Не запытаў пра мяне твой язык вераломны.
Дзе я, жывы ці памёр, мала цікавіць цябе.
А мо' сяброўства тваё было толькі прытворным?
Як не прыкідваўся ты, мабыць , пустэчаю быў!
Што адштурхнула цябе?
Ад вялікае крыўды душа мая зныла...
Калі без праўды жывеш, праўдаю – горкі папрок.
Што і якая бяда перашкодаю сталі быламу?
Мо' вінаваціш мяне сумнаю доляй маёй?

## ПЭРАЙМАННЕ ВЯДОМАГА

Паводле песні У. Высоцкага (1938-1980)

Голую Праўду ніхто не жадае пабачыць.
Голую Праўду і замуж ніхто не бярэ.
Бо ад яе непрыемнасці толькі на памяць,
Бо ад яе, ну, ці мала там што. ад яе.

Выбярэм Праўдзе сукенку па росце і з густам,
Выбярэм боты, парфуму, жакет.
Роўныя плечы накрыем старэчаю хусткай
І прапануем куды-небудзь далей білет.

Хай не марудзіць і хутка ад нас уцякае,
Лепей на полюс паўднёвы. бо там халадзень.
Хай там пінгвіны сардэчна яе прывітаюць,
Нам не хацелася б бачыць яе кожны дзень.

Ну, а Хлусня міла ў вуха галубкай вуркоча,
Люстра крывое падносіць і хваліць заўжды.
Злодзея зробіць героем, калі ён захоча.
Годнасць чужую прынізіць да крайняй мяжы.

Перафарбуе на белае чорныя плямы.
Пазатыкае у момант нязгодным раты.
Незадаволеных кіне у брудныя ямы.
Будзе усё, як з Хлуснёю цалуешся ты.

*5.12.2012 г.*

## **Д. КЕДРЫН** (1907-1945 гг.)

## КАВЯРНЯ

«Хто мае ў кішэні мускус, той не крычыць пра гэта на вуліцы.
Арамат мускуса сам за яго гаворыць»
САДЗІ

У паэтаў ёсць такая звычка –
Часам апляваць адзін другога.
Магамед Амару пальцам тыча:
«У цябе банальнасцей замнога.»
Не сцярпеў яму Амар гарачы:
«Злодзей ты, твая відаць загана,
Бо украў дванаццаты радок ты,
Не іначай, як з майго дывана.
За тваімі подлымі слядамі
Ці ідуць, хто думае яскрава?..»
Старцы ўсе бародамі ківалі.
Маладыя гаварылі: «Брава!»
Магамед пляваўся ад парога
І шыпеў: «Бяздарны ты сабака,
Хай міне цябе любоў прарока,
Падзішаха нашага падзяка!
Ты бясплодны! Ты маўчыш гадамі,
Быць паэтам ты не маеш права.»
Барадой траслі-ківалі старцы.
Маладыя ўсе казалі:»Брава!»
Толькі нехта каву выпіў моўчкі
І сказаў затым: «Давай, паглядзім.
Ну, нашто праліта столькі жоўці?»
Гэта быў паэт з усіх Саадзі.
Час прайшоў і спрэчнікаў абодвух
Забыцця засыпаў снег, як марнасць.

Стаў Саадзі залатой трубою.
І Саадзі слухала кавярня.
Араматам экзатычных траваў
Слова пахла, быццам мёд у гарцы.
Юнакі не гаварылі:»Брава.»
Барадою неківалі старцы.
Песняй зчараваныя птушынай,
Трэляй жаваронка над дарогай…
У паэтаў ёсць такая звычка:
Часам апляваць адзін другога.

## ПАСАГ

Між галін сакочуць птушкі.
Расцвілі каштаны ў Тусе.
А ружовая дачушка
Плача-жаліцца Фірдусі:
«Болей лялькі мне не сняцца,
Бо палудзеннай парою
Жаніхі ў дзвярах цясняцца,
Як бараны к вадапою.
Спадзяюся, добры бацька,
Выбраць сярод іх аднога.
Ці займелі вы у куфры
Мне пасагу хоць нямнога?»
І адказвае дачушцы
Найсумленнейшы Фірдусі:
«На двары наседкі квохчуць.
Між аблок курлычуць гусі.
Разліла вясна паводку
Ў вашым сэрцы поўнай чашай.
І сумненні, як ні горка,
Справядлівыя ўсе вашы.
Ў нашай бочцы мерку рысу
Ледзьве-ледзьве назбіраем.
І бядней за пацукоў мы,
З гумнаў што пустых ўцякаюць.
Ды суціш, дачушка, прыкрасць,
Не гаруй, яшчэ зарана.
Заўтра раніцай вазьмуся
За паданні я Ірана.
За багоў і за гэрояў,
Перамогі нашы ў бітвах…
Намаганні як патрою,

Скончу хутка пры малітвах.
Каб радок цудоўны віўся
Лёгкім золатам па чэрні.
Асалодай каб напіўся,
Падзішах у час вячэрні.
Шах пачуе й караванам
На гарбох сваіх вярблюдаў
Аксаміт, ядваб прышле нам
І ў узорах срэбных блюдаў,
Бісерам абрус расшыты,
Яхантаў непараўнаных
І найлепшага тады ты
Назавеш, дачка, жаданым.

Чараты даўно пажухлі.
Адцвілі каштаны ў Тусе.
Зноў дачка ідзе з пытаннем
К дабрадушнаму Фірдусі:
«Трэці месяц назіраю
Я цікавыя праявы.
Мілы бацька, адкажыце,
Як з маім пасагам справы?
Паглядзеўшы на вагонь ваш,
Што гарыць начной парою,
Любапытныя суседзі
Круцяць моўчкі галавою.»
Адказаў дачушцы палкай
Так разважлівы Фірдусі:
«Чараты зіма зламала.
Між аблок замоўклі гусі.
Як глыбокая крыніца,
Праца, што ў мяне паўстала.
Хоць стараўся, ды вадзіцы

Зачарэпнуў зусім мала.
Дыямэнтаў і пярлінаў
Блішча мала між узораў.
Пачакай, мая дзяўчынка,
Я тваё папраўлю гора.
Папрацую я без стомы
Яшчэ год і дні, і ночы.
І тады, мая красуня,
Выбярэш, каго захочаш.

Год праходзіць. Дні імчацца.
Расцвілі каштаны ў Тусе.
Зноў дачка ідзе пытацца
Цярплівага Фірдусі:
«Нешта бісера не бачу,
Ні шафрану для пілава.
Найшаноўнейшы мой бацька,
Як з маім пасагам справа?
Жаніхоў натоўп стаміўся
Ля дзвярэй маіх таптацца.
Ці ізноў узор з пярлінаў
Не жадае выкладацца?»
І сваёе гнеўнай панне
Сумны адказаў Фірдусі:
«Глянь радкі, складаў старанна,
Ба я працы не баюся.
Мусяць стаць яшчэ дзівосней
Тых прыгод усіх завязкі,
Каб устала песня песняў
Перад шахам лепшай казкай.
Пачакайма. Дзень той прыйзе.
Ці мо' кропіць над Іранам?
Не хвалюйцеся у крыўдзе,
Будзе з вамі пажаданы».

Вось базар на новым месцы.
Лазьня сыплецца старая.
Макаўка яго сьвіціцца,
Як кавыль уся сівая.
Ледзь паўзе пяро паэта,
Не скрыпіць, як раньш, у цішы.
Лета следам йдзе за летам.
А Фірдусі усё піша.

Чараты ізноў пажухлі.
Адцвілі каштаны ў Тусе.
Стукае дачка у злосці
Да старэнькага Фірдусі»
«Скончана жыццё. А вы ўсё
Над праклятым тым пісаннем.
Дарагі, шаноўны бацька,
Ці пасаг я прычакацьму?
Вы, як заяц, пасівелі,
Сталі злосным, жоўтаносым.
Вы над песняй прасядзелі
Дваццаць зімаў, дваццаць вёснаў!
Дваццаць раз любілі гусі.
Квецень белы быў на слівах.
Вы пакінулі, Фірдусі,
Дачку вашую цнатлівай!»
«Будуць грушы, будуць фігі
І халаты, і кашулі.
Я нарэшце скончыў кнігу.
Яна шаха не мінуе.
Горб пясчаны не астыне
За дарожным паваротам.
І вандроўнікі пустыні
Будуць ля маіх варотаў.»

Пасярод прыдворных блізкіх
Шах сядзеў ў сваім сэралі.
З ім ляжалі адаліскі.
А скапцы яму ігралі.
Шах глядзеў, як танчаць трыста
Танцаўшчыц і ў смак еў фігу.
Перапісаную чыста
Да яго падносяць кнігу:
«Дар вам зроблены паэтам,
Спеваком ссівелым слаўным…»
Шах заўважыў:»Але зараз
Мне не да дзяржаўных справаў.
Да сваіх прыйшоў нявестаў,
Я ў сваім сяджу гарэме.
Тут чытаць зусім ня места.
Я у іншай зараз тэме.
Потым пагляджу запіскі,
Невялікая тут страта.»
Уздыхнулі адаліскі.
Захіхікалі кастраты.

Узняліся птушкі вышай.
Зацвілі каштаны ў Тусе.
Дачку згорбленую кліча
Найшляхотнейшы Фірдусі:
«Саслужыце службу сёння
Старцу, што нядобра бачыць.
Па даліне, можа, гоніць
Сто вярблюдаў паганяты?

«Не бягуць к дарозе дзеці.
Бубянцы не забрынчалі.
Ў полі толькі лёгкі вецер
Размятае пыл пясчаны.»

Адляцелі ў вырай птушкі.
Між аблок замоўклі гусі.
Зноў звяртаецца Фірдусі:
«Паглядзі, мая дачушка.
Я скрозь бельмы, старац боскі,
Бачу свет, як рыба ў ціне.
Мо' ўжо блізка падыходзяць
Сто вандроўнікаў пустыні?»

«Не бягуць к дарозе дзеці.
Бубянцы не забрынчалі.
Ў полі толькі моцны вецер
Размятае пыл пясчаны.»

Вось пасол ў халаце важны
Абыходзіць двары ў Тусе:
«Дзе жыве паэт з паэтаў,
З бляскам сонечным Фірдусі?
Ўецца верш яго дзівосны
Лёгкім золатам па чэрні.
Падзішах цудоўнай песняй
Захапляўся ў час вячэрні.
Шах ў палацы даручыў мне
Ўзнагароду даць за цуда.
Даць вандроўнікаў пустыні –
Сто выбітнейшых вярблюдаў.
Аксаміт найлепшы ў свеце,
Паласатыя бурнусы…
Дзе жыве паэт з паэтаў –
Дзе ён – з'зяючы Фірдусі?»

Стогн вярблюдаў габаносых
Ад усходніх чуць варотаў.

А Фірдоусі хаваюць
За заходнім паваротам.

І на ганак з мармытаннем,
Караван сустрэць, сівая,
Да варот дачка выходзіць
І паціху разважае:
«Ах, марудныя вы людзі,
Прыпазніліся вы трохі.
Бацька мой насіць не будзе
Ні сандалі, ні панчохі.
Калі шытыя іголкай
Раней ён насіў кашулі.
То цяпер яго навечна
Ў халат з дрэва апранулі.
Як раней ад смагі горкай
Чэрпаў з ручая рукою.
Зараз бацька любіць толькі
Ваду вечнага спакою.
Мой жаніх крыламі крэсліць
Страшны след на полі бою.
Джына блізкай-блізкай смерці
Да вянца вазьму з сабою.
Ён прасіць за мной не будзе
Ані грошай, ні халатаў.
Ах, марудныя вы людзі,
Прыпазніліся да таты.

Ўстаў над Тусам вечар сіні
Між барханаў знікнуць хутка
Сто вандроўнікаў пустыні,
Сто выбітнейшых вярблюдаў.

*12.2015 г.*

## СЭРЦА

Дзяўчыну Аксану казак не міне,
Пытае:»Калі пакахаеш мяне?
Я шабляй для кралі з далёкай зямлі
Цэхіны, пярліны дабуду, рублі!»
Дзяўчына ў адказ сваю косу віе:
«Варожка гадала, што ў лесе жыве,
Казала яна, што аддам сваю жарсць
Таму, хто мне матчына сэрца аддасць.
Ня трэба цэхінаў, ня трэба рублёў,
Дай сэрца матулі тваёй мне старой.»
Казак стаў маўклівы, увесь спахмурнеў,
Не сёрбаў баршчу, саламаты ня еў.
Клінком грудзі маткі старое рассёк
І з ношай заветнай да любай пацёк.
На вышытым сэрца нясе ручніку,
Працягвае з сэрцам каханай руку.
Ў дарозе яму памутнела ў вачах.
На ганак ступіў, спатыкнуўся казак.
Як матчына сэрца паклаў на парог,
Спытала яно: «Не пабіўся, сынок?»

## КРОЎ

Белы цвет страсаючы ад вішні,
Перад любай стаў Пятро увішны:
«Ганна, не штурхні мяне на згубу,
Адкажы, я любы ці не любы?
Збыў кабзу, гуляючы да ранку,
Прагуляў кашулю-вышыванку,
Зараз на кану пастаўлю шапку
І падамся ў лес да гайдамакаў.»
«Прэч, мужык, ідзі, – сказала Ганна, –
Я кахаю не цябе, а пана.»
Дадала яшчэ з усмешкай мілай:
«Ў пана кроў блакітная у жылах.»
Дзень – другі казак яшчэ гуляе,
А на трэці пана сустракае.
І шырокі нож па тронак самы
Ён загнаў глыбока ў сэрца пану.
Белы цвет страсаючы ад вішні,
Стаў Пятро ля Ганны, як калісьці.
З воч яе на дол сляза спадае.
Ганна рукі тонкія ламае.
«Ты скажы, казак, – пытае Ганна, –
Ці сустрэў ты па дарозе пана?»
Ў похву востры нож казак хавае
Кажа: «Не, яго не сустракаў я.»
(Востры нож і рэжа ён, як крыўда)
Не, не бачыў пана і ня быў з ім.
Толькі ты пустое мне казала,
Каб кроў панская блакітам адлівала.»

## **ІВАН БУНІН** (1871-1953)

## ТАЙНА

Ён на клінок дыхнуў і жала
Яго сірыйскага кінжала
Пакрылася сівой імжой.
Ярчэй пад дымкай заблішчалі
Узоры золата на сталі
Сваёй выбітнаю разьбой.

“ У імя бога і прарока,
Слуга нябёсаў, пільным вокам
Да бітвы заклік прачытай,
І кроплю мудрасці мне дай!
Скажы, хто твой клінок аздобіў?
Што майстрам выбіта на ім?”
Сказаў: “Ты зразумець не спробуй.
Дэвіз мой – тайна над усім.
Устрашыць ён – ЭЛІФ. ЛАМ. МІМ.”

“ЭЛІФ. ЛАМ. МІМ... Іх сэнс астылы,
Як шлях у цемрадзі магілы.
Махамэд тайну іх схаваў...”
– ”Маўчы, маўчы, – сказаў ён строга, –
Акрамя бога, няма бога.
Ён сілу ў тайну закаваў...”

Сказаў, крануўся ятаганам
Ілба пад шоўкавым цюрбанам,
Зірнуў ў спякотны Атмэйдан
Лянівым позіркам драпежным
І ціха сінія павекі
Зноў апусціў на ятаган.

*1905 г.*

* * *

Успомні тых, хто пакінулі сваю Радзіму
Дзеля страху смерці (КАРАН)

Іх усіх Пан Бог знішчыў за здраду няшчаснай Радзіме.
Ён касцямі з іх целаў засеяў палі.
Ўваскрасіў іх прарок, бо у Бога жыцця папрасіў ім.
Ды Зямля не даруе ім здраду Зямлі.

Існуе дзьве легенды між легэндаў Усхода.
Мае літасць адна: уваскрэслыя ў бітве ляглі.
Жорсткасць ёсьць у другой, бо па словам прарока,
Ўваскрашоныя ў дзікай пустыні жылі.

І ў той дзень, калі з мёртвых яны паўставалі,
Іх адзенне зчарнела, як тлен у грабах.
І да смерці яны твары долу згіналі,
Каб схаваць сваю ганьбу і брыдкі свой страх.

*1905 г.*

## ДАЛІНА ІАСАФАТА

Пакутнікам ва ўцеху смерць даецца.
Ў чужых краёх, між ворагаў былі вы.
Ну, вось вам адпачынак – мір ў алівах.
Хай белы пыл вандровак абтрасецца.

Паўднёвым сонцам спаленыя горы.
Вятры Кедрона русла засушылі.
Вы ў тлен бацькоў кавенькі палажылі.
Радзіма прыняла ў свае прасторы.

Там спяць цары, прарокі і левіты.
Вякоў мінулых храмы славу сняць.
Тых, хто ў чужыне не былі забіты,
Бог літасцівы будзе апякаць.
Каменныя на жорсткіх склонах пліты,
Як Кнігі БІБЛІІ разгорнутай стаяць.

*20.08.1908 г.*

## ВЕЧАР

Пра  шчасце наша толькі ўспамінаем.
Яно ж паўсюль. Магчымы, што яно
Асенні сад вось гэты за хлявамі,
Паветра чыстае, што льецца праз вакно.

Ў бяздонным небе ціха праплывае
Узор з аблокаў. Ветразем здаецца.
Сачу за ім. Мы вельмі мала знаем.
А шчасце тым, хто ведае даецца.

Вакно адчынена. Вось ціўкнула і села
На падваконне птушка. І ад кніг
Свой позірк стомлены я адваджу на міг.
Дзень вечарэе. Неба апусцела.

Гудзенне малатарні на гумне.
Шчаслівы – бачу, чую. Ўсё ва мне.

*14.08.1909 г.*

## СЛОВА

Маўчаць грабніцы, муміі і косці,
Ды толькі СЛОВУ вечна не ўміраць.
Праз цемру дзён супроць маны і злосці
Пісьмёны старажытныя гучаць.

І іншага багацця мы не маем.
Давайце ж, берагчы і шанаваць.
Па меры сіл сваіх, ў дні гора і адчаю
Дар неўміручы МОВЫ ратаваць.

*7.01.1915 г.*

## **Б. Л. ПАСТЭРНАК** (1980-1960 гг. Расея)

* * *

Дастаць чарніла, ды заплакаць,
Рыдма пра люты напісаць,
Пакуль праталін гразь і слякаць
Вясною чорнаю гараць.

Рамізніка хутчэй паклікаць.
Праз цэркваў звон, праз клёк калёс
З'явіцца, дзе вясновы лівень
Гучней чарніла, гучней слёз.

Дзе, як абвугленых ігрушаў,
На дрэвах тысячы гракоў
Абрынуцца знянацку ў лужы,
Каб сум на дно вачэй пайшоў.

Гракі шчыруюць ў сварцы гнеўнай.
Ірве на часткі вецер крык.
Хоць выпадкова, ды напэўна,
Рыдма складаюцца радкі.

*1912 г.*

* * *

Мне восень снілася ў напоўсвятле ад вокан,
Сябры і ты ў блюзнерачай гурме.
І, як з крываваю здабычай з неба сокал,
Ляцела сэрца на руку табе.

А час ішоў і старыўся, і глохнуў,
І замаразак рамы серабрыў...
Крывавыя па шыбах беглі кроплі
Асенніх слёз, што лістапад праліў.

Так, час ішоў, старэў і, нават, шчыльны
Ядваб на крэслах трэскаўся, як лёд.
І, раптам, звонкая, ты назаўжды заціхла
І, сон, як бомы дальнія, замоўк.

Прачнуўся я. Было, як восень цёмным
Світанне. Вецер ў выдаленні нёс,
Як за вазом бягучы дождж саломін,
Чароды ў неба рушачых бяроз.

*1928 г.*

## ЗІМНЯЯ НОЧ

Мяла завея па зямлі.
Ўсё замятала.
Гарэла свечка на стале
І не згарала.

Як летам роем машкара
Мкне за вагнямі.
Ляцелі снегу камякі
Ў ваконнай раме.

Завея меціла вакно
Ў кружкі і стрэлы.
Гарэла свечка на стале.
Ўвесь час гарэла.

На белай столі угары
Цені мільгалі:
Крыжы ад ног, крыжы ад рук
Лёс крыжавалі.

І боцікі ужо стаяць
На доле парай.
І, як сляза, з яе вачэй
Воск ціха крапле.

Ўсё пагублялася ў імгле
Сівой і белай.
Гарэла свечка на стале.
Заўжды гарэла.

На свечку дзьмула ад вугла
Спакусы жарам.
Анёлак крылы узнімаў
Свае крыжамі.

У лютым кожны дзень мяло
Завеяй белай.
Гарэла свечка на стале.
Штораз гарэла.

*1946 г.*

* * *

Як хочацца, каб я прайшоў
У глыб, дзе сутнасць,
У працы, ў пошуках шляхоў,
Ў сардэчным бунце.

Да сутнасці мінулых дзён,
Да іх прычыны,
Да іх вытокаў, каранёў,
Да сэрцавіны,

Каб увесь час трымаў я ніць
Падзей і лёсу,
Кахаў і думаў і мог жыць
Без перакосаў.

І, калі б я напэўна змог
Пазвязваць часткі.
Я б восем напісаў радкоў
Пра якасьць жарсці.

Пра беззаконне і пра грэх,
Пагоні, ўцёкі,
Паспешных неспадзёвак збег,
Далоні, локці.

Я вывеў бы яе закон
Той незмянялы.
Яе б імёны паўтараў,
Ініцыялы.

Я б вершы гадаваў, як сад,
Ўсіх жыл трымценнем.
Квітнелі б ліпы там у рад...
У іхнім ценю

У свой бы верш дабавіў я
Дыханне мяты,
Бляск сонца ў водах ручая,
Пярунаў ляскат.
Так некалі Шапэн прыўнёс
Жывое цуда
Фальваркаў, кветак, паркаў, рос
Ў свае эцюды.

Ды дасканаласць атрымаць –
Пакут навука.
Нацягнутая цеціва
Тугога лука.

*1956 г.*

* * *

Давайце словы пагубляем,
Як сад лісця губляе медзь.
Бурштыны з золатам спадаюць
Павольна, шчодра і ледзь-ледзь.

Не трэба выдумляць навошта
Лімонам нехта спырснуў крону.
Хто гэта робіць цырымонна,
Не разважаючы пра кошты?

І хто іголкі заслязіў,
Лінуўся проста цераз жэрдкі
На ноты і да этажэркі
Наскрозь праз шлюзы жалюзі?

Хто дыванок мой за дзвярыма
Ў рабіны колер засурміў?
Радном скразным і немагчымым
Затрапятаў на ім курсіў.

Хто загадаў ты запытаеш,
Калі пра жнівень узгадаеш,
Каб ён такі прыгожы быў?
Хто гэтак хараша зрабіў
Кляновы ліст з яго аздобай
І не лічыў гэта за дробязь?

Здаўна, з Эклезіяста дзён
Граніт з мармурам чэша ён.

Хто загадаў, ты запытаеш,
Каб вусны астраў і лілей
У верасні пакутавалі?

Каб вузкі дробны ліст ракіт
Ляцеў з сівых карыятыд
На макрату дарожных пліт
Праз слёзы у асенніх далях?
Хто загадаў, ты запытаеш.

Магутны бог усіх дэталяў,
Ядзьвігі бог і бог Ягайлаў, -
Кахання ўсемагутны бог!

Ці разгадаць калі хто змог
За гробам цемры неадвязнасць?

Але жыццё, як цішыня,
У восень будзе падрабязным.

Пад гэтым вершам няма даты. Мяркую, што з ранніх. Думка чароўна пляцецца па асацыяцыям. Але цікава, чаму прыпляліся Ядвіга з Ягайлам?

* * *

Незакончаны верш, пасля таго, як Барыса Пастэрнака уганаравалі Нобелем

Я прапаў, як звер ў загоне.
Воля дзесь. Людзей гурма.
А за мною крык пагоні.
Ходу мне адсюль няма.

Цемната. Гушчар у лесе.
Хвоі спрахлай бервяно.
Шлях адрэзаны адсюль мне.
Будзь, што будзе. Ўсё адно.

Што такога ім зрабіў я?
Я забойца у крыві?
Я ўвесь свет прымусіў плакаць
Над бядой маёй зямлі.
........................
Цісне ўсё шчыльней аблава.
А другому  сам віной.
Я рукі не маю правай –
Ўцеха сэрца не са мной.

А з такой пятлёй на горле,
Каб займець навек спакой,
Слёзы выціраць хачу я
Праваю сваёй рукой.

## **А. БЛОК** (1880-1921)

У густой траве прападзеш з галавой.
Пераступіш родны парог…
Абаўе касой, абдыме рукой:
«Адпачні, мой князь, ад дарог.
Тут, калісьці, у нас віўся дзіўны павой.
Ружа цветам буяла вясной.
Брамы слуп спрахнеў. Сад здзічэлы мой.
І густою ўсё зарасло травой.»
Як бывала, забудзешся, што дні ідуць.
Як бывала, даруеш ганарлівым і злым.
Паглядзіш, а там – хмары ў небе ўстаюць.
І над роднай старонкай калышацца дым.
Заплача сэрца па чужой старане,
Запросіцца ў бітву, ізноў пазаве.
Толькі ціхая мовіць:»Вярніся ка мне.»
І порсткі тупат каня па густой траве.

* * *

Ўспомні трывожны наш горад.
Сіні туман ўсцяж зямлі.
Гэтай зманлівай дарогай
Моўчкі з табою пайшлі.
Йшлі мы. І поўня ўставала
Ціха з-за цемені хат.
Марнай дарога ўдавала.
Я не вярнуўся назад.
Наша каханне зманіла.
Сцежка не так завяла.
Толькі душу зварухнула
Сіняй сінечы імгла.
Горад прыпомні трывожны.
Сіні туман ўскрай зямлі.
Гэтай зманлівай дарожкай
Моўчкі з табою пайшлі.

Многія узоры сапраўднай паэзіі гучаць вельмі проста.

Калі зрабіць разумовы аналіз, то як бы і ні пра што. Але пераносішся у іншае вымярэнне, у свет эмоцый паэта, уваходзіш туды і адчуваеш тое самае, тую эмоцыю, той стан душы. Можна сказаць, што ПАЭЗІЯ – зменены стан свядомасці – жаданне зазірнуць у Залюстроўе.

Зачароўваючыя вібрацыіі словаў, рытмы паэтычных строчак вымушаюць апынуцца ў іншым вымярэнні і адчуць тое, што адчувае паэт.

Тое тычыцца і вібрацыў музычных гукаў і вібрацый ад успрыймання колераў у выяўленчым мастацтве. Гэтыя тры галіны мастацва моцна паміж сабою звязаны, нават, немагчыма уявіць наколькі моцна. Нездарма было сказана, што напачатку было слова.

## РЫГОР ЯКАЎЛЕВІЧ ШЫРМАН

1898-1956 гг.

У маім архіве захавалася 40 санэтаў Рыгора Шырмана, выданыя “САМВЫДАТАМ”. З 1962 па 1968 год я вучылася на адзяленні астраноміі ЛГУ (Ленінградскі універсітэт). І, хаця гэтыя гады называюць “гадамі адлігі”, г.зн. памяньшэння ўціску на друкаванае слова, творчасць многіх паэтаў была непажаданай ці ўвогуле забароненай для агучвання на шырокія масы цікаўных. З гэтай прычыны па руках (а давалі толькі надзейным людзям) хадзілі надрукаваныя на пішучай машынцы, ці, нават, перапісаныя ад рукі вершы: гэта і паэты “срэбранага веку” – Севяранін, Гумілёў, Ахматава, Цвятаева і іншыя,  жывыя тады паміж нас Ул. Высоцкі і І. Бродскі., наглуха забароненыя. У афіцыйным друку тады панавалі Я. Еўтушэнка, А. Вазнясенскі, Р. Раждественскі. Да мяне, сярод іншых каштоўнасцей, трапілі надрукаваныя на машынцы 40 санэтаў Рыгора Шырмана. Я адразу была зачараваная іх дасканаласцю, арыгінальнасцю. Адчувалася вялікая эрудыцыя аўтара, прарэзлівы смутак вялікай душы на гэтай Зямлі, дзе няма ні лагоды, ні згоды, дзе немагчыма змагацца з пануючым злом. Душа імкнецца ў касмічную прастору, але і там не знаходзіць сабе прытулку. Глыбокі сарказм, іронія і самаіронія разам з пяшчотнейшым рамантызмам характэрызуюць паэзію Рыгора Шырмана. Каб яго разумець, патрэбна мець шырокую адукацыю, бо featureнастароннасць і маштабнасць яго ведаў часам вымагае звяртацца да слоўнікаў ці энцыклапэдый.  Паэзія Р.Шырмана мае складаны, неардынарны асацыятыўны рад, для успрыймання якога патрэбна шырокая эрудыцыя і напружанне інтэлекту. Заўважу, што Р.Шырман валодаў пяццю замежнымі мовамі. Тады, я маю на ўвазе перыяд да 2008 г., немагчыма было даведацца хто

ён і адкуль. Так і праляжалі ў мяне санэты Рыгора Шырмана больш за поўвека. Пра творчасць Р.Шырмана і біяграфічныя звесткі стала магчымым даведацца толькі цераз 60 гадоў пасля яго смерці. Але "мастацтва вечнае" і "рукапісы не гараць"... Толькі ў 2008 г. у Маскве яго дзеці – сын і дачка – выдалі кнігу: усё, знойдзенае на антрэсолях з бацькавага архіву – гэта больш за 1500 паэтычных твораў.

Мною перакладзены на беларускую мову 40 санэтаў з "Самвыдата", якія я зберагла. Вяршыняй творчасці Рыгора Шырмана несумненна з'яўляюцца санэты. Маскоўскія літаратары прызналі Р. Шырмана найлепшым санэтыстам 20-га стагоддзя.

Даведалася, што ён нарадзіўся на нашай беларускай зямлі. Тое, што Рыгор Шырман жыў у гады, калі фарміруецца мова і свядомасць у беларускамоўным асяродку можна заўважыць пры уважлівым чытанні. Па-першае сінтаксіс, дакладней будова сказу, лёгка лажыцца на беларускую мову, па другое асобныя словы, напрыклад, слова "гадаваць" у сэнсе вырошчваць, клапаціцца, выхоўваць ужываецца толькі ў нас, карэнны рускі так ніколі не скажа. У вершах нагадвае Прыпяць, Дзвіну... Прапаную вашай увазе санэты з кнігі "Зорны покліч" Рыгора Шырмана.

*АЛЯКСАНДРА ГРЫЦКЕВІЧ*

## **Р. Я. ШЫРМАН** (З АЎТАБІЯГРАФІІ)

“Нарадзіўся 21.04.1898 г. у мястэчку КРЫЧАЎ, МАГІЛЁЎСКАЙ губерніі ў габрэйскай сям’і. У 1905 г. бацькі прывезлі мяне ў горад Рослаўль, Смаленскай губерніі, дзе з вялікай цяжкасцю пры існаваўшай тады працэнтнай норме для асоб іудзейскага вераспавядання атрымаў нарэшце атэстат сталасці. З 1916 па 1920гг. Вучыўся на медфаку 1-га МГУ. Да 15.06.1025 г. быў лекарам ардынатарам пры роддоме імя Сечанава. Далей займаўся медыцынскай практыкай. Пісаць вершы пачаў у “раннім дзяцінстве”, займаўся астраноміяй, хацеў абавязкова стаць астраномам. Заўсёды з вялікім задавальненнем чытаў навуковыя працы з гэтай выдатнай галіны навукі…”

Рыгор Шырман да канца жыцця пражыў у Маскве. Дружыў з Ясеніным, Марыенгофам. Чатыры разы быў арыштаваны ў 1927, 1937, 1941 і 1949 г. Утрымлівалі на Лубянцы. Былі выданы невялікія кнігі вельмі маленькімі тырыжамі: “Машыны цішыні” 1924 г., у 1926 г. эратычная кніга “Забароненая паэма”, а таксама зборнікі “Клінапіс маланак”, “Чэрап”, “Карусель Задыяка”, “Сузор’е змяі”.

Кніга Рыгора Шырмана “Зорны покліч” надрукавана ў Маскве ў 2006 г.

*Аляксандра Грыцкевіч*

## ЭПІГРАФ

*На хлеб, на лірыку, на чэрап доўгавухі*
*Зноў дадзены прасцейшыя правы.*
*Капыты шэрых муз сярод травы...*
*Жарыце, каб не здохнуць з галадухі!*
*Тапчыце поплавы, бліскучыя,як мухі,*
*Што золатам адсвечваюць зялёным.*
*Суфліруйце гучней, баранія галовы,*
*Схаваныя адкормленыя духі.*

Рыгор Шырман

## **САНЭТЫ.** З кнігі “ЗОРНЫ ПОКЛІЧ”

1 * * *

Вясёлы чорт, чым пачастуеш нас?
Частуй жа чорнай брагаю касматай.
Блішчаць Сусвету вочы вінавата
І забаронены багіняў час.
Імчацца ў небе Геркулес і Леў.
Свой лук Стралец нацэліў ў вобраз Ойчы.
Шлях у імгле пакажа мне аднойчы,
Магутны дойлід, што ў сабе займеў.
Усё мне прэсна. Сэрца просіць солі.
Хто дасьць? Круціцца ў коле лёсу мне даволі.
А, можа, новы том, што разам з тым
Крышталем бліснe радасці зманлівай?
Паэзія ў разрыве залатым
У шчасці сваім вельмі нешчаслівым.

2* * *

Стракатыя раскіданыя словы,
Як валуны ў тысячагодным полі.
Народы вашы косці раскалолі
І вырасла трава адвечнай мовы.
Паміж далін зямных, між іх раздолляў
Дзьме пагалоску старажытны вецер,
Што з горных высяў вырваў вас нам глетчар
І ссунуў на зямлю зусім без болю.
І доўгі час тачыў вас навылёт
Бяз стомы жорсткі і гарачы лёд.
І мяккая вада вас цалавала.
Адкрыўся і ў маёй стыхіі зрок
І чую грукат ў ёй былога вала.
( 14 строчка страчана)

3* * *

О, ты, адрынуты і непатрэбны божа,
То міласць цудатворная твая,
Што плачу і блюзнеру разам я
І, дрыжачы, гляджу на раздарожжа.
І ў сутаргах, зусім бездапаможны,
Калі з табою варагую я,
Як спапяляецца душа мая,
Табой гару і стыну я табой жа.
Ў трымценні зорак пасвіцца быццё.
То гаспадарства вечнае тваё.
Ты вынікі адкрыў мне і прычыны.
Журботнай песняй ахінуў чало.
І ўслед за душаў клінам жураўліным.
Прашуся я ляцець ў тваё святло.

4* * *

Я вам, сябры, напомню аб Пракрусце.
Ён укарочваў, ён і падаўжаў
Палубагоў, разбойнікаў, мянял і паміж іх
Стваральнікаў, вясёлых і жывых, смугі цягучай.
Ён губы не крывіў пры косці хрусце
І вельмі меру ложка шанаваў.
У змроку з лісцяў пальмавых махал
У невядомым дальнім захалусці.
Праклёны Геркулесу, што яго забіў,
Калі прароцтва выканаў Сібіл.
Ня то б даўно аднолькавага роста
Насельнікі плянэты ўсёй былі.
І як жа лёгка і няўмольна проста
Да паслухмянасці б агульнай прывялі.

5* * *

І, славячы цябе, палілі мы
Ерэтыкоў на чорных плошчах. За завалай
У склепах катавалі небывалых
Раптоўных геніяў, што чулі рух Зямлі.
Ўслаўлялі мы цябе. Ў ружовым пыле
Нясліся вершнікі навыперадкі з ветрам.
Здзічэла руйнавалі і ганебна
За пераможцамі жанкі чужыя йшлі.
Плашч, замусолены аб ісціну, ў Пілата.
Яе не ведаем. Але ці ў гэтым страта?
Бо ,можа, хутка нас задарма, а пакуль
Пякучая журба й на золата крывавае багаты
У свеце валадарыцьмуць паўсюль,
У пекла без надзей тваё, скажы, якая плата?

6* * *

Пэрсэя праўнукі да Андрамэды
Імчыць крылаты конь шалёных нас.
Нязгасны свеціць у імгле Парнас
Касмічным жахам ад яго трагедый.
Ў трызненні нашым гулкі голас медзі,
У жылах шамаціць Мядузы кроў.
І неба хвост каметы прапароў.
Дні скамянелым робяцца суквеццем.
У хцівай памяці,як у скляпах,
Захоўваем жыцця і смерці пах.
Але, калі бяды спасцігне час,
І сэрцы затрапечуць. Праз імгненне
Ўсё ўспомнім мы, а ўсе прыпомняць нас.
І зробіцца святым наша трызненне.

7* * *

Харэяў хуткіх не стрымаю плыні,
Ні ямбаў цёмных, ані анапэстаў.
Бо колькі наравістых іх не песьці
Ў радках не адкрываюцца глыбіні.
Як восеньскае ночы жарало,
Яны цярушаць знічамі, прарочаць.
Усход ружовы вочы бачыць хочуць,
Ды зорак льецца срэбнае святло.
Чароўная зайграе дзесьці флейта.
Успыхне ўласны мой вагонь, ня нейкі.
Я Музе неразумнай расплята
Цяжкія косы і заплюшчу вейкі.
Так ў Тарычэліяву пустату
Сцябло бліскучае імкнецца Фарэнгейта.

8* * *

Са строфаў брага хмеліць лепш напояў.
Ў маёй душы яе яшчэ даволі.
І веру: не існуе лепшай долі,
Як сілу з песняй паяднаць і воляй.
Душы адважнай незнаёмы страх,
Каб холад рассякаць ў Сусвеце цэлым.
І поўня мне здаецца каравэлай,
Рабуючай аблок архіпелаг.
Я цешуся з таго, што ў нас два вока,
Што вечар разразае цэласць змрока
На дзень і ноч. Мінулае далёка.
Гудзе дуда і кліча цераз час,
Густы ў ёй голас чуецца прарока.
Адзіны ў полі вой – песняр – ня ў першы раз.

9* * *

Вільготная зямля насычана вадою.
І любяць тлушч вады авёс і рыс.
Варушацца жыты ў ядвабе светлых рыз
І хуткаплынны час бяжыць ракою.
Ахутаны у цемру кіпарыс.
Ён хвалям моліцца архіпелага.
А дзесьці між пяску хрыпіць бадзяга –
Ён свой скураны мех пусты разгрыз.
Мацерыкі кіпяць і вержуць акіяны.
Стыхія рудая раве неўтаймавана.
Ў адно спляліся шчасце і бяда.
Мазгі паэтаў курчацца, каб джаліць.
Цягучая душа Зямлі – вада
Усюды мудра праграызае наледзь.

10* * *

Як старажытны раб, стаю нямым,
Схіліў я галаву і выліў вочы
На срэбраны кавыль блакітнай ночы,
Каб параўнаць смуглявы бляск твой было з чым.
Ўсе думы агалёныя паэм,
Ўся вечнасць, што імгнення мне карочай –
Твае. Вазьмі іх, раптам разварочай –
Убачыш, што, апроч цябе, не маю тэм.
Прыпомню Пэрсію часоў Эсфіры,
Кімвалаў звон і грэчаскае ліры…
Наканаванню зораў вераломных
Я не скажу, скарыўшыся:“Бывай”.
Пакуль святло ліецца голай поўні
Ніхто каханню не памеціць край.

11* * *

Нібыта доўгія імгненні болю
Зачаткі словаў, што ў крыві блукаюць.
Яны суворы позірк вымагаюць
На тое, што у нас забрала волю.
Ў траву зялёную я цішыню заўю,
Ды крык барвяны ўжо напагатове.
Я сонца п'ю, як вылечаны Товій,
Як прашчур-чараўнік, я зорку п'ю.
Святым хай будзе грэшнае тварэнне.
Прымі біблейскае добраславенне.
З пакораю. Натоўпаў гул яшчэ не чуеш ты.
Ды бліскаюць на сонцы медзю трубы
І бачу я пустыя чарапы
Вясёлыя і голыя, як бубны.

12* * *

О, вы, лагодныя мае цнатліўкі,
Вы, пільныя сябры даліны дальняй,
Вы не шукайце слёзаў спавядальні
Ў ільдзістай вышыні, дзе мой напеў імклівы.
Авалы глыбаў, каб зрабіліся авальней,
Над кожнай вельмі доўга я карпеў.
І, каб у снах пачуць анёльскі спеў,
Утульную ствараю спачывальню.
Усмешкай разганяю грай вароньні,
Што засланяюць свет безабаронны.
Як вып'ю церпкага віна парой,
Ня слухаюць суворай сакратаркі,
Якую клічуць "Трэзваю рукой",
Жывыя літары, як жвавыя бунтаркі.

13* * *

Ня пляскайце вы, бледныя далоні.
На вашых крылах мне не паляцець,
Не люба вам, калі галосіць медзь
І вершнікі зрываюцца пагоняй.
Вас ведаю, туманныя святошы,
Не вам у захапленні вар'яцець,
Не вам недасягальнага хацець.
Вам толькі гук чуваць сурдынкі нехарошы.
Хто рухам заварожаны Зямлі,
Тых не трымае і ня палянглі
Яны ў тумане залатой дарогі.
Іх чарапы мы бачыцьмем раптоўна
Пад месяцам вісяць залатарогім.
І грэбуюць вандроўнікам натоўпы.

14* * *

На глінянай Зямлі, у тлене і іржы
Блукае несмяротнасць ў чалавеку.
У вышыню ён падымае вейкі
І чэрпае ад вечнасці дзяжы.
Няма вачэй паўней, а ёсьць нажы
Вастрэй, чым позірк ворага навекі.
Сыны, Ісак з Якубам, ад Рэвекі
Глядзяць так, вочы ў вочы на мяжы.
І жорсткі бунт галодны не адменяць.
Вада з крывёю разам заструменяць.
Камэны аглушоныя маўчаць.
Толькі віхор пыл кружыць ад іх страты.
І зорак сцелецца ліловы чад.
І над Зямлёй вагонь плыве хвастаты.

15* * *

Лістамі чорнымі сухіх начэй
Гады, як лісце ў восень, аблятаюць.
Крыклівых зорак спуджаную зграю
Лавіць спрабую ў жніўні я званчэй.
Ручай малочны кісне ўсё хутчэй.
І іншых млечнасцей туман у небе зз'яе.
Бяда. Бяда. Прасторы не хапае.
І мала часу. Дні ўсё карацей.
Дрыжыць, як піша, бледная рука.
Я празарлівасцю п'яны чараўніка.
Са словаў дзіўную раблю змяю,
Каб не сатлець і быць з сабою ў згодзе.
Павольна так праз галаву маю
Праходзяць чарадой тысячагоддзі.

16* * *

Паважнай веліччу напоўню словы.
Сэнс абцяжарыў стройных літар рад.
То залатая надыйшла пара
І жніўнем засьвіціліся галовы.
Сінеча нада мной, а дол з травы
Падстрыжанай, ракітнік невысокі
Ды нашыя папірусы – асокі,
Чый сум зялёны кожны раз навы.
Стаў захад зараз ярасна – крывавы.
Усход інакшыя акрэсліць з'явы.
І снежнай посцілкай палі здратуе.
Ў іх белыя закруцяць завірухі,
А чорную прастору засвідруюць,
Як жаваронкі, зорак дальніх рухі.

17* * *

Ў густую ноч сцякаюць нашы дні.
Быццё – ты вельмі жорсткая стыхія.
І з цёмным вершам ў змроку, нібы з кіем,
Да першаснай іду сваёй радні.
Бляск дальніх зор мігціць на камяні
І падаецца шкураю змяінай.
І ва ўрачыстым голасе зачыну
Крыламі чорнымі мой спеў звіні.
Па дрэву поўзаю ўсяго Сусвету,
Каб мову запаведную праз гэта
Украсці для Зямлі глінянай долі.
Гасподняга я гневу не баюся.
Касматыя у пекле мне вугольлі
Гатуй за тое, да чаго імкнуся.

18* * *

Журботна тут на спаленай зямлі…
Як будды, нерухомыя дэхкане.
Кляхоча плоў, вада ў гліняным жбане
І бледны хлеб, што рэзаць пачалі.
Ўскіпела брага у ружовым шкле.
Калоціцца ў грудзях няроўна сэрца.
Праз пыл інакшым мне заход здаецца.
І зоркі ў яшмавай мігцяць імгле.
Сусветны дах адсюль дастаць рукой,
Памір, аброслы хмараў барадой.
Калькутта – ўнізе, нада мной Ташкент.
Азійскі месяц пaглядае хмура.
Душа апалавым паветрам ад легэнд
Тут на радзіме поўніцца Цімура.

19* * *

Ў складаным руху нашае Зямлі
Ў святле народжаны зямныя дні.
Шумяць, гудуць яны, як авадні.
А ночы паміж зорак пралеглі.
Імчаць гады сляпыя ў параноі.
Народы валасатыя прайшлі.
Ізноў плывуць крывыя караблі.
Сучаснае праходзіць, як былое.
Навалены стагоддзі, як памёт,
За пышнымі клубамі у планэты.
Ды птушкі-песні ў ім знаходзяць мёд
З халодным задаволеннем пры гэтым.
Не разумее птушак хай ніхто.
Зямны ў тых песнях час зрабіў гняздо.

20* * *

ВАЛЬТЭР

Быў брыдкі для цябе жалезны Праметэй.
Ты называў пачвараю Эсхіла.
Тваёй душы зямной была няміла
Пра бога ў небе выдумка людзей.
І, лаўрамі убраны, чарадзей,
Ты ў пышнай ложы усміхаўся хіла,
Калі з натоўпам плошча папрасіла
Публічнай ласкі для тваіх касцей.
То не трагедыя глухіх гадоў.
Ў фрывольны час дуэляў, парыкоў,
Увесь працяты думак навізной,
Умеў смяяцца, гонарам сагрэты,
Як над тваёю срэбнай сівізной
Ад караля глуміліся кляўрэты.

21* * *

З халоднаю душой ў плашчы крылатым
Блукаю па чужым мне гарадам.
Збіраю ў строфы я усмешкі дам
І трапятанне плеч ў шыцці багатым.
Але я волі дзікай не прадам.
Вітанне і хібаркам і палацам.
Якая б Ева пышна ні цвіла там,
Не я яе паслушлівы Адам.
Павеўная камэна, ты мне рада.
Ты кожны міг мяняешся і здрада
Тваёй мне вечнай вернасці мілей.
Паэт і вецер – ім няма законаў.
Трапеча плашч пры месяца святле.
Спявае звер ў крылах яго суконных.

22* * *

Зямную мову звыклую сваю
Я радасным вар'яцтвам узвялічу.
У чорную прастору я паклічу,
Лірызм у словы музыкай заўю.
Вятры эпох ляцяць са мной на бітву.
Праб'е ім крылы мой імклівы лёт.
Я выпраменены агністы лёд
У рэбры, паміж тым, глынацьму хціва.
Магутны ў целе з'явіцца матор.
І распачне мой дух сягаць да зор.
У жылах пацячэ другая кроў.
І вобразамі памяць расквітнее.
Рассыпаную думку між вякоў
Спарадкую у эпас моцнай дзеяй.

23* * *

Яны заўжды страшыліся расплаты
І не шчадрыліся ніколі на дары
Для нашай брацiі любой пары
Ад нас да бардаў, апранутых ў латы.
І дон-жуанскі спісак даўгаваты
Дастаўся Пушкіну, што ні кажы,
Не за лірычны склад яго душы,
А за вачэй дый рук арапскія абхваты.
Мы ціхамірныя паміж вякоў,
У нашых жылах час не пабароў
Разбэшчаных цароў усходніх сокі.
Спявае гучна певень сярод ночы.
Гарыць агонь да холаду высокі.
Паходню Эраса тушыць не хочам.

24* * *

Сцюдзёных зор сухія араматы
Дзьме вецер аравійскі праз Іран.
Ты дыктаваў і Сутры, і Каран,
І мудрага, калі хацеў, рабіў вар'ятам.
Над намі вые Сірыюс касматы –
Твой, ў дыямэнтах ранаў, верны хорт.
Пякельны жах укрыжаваў прастор.
Паэта дух сумненнямі працяты.
Мароз твой ведаю пусты і люты.
Пяе спявак, у ланцугі закуты,
Тваіх вачэй пагляд неулавімы.
О, дай мне мудрасць ясную змяі!
Азмрочаныя, вострым снегам вымый
Скрываўленыя словы на Зямлі.

25* * *

З танюткай перакладзінкі адной
Той клеткі цеснай, сэрца дзе нудзіцца,
Ты зроблена і не магу забыцца
Цябе, о, носьбітка ўсёй слодычы зямной.
Цябе ў начную спёку я ствараў,
Як знічкі сінія уніз ляцелі.
І праз твае павекі, што трымцелі,
Я бездань неба сэрцам адчуваў.
Душа, спазналая твайго палону долю,
Сама не хоча болей быць на волі,
Імкнецца да цябе, трымціць жывей,
Калі на вішні пры высокай поўні
Самотны заціхае салавей.
А ты, каханая, мяне ці ўспомніш?

26* * *

Я красамоўства слухаю вады,
А берагі заўжды маўчаць панура.
Уцёсаў скамянелая скульптура
Глядзіць на нас змярцвела праз гады.
І пышна вянуць дзесьці гарады.
І стрэлы рассыпаюцца Ассура.
А Рым грыміць, як лютня трубадура,
І пыл ляціць з каменнай барады.
Шалёны час. Эфір гарача-дымны.
Сусвет ў тумане, але веру ў прымхі,
Што некалі і нас вятры ўзнясуць
Твае наверх за воблакі нячутна.
І камні салаўямі запяюць,
Як панна, што і слабасцю магутна.

27* * *

На самым дне , у змроку , увесь час
Калышуцца халодныя глыбіні.
З лагоднасцю варкуе галубінай
Й сьвіціцца ціха рыба Стаміяс.
Над ёй стыхіяў не змаўкае шум.
Сусветныя там круцяцца турбіны.
Яна губляе бледныя рубіны
У непраглядную без межаў цемнату.
Спявак непераўзыйдзены, такі ты,
Як неба жах убачыш праз блакіты,
Пачуеш зорны покліч у імгле.
Суровы і ў лагодзе грозны погляд.
Змяшаўся з цішынёю зык на дне.
У вечнасці прамозг жывы радок твой.

28* * *

Спакою мудрасць я даўно спасціг,
Спазнаў вялікае і простае злічыў.
Сваім нязгасным промнем апаліў
Мне вочы ярасны Архістраціг.
Даўно я сыты пылам кніг старых,
Сляпы, як Арыёста. Анджэліка
Мая не мае бляску маялікі,
Ня б’ецца радасна між рук маіх.
Мой кабінет – старых вякоў кладоўка.
Не раз, скучаўшы, досыць паслядоўна
Парвануюю хламіду надзяваў
І апяваў законы Хамурабі.
Ў руцэ маёй быў бронзавы кімвал,
Які глушыў рабоў выццё  і наракanні.

29* * *

Пярнаты вецер сатварыў Эўропу
З ільвіцы кіпцямі, з кароўей галавой ,
Напоўніў жылы ёй чырвонаю крывёй,
Даў душу і арліных крылаў моцу.
І акіян бязмежны адступіў
На Захад і на Поўнач і суворай
Ён, пад рухомай ветрамі прасторай,
Агонь падземны вечны затаіў.
І выспы разляглíся ў круг, як дзеці
Мацерыка на ледзяной планэце
Каля сасцоў надутых і ружовых.
Цвярдзей на прыбярэжжы сталі скалы.
І, зоркі цэдзячы, край неба стаў пунсовы.
Быком стаў Зеўс-громакідальнік небывалым.

30* * *

Зямным агнём без полымя гарым мы,
Квітнеем без пялёсткаў між вякоў,
Без крылляў узлятаем зноў і зноў
І наракаем мы непрымірыма.
Табліцы медных зор, вялікі Рым
Праносяць вечары ў ліловым свеце.
Рыззё тэорый словы праўды дзесьці
Навостраным лязом прарэзваюць сваім.
Зямля плыве і стыне белы кіпень.
Мне мяса згінулых імёнаў сніцца.
Тры тысячы гадоў… Гадзінаў міліёны…
Актавіян, правінцыя – Егіпет.
Разбойным рымскім вэнзалем кляймлёны
Над Афрыкаю прамянелы скіпэтр.

31* * *

Былі гіганты. Волаты жылі.
Паблісквалі у адзіноце вочы.
І камень гнуўся, як лаза, уночы…
А чалавек і звер адно былі.
Далей злагодзіў свет свае шляхі.
Палалі вогнішчы і фарбы ўсюль буялі.
Паміж чумы ў Італіі кахалі.
І слёзы Рафаэлявы цвілі.
І яблыка звалілася Ньютона
Хоць Галілей стаяў безабаронна,
Паверылі акругласці Зямлі.
Запенілася малако пустых матэрый.
Гусцей мазгі ў людзей, ўрадлівей іх палі,
Бо ў сваім сэрцы прыглушылі звера.

32* * *

Па вашай пышнасці сумуе сэрца,
Гасцінныя гэтэры, у той час,
Калі свяціла пакідае нас
І ў храме цемнаты мы ўсе адзінаверцы.
О, смех жаночы, за ядвабнай дзьверцай
Ты акрапіў мяне ў каторы раз.
Табе Сакрат аддаў сваю ўсю мудрасць. Красс
Бяз ліку соцень золата сэстэрцый.
І ты, празрыстая, як Ніла цьма,
Гэтэра імпэратараў, сама,
Што галаву нямую Пталамэя
На плоскім блюдзе Цэзару нясла.
Стаю перад табою і нямею
З журбы каронаю вакол ілба

33* * *

Святло з імглой раскіданы паўсюль.
Бягуць яны па эліпсам арбітаў.
Пагляд мой іхняй цемнатой набіты,
Іх абуджаю песняй ніадкуль.
Шум урачысты чую стройных кедраў.
Найстаражытнейшы Сусвет шуміць.
І Піфагор ад пірамід ляціць.
І завітаў Платон з-пад актаэдра.
То – вецер часу. Гэта свішча ён.
Марозамі нізрынутых карон
Бліснулі дзёрзка розуму крышталі
Зямля зноў плоская. Забраныя ў палон,
Рабы пакорныя пад бізуны папалі.
І ў гробе залатым Тутанхамон.

34* * *

Ізноў магу я адчуваць радок.
Змяі мароз працяў мае калені.
Палонны я ізноў. Няма сумненняў,
Пятлю сцюдзёную не рассячэ клінок.
Я да вясёлкі працягну руку.
Планэтаў шум пачую пажаданы.
Млын круціць свой Сусвет неўтаймаваны,
Журбу і смутак меле на муку.
Ад зорак тлен ляціць неутрыманы.
Ў сваім начным трызненні палымяным
Я да салодкага даткнуся дна.
Зноў усплыву пад горасную млечнасць,
Дзе ў кожным атаме паўторыцца яна –
Прастора без мяжы і рух праз вечнасць.

35* * *

Пярловых мараў жорсткія абманы
І выпарэнні таямнічай млосці.
Заходаў рудых палкія мілосці.
Пажары ад бунтуючай нірваны…
Зор не трываюць залатыя косці:
Народзяцца – пагаснуць, а затым
Усё той жа вымысел туманна-залаты:
Шчаслівых духаў караваны ў госці.
Стараюцца паэты дзень і ноч.
Хварэюць на ружовенькі радок.
Я такі самы паміж іх працую.
Арбітаў расшыраю абручы.
Маёю жоўтай чалавечай скурай,
У задуменні вечнасць шалясціць.

36* * *

Не змог цябе ў жалобы раму ўставіць,
Халодны бляск усмешкі васкавы.
Яшчэ агонь твой у ва мне жывы.
Ў ім свеціць аплываючая памяць.
Журбу сваю хачу пераупарціць.
Няма праросткаў цераз тлен травы.
Боль не дае на забыццё правы.
У нас зіма. Снягі звіваюць ніць.
Смерць дапаможа памяць пагасіць.
Ня вельмі проста ў холад далей жыць.
Па смерці профіль стане быццам з воску.
Што расцвіце, то адквітнее зноў.
Здаецца сэрца лёгкім мне і плоскім.
Шчаслівы той, хто шчасця не знайшоў.

37* * *

Я вырвуся з тваёй магільнай гліны
Зямлі лянота, што цяжэй свінца.
З цярпеннем, мо', вясёлым мудраца
Шкілет я верша вывучу арліны.
Чытаючы пра подзьвіг Катыліны,
Непараўнальсць прыклада прызнаю.
І, можа, я таксама прачытаю
Ўсе да апошняй Дантавы тэрцыны.
Але, ляцеўшы ў сінюю імглу,
З Вяргіліям размову перарву.
Калі пабачу на стале я Будду,
У цішыню зямлі пайду – о. божа мой –
Без разважанняў, проста слухаць буду
Звон гаманкі нябёс начной парой.

38* * *

Ў тваім нямым краі зачараваным
Наўцоў няголеных паўстаў мяцеж.
Вар'яцкі рухаецца іх картэж
Ў каменнай беспаветранай нірване.
Сайдзі ў даліну, статак твой усцеш.
Скажы, няма такога, што не звяне.
Ўсё напярод пазначана багамі.
Смерць і жыццё паўсюль адное спрэс.
Там, дзе ядваб стракаты перлавіцаў,
Дзе Брахмапутра поўная імчыцца,
Пялёсткі лотасаў ссыпаюцца з рукі.
Прыгожыя жанкі там сохнуць рана,
А ў нерухомай глыбіні ракі
Рэй зорак топіцца у цемнаце абранай.

39* * *

Быў голас мне між буры праз палі:
Катуй люцкія беды да знямогі.
А гонар і здабычу перамогі
Ты тленнем і журбою апалі.
Дай птушкам песні мудрыя, як Ведды.
У зрэнках звера патушы вуглі.
Разумнага гаспадара Зямлі
Вучы пра добрае заўсёды ведаць.
І я прыйшоў – завоблачны прарок:
Былі сляпымі, маючыя зрок,
Ў пух апранутыя, замест вушэй, раты
Усе да аднаго паразяўлялі.
Іх  чарапы ў аплеччы пустаты
Гніючыя планэты уяўлялі.

40* * *

Рагаты рыкаў звер і выла рысь,
Пачуўшы кроў салёную Рэдзедзі.
Дванаццаціпудовыя мядзьведзі
Ламалі пушчу, лясуноў траслі.
Паганскай поўні промні асвятлялі
Палкі касожскія – ваўкам сняданак.
Ліліся лебедзі са струн Баяна –
Суседзі пераможны баль спраўлялі.
Сярод плямён, што ўзгадавала Прыпяць
Не быў я. Сёння дадзена мне выпіць
Тваё, Расея, жорсткае віно.
Як раньш, за кругавым сталом разгулы цешаць.
І меднага каўша сухое дно
Блішчыць усмешкай хцівай печанежай.

## ГЛАСАРЫЙ

1. ГЕРКУЛЕС, ЛЕЎ, СТРАЛЕЦ – сузор'і.

2. ГЛЕТЧАР – векавы пласт лёду на горных вяршынях, альбо векавыя пласты ў лядовую эпоху.

3. ПРАКРУСТ – міфалагічны персанаж, якога сустрэў Адысей (Гамэр. ІЛІЯДА І АДЫСЕЯ)пад час свайго падарожжа.У пячоры Пракруста быў ложак, на які ён укладваў падарожных. Хто быў карацей за ложак, таго расцягваў. Калі хто не месціўся на ложку – таго абсякаў, акурат згодна з даўжынёю ложка. Адтуль выраз "Пракрустава ложа".

4. ГЕРКУЛЕС – палубог, асілак. З рымскага міфалагічнага пантэону (Гэракл у грэкаў). Здзейсніў дванаццаць подзвігаў.

5. СІБІЛЫ – міфалягічныя прарочыцы.

6. ПІЛАТ – рымскі намеснік у старажытным Іерусаліме, які судзіў Ісуса Хрыста і даў яму прысуд – смерць на крыжы.

7. ПЭРСЕЙ – міфалагічны гэрой, перамог пачварную Мядузу-Гаргону, ад позірку якой жывыя істоты пераўтвараліся ў камень.

8. АНДРАМЕДА – ўратаваная Пэрсеем дачка цара Крыта, якую ён пакахаў. Сузор'і Пэрсэя і Андрамеды на небесхіле побач.

9. ПАРНАС – гара, дзе жылі рымскія багі (Алімп у грэкаў).

10. МЯДУЗА – міфалагічная страшыла, замест валасоў на галаве яе былі змеі і кожны, хто сустракаўся з ёю позіркам, камянеў. Кроў Мядузы атручвала.

11. ХАРЭЙ, ЯМБ, АНАПЭСТ – вершаскладальныя памеры.

12. МУЗЫ – міфалаічныя (гэчаская міфал.) натхняльніцы паэтаў, мастакоў, музыкантаў.

У рымскай міфалёгіі КАМЭНЫ.

13. ТАРЫЧЭЛІЯВА ПУСТАТА – доўгая шкляная трубка, з якое адпампавана паветра.

14. СЦЯБЛО ФАРЭНГЕЙТА – слупок ртуці у падзеленай на градусы тарычэліявай трубцы, які паказвае тэмпературу .

15. ТОВІЙ – біблейскі пэрсанаж, якому анёл Рафаіл вярнуў зрок.

16. СУРДЫНКА – прыстасавенне для прыглушэння гуку струнных музычных інструмэнтаў.

17.ІСАК, ЯКУБ, РЭВЕКА – біблейскія пэрсанажы з Пяцікніжжа. Браты – Ісак з Якубам варагавалі за шлюб з Рэвекай.

18. КАМЭНЫ – натхняльніцы паэтаў, музыкаў, мастакоў у рымскай міфалёгіі (грэч. МУЗЫ)

19. ВАГОНЬ ХВАСТАТЫ – маецца на ўвазе яркасвіцячы хвост камэты, якія лічылі раней прадвесніцамі няшчасцяў, катаклізмаў, войнаў на Зямлі.

20. ДЭХКАНЕ – назва сялян у сярэдняй Азіі.

21. ЦІМУР – легендарны азійскі палкаводзец-заваёўнік, падначаліў сабе прастору ад Паміра да Каспія.

22. ВАЛЬТЭР – французкі філосаф, пісьменнік у сярэдневечча, вызначаўся сваім вальнадумствам.

23. ПРАМЕТЭЙ – міф. гэрой (грэч.) , які украў у багоў вагонь для людзей. Быў пакараны за гэта Зеўсам і прыкаваны да скалы сярод гор Каўказа. Кожны дзень прылятаў арол дзяўбсці яго вантробу.

24. ЭСХІЛ – старажытна-грэчаскі драматург.

25. КЛЯЎРЭТЫ – асобы, маючыя поўнамоцтвы ад караля.

26. ЕВА, АДАМ – біблейскія мужчына і жанчына, ад якіх пайшоў род чалавечы.

27. ДОН ЖУАН – літаратурны пэрсанаж, які меў шмат перамог над жаночымі сэрцамі.

28. ПУШКІН А.С. -вядомы расійскі паэт, у жылах якога цякла афрыканская кроў яго прапрадзеда Ганібала.

29. ЭРАС, ЭРОТ – памочнік багіні кахання Афрадыты (грэч.) АМУР (рымск.)

30. СУТРЫ, КАРАН – святая кніга мусульманаў, напісаная прарокам Мухамедам. Кожная асобная думка, павучанне называецца Сутра.

31. СІРЫЮС – самая яркая зорка паўночнага паўшар'я Зямлі.

32. ХОРТ – паляўнічы сабака, ганчак.

33. З ТАНЮТКАЙ ПЕРАКЛАДЗІНКІ АДНОЙ – маецца на ўвазе рабро Адама , з якога бог стварыў жанчыну.

34. СТРЭЛЫ АССУРА – маецца на ўвазе старажытная знікшая дзяржава паміж рэкамі Тыграм і Еўфратам.

35. СТАМІЯС – міфалягічная рыбіна.

36. АРХІСТРАЦІГ – біблейскі вой – пераможца злых сілаў.

37. АРЫЁСТА – паэт і драматург эпохі Адраджэння. АНЖЭЛІКА – маладая каханая Арыёста.

38. ХАМУРАБІ – старажытнававілонскі цар, зацверджаныя законы якога дайшлі да нашага часу ў запісах на гліняных таблічках ці каменных плітах.

39. ЭЎРОПА – гераіня грэчаскага міфа, дачка АКІЯНА. Громакідальнік Зеўс, каб яе кахаць перакінуся ў быка.

40. АКТАВІЯН – рымскі імпэратар.

41. МІКЕЛЬАНЖЭЛА – геніяльны італьянскі скульптар і мастак эпохі Адраджэння.

42. РАФАЭЛЬ – вядомы мастак эпохі Адраджэння ў Рыме.

43. ГАЛІЛЕЙ ГАЛІЛЕО – італьянскі вучоны, які даказаў, што Зямля мае форму шара і рухаецца вакол Сонца. Гэта супярэчыла царкоўным догмам. Інквізіцыя катавала яго, каб ён адмовіўся ад сваіх поглядаў. Займацца навукай яму забаранілі. Але існуе легенда, што прыканцы жыцця Галілей усклікнуў: ”А, ўсё ж яна круціцца!”

44. НЬЮТОН – брытанскі вучоны – адкрыў законы гравітацыіі, альбо сусветнага прыцягнення. Легенда кажа, што думка пра гэта прыйшла да яго пасля таго, як у садзе яму на галаву звалілася яблыка.

45. ГЭТЭРЫ – адукаваныя вольныя жанчыны ў Рыме, якія ўмелі граць на музычных інструмэнтах, танчыць. Да іх любілі хадзіць мужчыны ў госці. Вядома не без грошай і падарункаў.

46. САКРАТ – старажытнагрэчаскі філосаф. У цэнтры філасофіі – чалавек не можа быць шчаслівым, калі ідзе супраць сваіх перакананняў.

47. КРАСС – рымскі вайсковы начальнік

48. ПТАЛАМЭЙ – асоба з роду фараонаў, дынастыіі Пталамееў.

49. ГАЛАВУ НЯМУЮ ПТАЛАМЭЯ на плоскім блюдзе Цэзару нясла – маецца на ўвазе егіпецкая царыца КЛЕАПАТРА.

50. ЦЭЗАР – галоўны палкаводец, заваяваў Егіпет.

51. ПІФАГОР – старажытнагрэцкі матэматык, геаметрык. Лічыў, што у аснову светабудовы паложаны правільныя геаметрычныя формы.

52. ПЛАТОН – старажытна грэцкі філосаф 400 год да нашай эры, асноўнае яго філасофіі: свет ідэй, ідэал, прыгажосць.

53. АКТАЭДР – аб'ёмная фігура, стораны якога уяўляюць сабою правільны васьміграннік. У часы Платона гэтую фігуру будавалі геаметрычнымі метадамі. Яна лічылася адной з самых дасканалых. Адсюль імя Платона, прапаведніка ідэала і прыгажосці звязана з дасканалай геаметрычнай фігурай – актаэдрам.

54. ТУТАНХАМОН – егіпецкі фараон. Памёр у маладым узросце. Яго мумію

з залатою маскаю і ў залатым саркафагу раскапалі археолагі ў трыццатыя гада 20 стагодьдзя.

55. НІРВАНА – стан чалавечай душы (згодна індуізму), якога дасягаюць праведнікі пасля смерці. Гэта стан абсалютнага шчасця – або поўнай адсутнасці жаданняў.

56. АРБІТЫ – шляхі ў прасторы Сусвету, па якім рухаюцца планэты і іх спадарожнікі.

57. КАТЫЛІНА – старажытнарымскі гэрой, прыклад стойкасці перад пакутамі дзеля сваіх перакананняў і справядлівасці. Узначальваў змову.

58. ДАНТЭ АЛІГЬЕРЫ – італьянскі паэт эпохі адраджэння. Апісаў сваё ўяўнае падарожжа ў пекла.

59. ВЕРГІЛІЙ – старажытнарымскі паэт.

60. БУДДА СІДХАРТХА – асновапаложнік буддзізма, філасофіі і рэлігіі.

61. БРАХМАПУТРА – вялікая рака ў Індыі.

62. ВЕДДЫ – святыя кнігі індуістаў, дзе падаецца канцэпцыя светастварэння галоўным богам індуісцкага пантэона Брамай, апісваюцца подзвігі і дзеянні багоў, іх узаемаадносіны з царамі і простымі людзьмі. Ведды напісаны на санскрыце. Іх можна разглядаць як эзатэрычную (зашыфраваную, ) гісторыю узнікнення Свету і чалавецтва. Можна сказаць, што гэта самая старажытная рэлігія і найстарэйшыя пісьмовыя помнікі, якія захоўваюць браміны на працягу тысячагоддзяў.

63. РЫНДЫ – вандроўныя паэты-музыканты ў старажытным Іране.

64. ІНСІТЫЎ – выказванне, выяўленне глыбокай думкі на падставе прымітыўных вобразаў, узораў.



*З Анатолем Пятровічам Грыцкевічам у яго дома пасля выхаду яго кнігі «Сцягі Оршы». У руках Анатоля драўляны меч з «Мова нанова». Надпіс «Слава Воршы ўжо нягорша» 1514-2014 гг. Здымае жонка А. П. Ада Вячэславаўна*



*Дома у Надзеі Раманаўны Дзямідовіч у Калодішчах. Злева Валер Санько, 2015 г.*



*У Бычках выступае мастак Алесь Пушкін*




*У Бычках. Злева Юрась Жыгамонт, 2015 г.*



*У музеі. Справа Леанід Дранько-Майсюк, 2016 г.*



*З Верай Буланда, 2016 г.*



*У музеі П. Броўкі. Справа Кастусь Цвірка, 2014 г.*



*У музеі П. Броўкі з Міхасем Скоблам, 2014 г.*



*У Нацыянальный бібліятэцы на прэзентацыі кнігі Васіля Якавенкі «Пакутны век». Размова с Георгіем Ліхтаровічам, 2016 г.*

## ЗМЕСТ

Хай скрыпачка грае....................4
Ты хочаш вандраваць паміж людзьмі....................5
Язэп Драздовіч....................6
Там, у палёх калышуцца....................8
Аперазала рэчка лес....................9
Я нічога не прашу у бога....................9
Хіба змусіш каго....................10

САНЭТЫ

Крышталі блішчуць дыямэнтаў праўды....................12
Пра інь і янь распавядаў....................12
Ну і грымела!....................13
Як незвычайна, як прыгожа....................13
Спяшайся ў сад....................14
Верыць думаў я буду да скону....................14
Двурогі месяц асвятляў....................15
Збіраймася, гуртуймася, сябры....................15
Па роўнаму полі, па беламу снегу....................16
Не праміні!....................16
Прашу цябе, не наракай на лёс....................17
Кружылі, кружлялі сляды....................17
Які пасля сябе пакіну след?....................18
З губ слова крыўднае зляцела....................18

Наш лес....................19
Сяброўству па духу няма перашкодаў....................21
Яшчэ дзень не прыйшоў....................22
Мілагучнае скерца....................23
Бывае смутна без мяжы....................24
Ясныя-ясныя далі вясновыя....................25
Людзі, зляжалую землю арыце....................25
Гэй, вы, аратыя, землю арыце....................25
Працагісторыка....................26

Бітва пад Воршай.....27
Тэстамэнт.....28
Прывід.....29
На беразе стромкім.....30
Мой бацька меч.....31
Раскіну абрус я ільняны.....32
Паўстае захмуранае неба.....33
Зумкае пчолка.....33
Як ні змагайся ты з сабой.....34

ВЕРШЫ ПРА КАХАННЕ

Кахання прагне маё сэрца.....35
Працяў мне сэрца навылёт.....36
Для чаго і навошта было тое вам?.....37
Трымцяць ва мне сустрэчы прадчуванні.....37
Бывай, каханы.....38
То сон, альбо ява.....39
Рамонкі белыя, скажыце.....40
Які ў нас будзе назаўтра прагноз?.....40
Урачыстая шлюбная ноч.....41
Ўдых-выдых.....42
Прашаптала спакойна: "Бывай".....42
Разважанне пра каханне.....43
Любоў.....44

Трымцяць і трапечуць.....45
У сінім небе між аблокаў.....46
Баліць душа і не іначай.....47
Пуста на вёсцы, пуста.....49
Маё сэрца баліць, як рана.....49
Скажу спакойна я.....50
Рэха звонкае.....51
Ўсё на свеце мінае.....53
О, пясочны гадзіннік.....54
Месячык-месяц.....56

Шпурляе вецер чоўн......58
Разважанне......59
Пра свабоду волі......60
Чарнобыль......62
Зямлю спыніце!......64
Размова даўніх сяброў......65
Перавядзі мяне цераз Майдан......66
Вазьму галавой......67
Зняважаны гэній......68
Папера церпіць ўсё......69
Нататкі дылетанта......70
Куды ступае конь з капытам......73
Каскадзёры......74
Сэнтэнцыя......75
Уражанне......76
Малітва......77
Воляй божаю......78
Нешта набрыняла хмара......78
Адкрыць я не хачу......79
Радок з К.Крапівы......79
Даволі, хлопцы......79
На стромкім беразе Дзвіны......80

У ПЛЫНІ АДНАГО ЧАСУ

Рагуля А.У......81
Яўген Гучок......82
Вера Буланда......83
Кася Камоцкая......84
Алесь Пушкін......85
Юрась Жыгамонт......86
Алесю і Юрасю......87
Валер Санько......88
Людміла Дзяцэвіч......89
Міхась Скобла......90
Іван Раманчук......90

Галя Пархімчык.......................................................91
Вера Міхно.......................................................91
Грамацкі дзеяч.......................................................92
Трусаў А. А.......................................................93
Яўгенія Янішчыц.......................................................94
Зянон Пазьняк.......................................................95
Глебу і Алесі.......................................................96
Ніна Багінская.......................................................97
Ганна Кісліцына.......................................................98
Беларускаму паэту.......................................................99
Парада вопытнага літаратара.......................................................100
Аднаму знаёмаму.......................................................101
Будаўнікі.......................................................103
Сястра-законніца.......................................................104
Тры сустрэчы з Нілам Гілевічам.......................................................106
MEMENTO.......................................................109
Няма прарока.......................................................111
Інфэрнальнае.......................................................112
Чытаючы легенды і міфы.......................................................115
Ад Сакрата і Гамлета.......................................................117

ПЕСНІ

Калыханка.......................................................120
Пакахай.......................................................121
А ты ўсё далей.......................................................122
Іду дадому.......................................................124
Васількі.......................................................126
Якім бы ты ні быў.......................................................127
Кожны вечар сустракаю.......................................................128
Трам-па-па-па.......................................................129
Выйдзеш ты на круты беражок.......................................................130
Чапёлачка.......................................................131
Пра каханне.......................................................134

ВЕРШАВАНЫЯ АПАВЯДАННІ (з прымесам фэнтэзі)

Мачанка....................................................136
Пра цмока....................................................139
Супэрпоўня....................................................142
Пра вандроўку ў Заслаўе....................................................145
Размова....................................................153
Сон....................................................157
Ласіныя прыгоды....................................................157

ЖАРТОЎНЫЯ

Казала некалі бабуля....................................................166
Кожны пра сваё....................................................167
Размова мужа з жонкаю....................................................168
Вяртанне з лесу....................................................169
Стары дзед на Камароўцы....................................................169
На базары пад Варшавай....................................................170
Мы з мужам....................................................171
Настаўніца ласкава....................................................172
Далека....................................................172
Дзяўчына з глыбінкі....................................................172
Каб ведалі толькі....................................................172
Ангажаванаму журналісту....................................................173
Інтэрўю з самазадаволеным паэтам....................................................174
Гліняны збан....................................................175
Птушкі прыляцелі....................................................176
Песня беларуса....................................................177
На высокай гары....................................................179
Ў душы запалу поўна....................................................180
Дрэннае слова....................................................181
Дыялог з сыліконавай прыгажуняй....................................................182
Пра малую Анцю....................................................183
Прыпеўкі....................................................185

ПЕРАКЛАДЫ

ФРЫДРЫХ ГЕББЕЛЬ
Мне сэрца працінае....188
РЭДЗЬЯРД КІПЛІНГ
О, калі ты....189
У. ШЭКСПІР
Санэт 66....190
Санэт 121....190
М.Б.Б. ШАХ
Прысвячэнне....191
Я зорак не пералічу....191
Без зорак я цёмная ноч....192
Не думаць аб тым....193
Навек знікае мой спакой....194
Жыццё, як разважыць....195
Ёсць радасць і ў смутку....196
Ф.І. ЦЮТЧЭЎ
Што ў сэрцы маеш....197
Развагу, клопаты пакінь....197
Прырода – сфінкс....197
Пашлі Бог, з літасцю спагаду....198
Маўчы, прашу....198
М.ЗАБАЛОЦКІ
Не дазваляй душы....199
М. ЛЕРМАНТАЎ
Сам-адзін выходжу на дарогу....200
Жыцця хачу!....201
Малітва....202
10 ліпеня 1830 г.....203
Жабрак....203
М. ЦВЯТАЕВА
Яшчэ учора мілаваў....204
Г. АХМАТАВА
Шэравокі кароль....206
Адны ў ласкавыя глядзяцца вочы....207

Муза......................................................................208
Пачуццяў шчырасць......................................................209
Гучала музыка здалёк..................................................209
С. ЯСЕНІН
Хай жыццё адна мана з журбою....................................210
Не шкадую, не заву......................................................211
Адгаманіла восень залатая..........................................212
А.С. ПУШКІН
Руху няма..................................................................213
Як жыццё надзеям маніць............................................213
Пагроза гібелі заўжды..................................................214
Мне від мілей апошніх кветак......................................214
Мой шлях панылы......................................................214
АБУ АЛІ МБН СІНА (АВІЦЭННА)
РУБАІ........................................................................215
ХАФІЗ ШЫРАЗІ
Ці ёй падзякаваць?......................................................218
Ў кахання канца шляху не відаць.................................220
Жывы, як мёртвы я......................................................220
Пяць якасцей..............................................................221
Дзе рыфмач, які не ўявіць............................................222
Калі сумленны быў......................................................223
Заўжды сонцу людзі рады............................................224
АМАР ХАЯМ
РУБАІ........................................................................225
ЧЖАН ЧАО
З кнігі глыбокага сна....................................................229
КАТУЛ
Сяброўства................................................................231
АВІДЫЙ
Мне абурацца? Маўчаць?............................................231
У. ВЫСОЦКІ
Голую праўду..............................................................232
Д.КЕДРЫН
Кавярня......................................................................233
Пасаг..........................................................................235

Сэрца..........242
Кроў..........243
І.БУНІН
Тайна..........244
Іх усіх Пан Бог знішчыў..........245
Даліна Іасафата..........246
Вечар..........247
Слова..........248
Б. ПАСТЭРНАК
Дастаць чарніла, ды заплакаць..........249
Мне восень снілася..........250
Зімняя ноч..........251
Як хочацца, каб я прайшоў..........253
Давайце словы пагубляем..........255
Я прапаў, як звер ў загоне..........257
А. БЛОК
У густой траве прападзеш..........258
Ўспомні трывожны наш горад..........259
Р. Я. ШЫРМАН
Эпіграф..........263

САНЭТЫ з кнігі "Зорны покліч"

Вясёлы чорт..........264
Стракатыя раскіданыя словы..........264
О, ты, адрынуты і непатрэбны..........265
Я вам, сябры, напомню..........265
І, славячы цябе, палілі мы..........266
Пэрсэяпраўнукі..........266
Харэяў хуткіх не стрымаю плыні..........267
Са строфаў брага..........267
Вільготная зямля..........268
Як старажытны раб, стаю нямым..........268
Нібыта доўгія імгненні болю..........269
О, вы, лагодныя мае цнатліўкі..........269
Не пляскайце вы, бледныя далоні..........270

На глінянай Зямлі........................................................270
Лістамі чорнымі........................................................271
Паважнай веліччу напоўню словы........................................................271
Ў густую ноч сцякаюць нашы дні........................................................272
Журботна тут........................................................272
Ў складаным руху нашае Зямлі........................................................273
Вальтэр........................................................273
З халоднаю душой........................................................274
Зямную мову звыклую сваю........................................................274
Яны заўжды страшыліся расплаты........................................................275
Сцюдзёных зор сухія араматы........................................................275
З танюткай перакладзінкі адной........................................................276
Я красамоўства слухаю вады........................................................276
На самым дне, у змроку........................................................277
Спакою мудрасць........................................................277
Пярнаты вецер сатварыў Эўропу........................................................278
Зямным агнём без полымя........................................................278
Былі гіганты........................................................279
Па вашай пышнасці сумуе сэрца........................................................279
Святло з імглой........................................................280
Ізноў магу я адчуваць радок........................................................280
Пярловых мараў жорсткія абманы........................................................281
Не змог цябе........................................................281
Я вырвуся з тваёй магільнай гліны........................................................282
Ў тваім нямым краі зачараваным........................................................282
Быў голас мне........................................................283
Рагаты рыкаў звер........................................................283

ГЛАСАРЫЙ........................................................284
ЗМЕСТ........................................................289

Літаратурна-мастацкае выданне

**Грыцкевіч** Аляксандра

**ХАЙ СКРЫПАЧКА ГРАЕ**

*Рэдактар Валянцін Жук*
*Адказны за выпуск Мікалай Трафімчук*
*Фота Віктар Малышчыц*

Падпісана ў друк 19.07.2017. Фармат 60x84 1/16.
Папера афсетная. Друк на афсетны.
Ул.-выд. арк. 17,32. Ум. друк. арк. 4,93.
Наклад 50 асоб. Замова 163.

Выдавец і паліграфічнае выкананне «Ноопрэсс»
214000, г. Смаленск, вул. Нахімава, 12.



ISBN 580037033-8
9 785800 370331

Аляксандра Грыцкевіч

*Хай скрыпачка грае*